# Інтэр'ер традыцыйнага народнага жылля

*А. М. Нароўская*

## Гісторыя развіцця інтэр'ера традыцыйнага беларускага жылля

Інтэр'ер жылля, складаючы найбольш блізкае рэчавае атачэнне чалавека, з'яўляецца тым прадметным мікраасяроддзем, у якім чалавек жыве ад нараджэння да старасці і якое аказвае значны ўплыў на сацыялізацыю асобы. У сваю чаргу ён ярка адлюстроўвае ўзровень як матэрыяльнай, так і духоўнай культуры народа, яго эстэтычныя і мастацкія гледжанні. Матэрыялы па гісторыі развіцця інтэр'ера беларускага народнага жылля ўтрымліваюць каштоўныя даныя для асвятлення шэрага пытанняў этнічнай гісторыі беларусаў, іх культурных сувязей з іншымі народамі, аднаўлення шырокай карціны сялянскага побыту ў розныя гістарычныя перыяды.

Інтэр'ер і ўнутранае абсталяванне беларускага традыцыйнага жылля фарміраваліся ў адзіным працэсе развіцця жылля ўсходніх славян, значную ролю ў якім адыграў інтэр'ер жылля Старажытнай Русі. Аб унутранай планіроўцы і абстаноўцы жылля таго часу мы маем вельмі мала звестак. Старажытныя летапісы амаль нічога не кажуць пра вёску. Б. А. Рыбакоў адзначаў, што «гісторыя ...вёскі ў будучыні будзе напісана на аснове археалагічных матэрыялаў»[1]. Таму невыпадкова для аднаўлення інтэр'ера жылля VIII–XIII стст. былі выкарыстаны археалагічныя крыніцы.

Старажытнае жыллё характарызавалася слабой функцыянальнай падзеленасцю ўнутранага памяшкання і амаль поўнай адсутнасцю перасоўнай мэблі[2]. Такія формы мэблі, як нерухомыя лавы, паліцы, памост для сну выпрацоўваліся стагоддзямі. Ужо ў славянскіх паўзямлянках VIII–IX стст. н. э. (на паселішчы Хотамель Столінскага раёна) выяўлены шэраг слупкоў, якія праходзілі паралельна сценам на адлегласці 50–80 см і, верагодна, падтрымлівалі стацыянарна замацаваныя лавы ці насціл каля сцен. Па меркаванні І. П. Русанавай, шматлікія і бессістэмныя ямкі ад невялікіх слупкоў у цэнтры жылля, хутчэй за ўсё, з'яўляліся слядамі ножак ад сталоў[3].

Печы існавалі двух тыпаў – каменныя ці глінабітныя. Уяўленне аб форме і канструкцыі каменных печаў даюць нам іх рэшткі, знойдзеныя пры раскопках археолагамі. Печы-каменкі ў селішчах IX–X стст. мелі звонку форму, блізкую да прастакутніка, радзей падкованападобную (в. Чаплін)[4]. У ніжняй частцы печаў сценкі рабілі з буйных, часта плоскіх камянёў, у верхняй – з дробных. Камяні, як правіла, укладвалі без звязуючага раствора, але часам прамазвалі глінай. Поды печаў авальныя або круглыя, яны звычайна размяшчаліся на ўзроўні падлогі, часам былі злёгку ўрэзаныя ў падлогу, або наадварот, крыху прыўзнятыя над ёй. Асновай печаў з'яўляўся мацерыковы пласт, але вядомы выпадкі, калі под быў вымашчаны камянямі, чарапкамі ці прамазваўся глінай.

[1] Рыбаков Б. А. Ремесло Древней Руси. М., 1948. С. 120.

[2] Русаў П. А. Унутраны выгляд мінскай хаты другой палавіны XIII ст. // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1987. № 6. С. 67–70.

[3] Русанова И. П. Славянские древности VI–IX вв. между Днепром и Западным Бугом. М., 1973. С. 25.

[4] Сыманович Э. А. Поселение эпохи Киевской Руси в с. Чаплин в Южной Белоруссии // Советская археология. 1961. № 2. С. 200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Рэканструкцыя жылля на паселішчы Хотамель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці



Славянскае жыллё. Рэканструкцыя (у разрэзе)

Другі тып печаў, які існаваў у селішчах IX–X стст., – гліняныя печы. У большасці выпадкаў яны мелі прастакутную форму, под іх знаходзіўся на ўзроўні падлогі жылля.

У этнаграфічнай навуцы доўгі час трымалася меркаванне, якое ўсталявалася пасля выхаду ў свет працы К. Рама[1], што ўсходнеславянскае жыллё не мела адкрытага ачагу. Пошукі археолагаў даказалі, што ў старажытных селішчах усходніх славян існаваў адкрыты тып ачага для развядзення вогнішча. Па матэрыялах М. А. Ткачова, адкрытыя ачагі былі знойдзены пры раскопках паселішча X–XIII стст. у Мядзельскім раёне Мінскай вобласці[2]. Акрамя таго, устаноўлена, што нягледзячы на шырокае распаўсюджанне печаў побач з імі яшчэ доўгі час суіснавалі адкрытыя ачагі[3]. Уяўленне аб такім жыллі даюць нам як археалагічныя і этнаграфічныя матэрыялы, так і падсобныя памяшканні, што захаваліся да нашага часу, – варыўні, якія можна разглядаць як прататып старажытнага жылля. У варыўні перш за ўсё звяртае на сябе ўвагу адкрыты ачаг[4], характэрны для старажытнага жылля.

Уваход у паўзямляначнае жыллё IX – першай паловы X ст. у большасці выпадкаў знаходзіўся з паўднёвага боку, паколькі жыллё гэтага часу,

[1] Rhamm K. Ethnographische Beitrage zur Germanisch-Slawischen Altertumskunde. Die altslawische Wohnung. Braunschweig, 1910.

[2] Ткачев М. А. Работы экспедиции Гродненского университета // Археол. открытия 1981 г. М., 1983. С. 360.

[3] Монгайт А. Л. Древнерусское жилище XI–XIII вв. // Советская этнография. 1948. № 4. С. 54–69; Митрофанов А. Г. Селище VI–VIII вв. близ дер. Городище // Древности Белоруссии. Минск, 1969. С. 244, 245.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (далей – БДМНАП) у Барысаўскі раён Мінскай вобласці ў 1987 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

па меркаванні П. А. Рапапорта, Г. В. Барысевіча, Б. А. Колчына, верагодна, не мела вокнаў, і адзінай крыніцай святла служыў дзвярны праём. Уваходнае прыстасаванне – земляныя прыступкі альбо драўляная лесвічка. Мяркуючы па даных археалогіі, планавая структура гэтага жылля аднолькавая: печ заўсёды знаходзілася ў заднім ад уваходу куце і была павернута вусцем у бок уваходу. Гэту асаблівасць у канструкцыі жылля П. А. Рапапорт лічыць найбольш характэрнай для помнікаў да X ст.[1]

Жыллё паўночнай часткі Беларусі, якое адносіцца да сярэдзіны X ст., – гэта наземныя зрубныя жылыя пабудовы, якія мелі трохі большы памер, чым паўзямляначнае жыллё. Жылыя пабудовы амаль усе квадратныя ў плане; памер іх бакоў 4,5–5,0 м. Падлога ў жыллі была звычайна драўлянай – з дошак або плах. Лагі падлогі часцей ляжалі проста на зямлі. Печ-каменка была размешчана ў заднім ад уваходу куце і павернута вусцем да ўваходу.

У X–XI стст. у планавай структуры паўзямляначнага жылля адбываюцца істотныя змены. Пры новай планіроўцы печ ужо стаіць побач з уваходам і павернута вусцем да бакавога акна[2]. Па апублікаваных звестках, такое размяшчэнне печаў выяўлена пры раскопках старажытных Ваўкавыска[3], Слоніма[4], Мінска[5]. На ўсёй тэрыторыі распаўсюджання паўзямляначнага тыпу жылля (паўднёва-ўсходняя частка Брэсцкай вобласці) пачынаюць прымяняць круглыя або авальныя ў плане печы, збітыя з гліны. Адным са спосабаў узвядзення корпуса глінабітнай печы, пра існаванне якога ў мінулым можна меркаваць па археалагічных даных, была ўстаноўка дугападобна сагнутых тоўстых дубцоў і наступная іх абмазка. Прымяняўся і спосаб абмазкі глінай драўлянага каркаса, які пакідалі ўнутры печы. Верх круглых глінабітных печаў часта меў гарызантальную паверхню і быў акружаны борцікамі, г. зн. меў характар жароўні. Поды круглых печаў, як правіла, размяшчаліся на ўзроўні падлогі. Часта гэтыя поды былі вымашчаны абломкамі гаршкоў і зверху прамазаны глінай. Часам, хоць і не часта, перад печамі



Інтэр'ер хаты. Рэканструкцыя Э. Загарульскага

рабілі невялікія перадпечныя ямы. Мяркуючы па археалагічных звестках, каля печаў у шэрагу выпадкаў будавалі ляжанкі (даўжынёй каля 1, 8 м пры шырыні каля 1 м)[6].

З'яўленне новага тыпу печаў і змена планіроўкі жылля – узаемазвязаныя працэсы. Новая схема плана жылля стала магчымай толькі пры новым тыпе печаў, якія мелі значна больш высокія цеплатэхнічныя якасці.

Жыллё наземнага тыпу, якое адносіцца да другой паловы X–XI стст., усё зрубнае. Падлога, як гэта можна бачыць па зафіксаваных археолагамі рэштках насцілаў і лагаў, была драўлянай. Печы былі як каменныя, так і глінабітныя. Істотным адрозненнем было тое, што печы ў наземных дамах былі на невысокім апечку[7]. Прастора паміж слупамі апечка забіралася дошкамі. Унутраная частка апечка запаўнялася зямлёй, глінай або камянямі, існавалі таксама зрубныя апечкі.

Археалагічныя даныя аб жыллі XII–XIII стст. больш поўныя, чым для папярэдняга часу, і дазваляюць больш дэталёва меркаваць аб іх асноўных канструкцыйных асаблівасцях. Перш за ўсё варта адзначыць, што ў XII ст. адбываюцца вельмі істотныя змены: гэта час шырокага распаўсюджвання наземнага жылля. У паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі, дзе яшчэ ў XI ст. часта сустракаліся паўзямлянкі, у XII ст. стаяць ужо выключна наземныя жылыя пабудовы.

[1] Древняя Русь: город, замок, село. М., 1985. С. 137.

[2] Локотко А. И. Архитектура Беларуси в европейском и мировом контексте. Минск, 2012. С. 389.

[3] Тарасенко В. Р. Раскопки городища «Шведская гора» в Волковыске в 1954 г. // Материалы по археологии БССР. Минск, 1957. Т. I. С. 268; Новые данные о древнем Волковыске // Древности Белоруссии. Минск, 1969. С. 150.

[4] Археологические работы в Слониме // Беларускія старажытнасці. Мінск, 1972. С. 248.

[5] Загорульский Э. М. Древний Минск. Минск, 1963. С. 34.

[6] Зверуго Я. Г. Раскопки в Волковыске // Археол. открытия 1967 г. М., 1968. С. 251; Тарасенко В. Р. Раскопки городища «Шведская гора». С. 268.

[7] Загорульский Э. М. Археология Белоруссии. Минск, 1965. С. 147.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



Багаты дом у Навагрудку. Рэканструкцыя В. Сташчанюка

Адной з найбольш характэрных асаблівасцей жылля XII–XIII стст. з'яўляецца шырокае распаўсюджанне ў наземным жыллі круглых глінабітных печаў[1]. Археалагічны матэрыял сведчыць, што каменныя печы к гэтаму часу засталіся дамінуючым тыпам толькі ў Панямонні[2].

Круглыя глінабітныя печы XII–XIII стст. зроблены, як правіла, цалкам з гліны. Праўда, часам у сценах печаў выкарыстоўвалі і камень, але камяні пры гэтым былі злучаны глінай, і сценкі печаў былі прамазаны глінай як звонку, так і з боку топкі. Печы мелі круглую форму, значна радзей авальную, падковападобную або блізкую да чатырохкутніка са скругленымі вугламі.

Вонкавы дыяметр печы звычайна вагаецца ад 1,0 да 1, 5 м, а вышыня купальнага зводу – да 60 см. Сценкі печаў часта мелі драўляны каркас з калкоў або дубцоў, шырока ўжываліся і печы без драўлянага каркаса.

Поды печаў звычайна гліняныя, пад пластом гліны часта ляжыць бітая кераміка або дробныя камяні. Для ўсталявання глінабітных печаў прымянялі драўляныя апечкі, якія ўяўлялі сабой квадратную ці прастакутную скрыню вышынёй каля 0,5 м. Рабілі апечак звычайна з плах, пакладзеных на рабро і заведзеных у пазы слупоў, закапаных па кутах. Існаваў і іншы прыём устаноўкі глінабітных печаў – на драўляных слупах над падпечной ямай.

Адным з найбольш складаных пытанняў, якія ўзнікаюць пры вывучэнні ўнутранай планіроўкі і абсталявання старажытнага жылля, з'яўляецца пытанне аб комінах. Несумненна, што ў пераважнай большасці жылля не было ніякіх комінаў і печы таліліся па-чорнаму, г. зн. з выхадам дыму праз вусце топкі. Сялянскае жыллё атаплівалася па-чорнаму і значна пазней, амаль да канца XIX ст. У эпоху ж Кіеўскай Русі (не кажучы ўжо пра больш ранні перыяд) не толькі сялянскае, але і багатае двухкамернае жыллё ў большасці выпадкаў таксама не мела комінаў.

Аднак, як сведчаць вынікі археалагічных раскопак, у Старажытнай Русі ўжо ў XII ст. у княжацкіх маёнтках і дамах феадалаў печы ставіліся на зрубах, узводзіліся з цэглы і мелі коміны. Так, наўрад ці па-чорнаму абаграваліся багатыя дамы пануючага саслоўя ў Навагрудку, якія мелі зашклёныя вокны, а часам нават аздобленыя фрэскамі[3]. Аб наяўнасці комінаў сведчаць таксама знаходкі на суседніх тэрыторыях. Сярод археалагічных фрагментаў прыцягваюць увагу кавалкі гліняных комінаў, якія па меркаванні П. А. Рапапорта, магчыма, з'яўляюцца рэшткамі комінаў[4]. На жаль, гэтыя фрагменты ко-

[1] Лысенко П. Ф. Археологические исследования раннефеодальных памятников Туровской земли // Древности Белоруссии: докл. к конф. по археологии. Минск, 1969. С. 139–142.

[2] Древняя Русь: город, замок, село. С. 141; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 22–23; яго ж. Беларускія старажытнасці. Археолог. работы в Слониме. Минск, 1972. С. 252.

[3] Гуревич Ф. Д. Дом боярина XII в. в древнерусском Новогрудке // Краткие сообщения / Ин-т этнографии СССР. 1964. Вып. 99. С. 98; Спегальский Ю. П. Жилище в Северо-Западной Руси IX–XIII вв. Л., 1972. С. 149.

[4] Раппопорт П. А. Древнерусское жилище // Археология СССР. Л., 1975. С. 156.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мінаў нідзе пераканаўча не зафіксаваны і таму няма магчымасці меркаваць аб іх канструкцыі.

Такім чынам, нягледзячы на абмежаваныя звесткі, якія захаваліся да нашых дзён, можна адзначыць, што ў шэрагу жылых будынкаў Старажытнай Русі XII–XIII стст. была сістэма ацяплення з адводам дыму – «па-беламу». Праўда, гэта сістэма ўжывалася толькі ў жыллі заможных людзей.

Аб унутранай планіроўцы і абсталяванні жылля XV–XVIII стст. мы маем мала інфармацыі. Першыя пісьмовыя звесткі аб жыллі, якое тапілася «па-беламу» і «па-чорнаму», адносяцца да XVI ст. У жыллі, якое тапілася «па-чорнаму» жыла прыслуга, адпаведна можна ўявіць, што і сельскае жыллё ў сваёй пераважнай масе было курным, паколькі, напрыклад, да самай рэформы 1861 г. у Гродзенскай губерні з 47 тыс. памешчыцкіх сялян толькі 13% мелі ў хатах «белыя печы»[1].

Мы не маем ніякіх даных пра інтэр'ер сялянскага жылля XV–XVIII стст. Але аб абсталяванні сядзіб беларускага дваранства маецца значная колькасць звестак – апісанне ўнутранай планіроўкі жылля і хатняй маёмасці.

Для абагравання памяшканняў ставіліся печы тыпу галандскіх. Нярэдка адна печ ацяпляла два сумежныя памяшканні. Дакументы адзначаюць, што ў XVI ст. у святліцах разам з пабеленымі печамі ставілі таксама кафляныя («поливаные») печы зялёнага або шэрага колеру з выведзеным на верх даху комінам (1592 г.)[2]. У шматпакаёвых асабняках з вялікай колькасцю печаў у сенцах ставіліся шырокія коміны, у якія збіраўся дым з усіх печаў. Так, у інвентары маёнтка Цялесніцы Брэсцкага ваяводства за 1576 г. зафіксавана наступнае: «комин в сенях один глиняный, до которого з светлиц двох, а с коморы одной коминки малые три уведены...»[3].

Характэрныя прыклады такога роду фіксацый: «...в сенях тое светлицы комин мурованый...» (1581 г.)[4], «межи тыми светлицами сень, в ней коминов к горе выведенных два мурованых…» (1592 г.)[5]. Размяшчэнне коміна ў сенцах ужо ў XVI ст. сведчыць аб пэўным кірунку эвалюцыі жылля. Першапачаткова была курная хата, у якой дым з печаў выходзіў наўпрост у жылое памяшканне. Наступны этап развіцця жылля, калі дым выводзіўся ў сенцы праз «душнік» (адтуліну, зробленую ў столі ці ў сцяне паміж сенцамі і жылым памяшканнем). Пазней пачалі рабіць у сенцах коміны, а потым перанеслі іх на гарышча. У канцы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі ў той ці іншай ступені сустракаліся ўсе гэтыя тыпы комінаў.

Аналіз дакументаў сведчыць, што пералік прадметаў інтэр'еру, якія бытавалі ў гэты перыяд, быў даволі шырокі.



Курная печ





Рэканструкцыя печы канца XVI ст., аблямаванай паліхромнай кафляй. Стары замак у Гродне. Палац С. Баторыя. Кафлі сюжэтнага характару

[1] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губ. СПб., 1863. Ч. 1. С. 433.

[2] АВАК. Т. IV. С. 436.

[3] Тамсама. Т. XIV. С. 186.

[4] Тамсама. С. 228.

[5] Тамсама. С. 436.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКИ

У межах нашага даследавання асаблівай увагі патрабуе такі прадмет інтэр'ера, як лавы, якія ставіліся ўздоўж сцен нават у багатых магнацкіх асабняках: «в избе лавы вколо...» (1758 г.)[1], «у светлицы лавы вколо» (1581 г.)[2], «во всем том дому …лав шесть, лавок малых пять» (1576 г.)[3], «одна длинная скамейка простой работы, 7 кресел с подлокотниками…»[4], «...зедлей обтянутых 7, лав больших 6, зедлей поединичных 10…»[5].

Звяртаюць на сябе ўвагу шматлікія згадкі пра сталы: «стол столярной работы окрашенный жолто» (1771 г.)[6], «у столовой светлицы… тринадцать» (1580 г.)[7], «столов в комнатах 5, столов меньших 10, столов больших 6… столик малый 1…»[8].

Сталы выраблялі з дошак розных парод дрэва: дуба, хвоі і ліпы: «…сосновый стол с подножками, к которому в конце прикреплен на петлях табурет»[9], «в тех светлицах великих столов дубовых долгих четеры, а в боковой светлице стол роботы столярское один, з скрынею замчистою» (1579 г.)[10], «светлочка… стол липовый один…» (1581 г.)[11].

Шматлікія згадкі пра паліцы: «полица и судник один» (1778 г.)[12], «у порога 2 полки с планками, а над дверью в клеть, наверху, настил для хранения настоек»[13].

Сустракаецца таксама інфармацыя і аб іншых прадметах інтэр'ера: «пол полати из досок намощены» (1778 г.)[14].

Унутранае абсталяванне сядзібных дамоў было добра прадуманым. Падлога («памост») і столь («повала», «пулап», «сталяванне»), як правіла, былі дашчаныя. Напрыклад: «изба белая… в ней стены шклютованы…» (1771 г.)[15]. Аналагічныя звесткі даюць нам архіўныя матэрыялы: «потолок строганый, пол дощатый»[16]. У заможных дамах сцены абабівалі тканінай: «…в той избе две стены сукном чорным обиты» (1592 г.)[17].

Дашчаныя дзверы звычайна рабілі на жалезных завесах, з жалезнымі зашчэпкамі, нярэдка з вісячымі і ўнутранымі замкамі. «Из этой комнаты в альков – дверь столярной работы… Из этой горницы в комнату ведет дверь на продолговатых железных петлях с 2 пробоями»[18], «двери на завесах и защепки есть» (1579 г.)[19], «из сеней влево до покою первого идет дверь столярской работы, на завесах» (1767 г.)[20].

Для магнацкіх маёнткаў XVI – першай паловы XVII ст. быў характэрны дробны аконны пераплёт з волава або жалеза. Аналіз крыніц сведчыць, што для больш позняга часу характэрны аконны пераплёт з дрэва: «2 застекленных окна в деревянных рамах с 8 створками»[21].

Вельмі нязначныя даныя інвентароў аб асвятленні жылля. Да нас дайшлі пісьмовыя помнікі XVI ст., якія даюць нам некаторыя звесткі пра асвятленне жылля лучынай. У інвентары маёнтка Васішак Мінскага ваяводства пры пераліку хатняга начыння называецца «железо», на якім лучыну раскладваюць (1599 г.)[22]. Для лучыннага асвятлення выкарыстоўваліся таксама «камінкі» – невялікія нішы ў печах. Так, у інвентары вёсак Гатава і Новы Двор Мінскага павета адзначана: «…в сенях комин, на котором огонь кладут для светла…» (1590 г.)[23]. Прыклад падобнага роду фіксацыі: «в той светлицы… пець поливаный, коминок малый, где лучиною светит…» (1590 г.)[24].

Прывядзем прыклад найбольш поўнага апісання інтэр'ера святліцы маёнтка Здзятлы князя Канстанціна Астрожскага, якое адносіцца да XVI ст.: «…дом великий долгий при земли, у котором светлиц две об одных сенях наровни, печи добрые поливаные, оболоны у столовой светлицы шкляные …лавы около, помост дощёный на земли, …столов в ней тринадцать, лавок пять; а у другой светлицы оболон нет, одно только лавы, а печь добрый…» (1580 г.)[25].

[1] АВАК. Т. XXXV. С. 63.
[2] Тамсама. Т. XIV. С. 228.
[3] Тамсама. С. 186.
[4] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 1.
[5] Тамсама. Спр. 8424. Арк. 15.
[6] АВАК. Т. XXXV. С. 195.
[7] Тамсама. Т. XIV. С. 200.
[8] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8424. Арк. 15.
[9] Тамсама. Спр. 8263. Арк. 1.
[10] АВАК. Т. XIV. С. 200.
[11] Тамсама. С. 228.
[12] Тамсама. Т. XXXV. С. 216.
[13] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 2.
[14] АВАК. Т. XXXV. С. 216.
[15] Тамсама. С. 195.
[16] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 2 адв.
[17] АВАК. Т. XIV. С. 436.
[18] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 1, 2 адв.
[19] АВАК. Т. XIV. С. 200.
[20] Тамсама. Т. XXXV. С. 159.
[21] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 3.
[22] АВАК. Т. XIV. С. 629.
[23] Тамсама. С. 356.
[24] Тамсама. С. 361.
[25] Тамсама. Т. XIV. С. 200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не менш маляўнічае апісанне інтэр'еру панскага двара ў Смаргоні, які належаў князю Карлу Радзівілу: «из сеней налево вход в столовую комнату. Сосновый стол с подножками, к которому в конце прикреплен табурет. Одна длинная скамейка простой работы, 7 кресел с подлокотниками. Старая печка из зеленых изразцов, в которую спереди вставлены 2 изразца. Возле нее кирпичная побеленная труба с железной вьюшкой, соединенная с большой трубой. Из этой комнаты в альков – дверь столярной работы. Пол дощатый. Из алькова в боковую комнату…»[1].

З прыведзеных вышэй апісанняў бачна, што жылыя дамы пануючага класа ў XVI–XVII стст. не дасягнулі такога высокага развіцця, як пазней. У аснове гэта была звычайная сялянская хата са шматлікімі прыбудовамі і ўнутранай сегментацыяй жылых памяшканняў (святліца, сенцы, спальня і г. д.). Асабліва выразна гэта бачна, калі параўнаць планіроўку жылля з афармленнем яго інтэр'ера, багаццем хатняга начыння і абсталявання, якія дасягнулі ў той час высокага ўзроўню.

Што датычыць інтэр'ера сялянскага жылля, то аб ім мы можам у нейкай ступені меркаваць па апісаннях будынкаў маёнткаў, у якіх жыла чэлядзь. У чалядных хатах, пякарнях будаваліся цагляныя («мураваныя») або глінабітныя печы. У іх пяклі хлеб і рыхтавалі ежу для прыслугі. Такія печы ў асноўным не мелі коміну, адсюль і назва самой хаты «чорная». «В пекарню из сеней дверь на пятце, в ней печь черная, стол, лавы две при стене» (1599 г.)[2]. Такія самыя печы былі і ў грыднях вознікаў і прачак: «кухни низко при земли; с кухни изба черная…» (1590 г.)[3]. Печ, у якой пяклі хлеб, не абкладалі кафляй, у той час як ацяпляльныя печы ўжо па інвентарах XVI ст. былі звычайна кафлянымі («поливаными») (1579, 1592, 1594 гг.)[4]. Вокны часта былі незашклёнымі і зачыняліся бычыным пухіром, намасленай паперай або драўлянай засаўкай – «засовкой» (1590 г.)[5]. У інвентары смаргонскай сядзібы за 1621 г. гаворыцца, што «…домик в котором живут слесари имеет одно окно со стеклом, а второе бумажное»[6]. А ў маёнтку

[1] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 1.
[2] АВАК. Т. XIV. С. 629.
[3] Тамсама. С. 356.
[4] Тамсама. С. 200, 436, 499.
[5] Тамсама. С. 356; Живописный альбом: народы России. СПб., 1880. С. 47.
[6] Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (далей – ДГАЛ). Ф. 525. Воп. 8. Спр. 1192. Арк. 3 адв.



Кафля паліваная, паліхромная. Сярэдзіна XVI ст. Брагін, Гомельская вобласць. Раскопкі М. Ткачова. Музей старажытнабеларускай культуры



Кафля. Канец XVI – 1-я палова XVII ст. Мір, Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці. Раскопкі А. Трусава. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь

Карэйвічы Аршанскага павета разам з «блонами паперными» в одном малом «домку» былі «окна простые с засовками без оболонок»[7]. Унутранае абста-

[7] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ





Кафляныя печы. Пачатак XX ст. Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс

РЕПОЗИТОРИЙ

ляванне жылля чэлядзі было бедным. У інвентары маёнтка князя Карла Радзівіла апісаны інтэр'ер памяшкання для конюхаў: «Две скамьи. Печка из серых изразцов… Дымоход не выведен на крышу…»[1]. У гэтым жа інвентары дадзена апісанне інтэр'еру «домика» для прачак: «…из сеней вход в комнату. Дверь на петлях. Две скамьи, 3 окна: 2 со стеклом, в третьем нет стекол... Печка из простых изразцов...»[2]. У інвентары маёнтка вёсак Гатава і Новы Двор Мінскага павета знаходзім інтэр'ер жылля ткачоў: «светлица з сенями, в той светлице печь простая, у вокнах две оболоны шкляных старых, а две паперовых, оконницы до тых окон на завесах, …лавы две» (1590 г.)[3]. Апісанне падобных інтэр'ераў можна знайсці і ў шэрагу іншых інвентароў.

Такім чынам, параўнальны аналіз інтэр'ераў беларускіх памешчыцкіх сядзіб, памяшканняў для прыслугі і сялянскага жылля XVI–XVIII стст. выявіў агульныя рысы ўнутранай планіроўкі і абсталявання. Перш за ўсё гэта строга функцыянальнае прызначэнне асобных функцыянальных частак кутоў жылля, якое мае шматвяковую традыцыю. Па-другое, амаль поўная адсутнасць перасоўнай мэблі (акрамя стала, крэслаў, лаў). Усё гэта пацвярджае, што інтэр'ер жылля ўсіх сацыяльных слаёў, у тым ліку і памешчыцкіх сядзіб, у той перыяд меў у аснове ўнутранай планіроўкі народную традыцыю. Да сярэдзіны XIX ст. інтэр'ер народнага жылля развіваўся ў рэчышчы старажытных традыцый.

[1] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 3.
[2] ДГАЛ. Ф. 525. Воп. 8. Спр. 1192. Арк. 2.
[3] АВАК. Т. XIV. С. 356.

# Традыцыйны інтэр'ер сялянскага жылля

Інтэр'ер беларускага народнага жылля XIX – пачатку XX ст. меў шэраг агульных традыцыйных рыс, па якіх яго можна было адрозніць ад інтэр'еру жылля іншых, нават блізкіх па мове і культуры народаў. Да гэтых асаблівасцей адносяцца не толькі аб'ёмныя прапорцыі жылых і падсобных памяшканняў, размяшчэнне і ўбранне покуці, наяўнасць глінабітнай або драўлянай падлогі, спосабы асвятлення, разнастайнасць мэблі і побытавага інвентару, але таксама тып унутранай планіроўкі жылля і сам спосаб ацяплення. Гэтыя прыкметы сустракаліся ў розных спалучэннях, аднак у цэлым надавалі інтэр'еру аблічча, характэрнае для жылля беларусаў.

У першай палове XIX ст. на тэрыторыі Беларусі пераважна былі глінабітныя без комінаў («курныя») печы на драўлянай аснове («апечкы»). Яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., па звестках Бэз-Карніловіча, «белорусы большей частью жили в избах без труб, курных, низких...; редко где можно найти избы с трубами»[1].

Аб шырокім бытаванні такіх печаў сведчыць таксама данясенне спраўніка Магілёўскага павета ў статыстычны камітэт (1866 г.): «изба строится из круглых сосновых бревен. По правую сторону от входа – печь без трубы. Для прохода дыма в потолке сделано отверстие»[2]. Пасля топкі печкі адтуліну ў столі беларусы зачынялі «вечкам» або набітым сенам мяшком[3]. У Панямонні і шэрагу раёнаў Заходняга Палесся дым падчас топкі ішоў проста ў хату і пасля выходзіў у сенцы праз дзверы. Часам верхняя частка дзвярэй адкрывалася асобна ад ніжняй, каб пазбегнуць скразнякоў. Па звестках Я. Ф. Кахновіча (1907 г. н., жыхара в. Мураўёўка Шчучынскага раёна), «калі палілі курную печ, то адчынялі верхнюю частку дзвярэй, а ніз быў зачынены. У каго дзверы былі суцэльныя, ніз зачынялі посцілкай»[4]. У этнаграфічных апісаннях сустракаецца інфармацыя і пра тое, што дым выходзіў у адмысловую адтуліну ў сцяне, якая аддзяляла хату ад сенцаў.

[1] Без-Корнилович. Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. СПб., 1855. С. 244.

[2] НГАБ. Ф. 2187. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 63–64.

[3] Материалы по этнографии Гродненской губернии. Вильна, 1911. Вып. 1. С. 185; Зеленский И. Материалы для географии и статистики России. СПб., 1864. Ч. 2. С. 668.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці ў 1984 г.



Курная печ. Вёска Магуны, Пастаўскі раён. Рэканструкцыя

У першай палове XIX ст. у паўночна-ўсходняй частцы Беларусі разам з глінабітнымі печамі зрэдку сустракаліся печы-каменкі. Некаторыя этнографы адзначалі на тэрыторыі Беларусі і бытаванне печаў з падвяснымі катламі, якія былі характэрныя для памежнай зоны рассялення латышскага і беларускага народаў[5]. Аналагічныя адкрытыя ачагі з падвясным катлом сустракаліся і ў печах іншых заходнебеларускіх вёсак[6]. На думку даследчыкаў, наяўнасць адкрытага ачага з падвясным катлом у печах з'яўляецца рудыментам старажытнага жылля. У той жа час наяўнасць падвясных катлоў пры печах сведчыць аб агульных рысах у развіцці беларускага і заходнерускага жылля, а таксама жылля фінамоўных народаў, для якіх печы з падвяснымі катламі асабліва характэрныя.

Нягледзячы на вялікую разнастайнасць канструкцый печ на ўсёй тэрыторыі Беларусі ўяўляла сабой у асноўным адзін і той жа тып. Яна складалася з ніжняй, сярэдняй (аснова) і верхняй частак. Падмурак печы рубіўся з дрэва (зруб), часам замест яго рабілі драўляны насціл на слупах. Слупавая і зрубная аснова печы вядома ўсходнім славянам са старажытных часоў. Аб абшары яе распаўсюджання ў Кіеўскай Русі сведчаць археалагічныя матэрыялы[7].

[5] Чижикова Л. Н. Изучение сельского жилища восточных славян // Сов. этнография. 1976. № 4. С. 37, 40; Анимеле Н. Быт белорусских крестьян // Этногр. сб. СПб., 1854. Вып. 2. С. 126.

[6] Русские: ист.-этногр. атлас. М., 1967. С. 160.

[7] Загорульский Э. М. Археология Белоруссии. С. 147.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Печ з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Пачатак XX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Падпечча з в. Бракава Слабада, Чавускі раён Магілёўскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

Традыцыйнасць тэхнікі ўзвядзення печаў прасочваецца і ў перыяд Сярэднявечча. Таму шырокае бытаванне слупавай і зрубнай асновы ў канцы XIX – пачатку XX ст. правамерна звязваць з этнічнымі традыцыямі старажытнаславянскага насельніцтва. Аналіз крыніц сведчыць, што аснова печы ў даследуемы перыяд таксама збівалася з гліны, выкладвалася з цэглы. У ніжняй частцы печкі звычайна рабілі квадратную адтуліну («падпечча»). У ім у маразы трымалі хатнюю птушку, складвалі пакінутыя пасля топкі печы дровы і г. д. Для захоўвання кухоннага посуду над падпеччам (у Паазер'і, Панямонні, Магілёўскім Падняпроўі, шэрагу раёнаў Цэнтральнай Беларусі і Заходняга Палесся) рабілі падоўжанае паглыбленне – падпрыпечак («пыдзагнётак»). Заканчвалася ніжняя частка печы верхняй кладкай – пляцоўкай перад вусцем печы з плошак або тонкіх бярвенняў. На ёй збівалі з гліны або выкладвалі з цэглы под («чарэнь», «замёт», «чэрын», «чэрань»), на якім ужо ўзводзілі звод печы. Як паказалі літаратурныя крыніцы, для лепшага ўтрымання цяпла под падмашчвалі дробнымі гладышамі, бітым шклом[1].

Пярэдняя частка аснавання печы выдавалася перад вусцем – гэта «прыпечак», «прыпек», «прадпечак». Сярэдзіна «прыпечка» супраць вусця печы называлася «загнёт», «загнётак». У курной печы «прыпечак» заставаўся адкрытым, у «белай» печы над ім ладзілі «комін», які збіраў і адводзіў дым у трубу. Адкрыты прыпечак можна было сустрэць і ў печы з комінам. У прыватнасці, такія прыпечкі былі зафіксаваны А. Харузіным у Гродзенскай губерні[2], дзе над імі ўладкоўваўся навес для адводу дыму ў комін. Такі навес называўся «шапкай» ці «комінам». Зварот да тэрміна «комін», «камін» паказвае, што ён ужываўся і ў папярэднія стагоддзі, прычым яго значэнне было дастаткова ёмкім. Тэрмінам «комін» называлі ачаг-прыпечак, «пячную трубу», «ачажок» для распальвання лучыны («камінок», «камін»). На думку А. Харузіна, тэрмін «комін» выцесніў слова «вогнішча», атрымаўшы яго значэнне, г. зн. значэнне ачага[3].

На прыпечку справа ці злева рабілі пячурку («копкі», «ямкі», «кубкі»), куды зграбалі жар, які прыкрывалі попелам. У курной печы ямкі ўяўлялі з сябе асобныя квадратныя прыбудовы з цэглы,

[1] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности. Витебск, 1895. С. 244.

[2] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае // Виленский временник. Вильна, 1907. Кн. II. С. 186.

[3] Тамсама. С. 193–194.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

у «белай» – былі схаваны ў паглыбленнях з правага ці левага боку прыпечка («загнета»).

У большасці раёнаў Беларусі на прыпечку печы рабілася яшчэ адна разнавіднасць пячурак – «камінок», «камянок», «комінак», «пячурка», «кучка», «копка». Да найбольш распаўсюджаных адносіцца тэрмін «камінок», які ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі ўжываўся нароўні з іншымі тэрмінамі, а ў некаторых ён пераважаў. Асаблівая распаўсюджанасць яго прасочваецца ва ўсходняй частцы Беларусі, сустракаецца ў Брэсцкай вобласці і Цэнтральнай Беларусі. Бытаванне тэрміна «комін» лакалізуецца на тэрыторыі Панямоння. Тэрміны «кучкі», «копкі» з'яўляюцца пераважнымі ў Заходнім Палессі.

Нанясенне на карту раёнаў бытавання «камінкоў» выявіла, што яны былі шырока вядомыя ў Заходнім і Ўсходнім Палессі, Цэнтральнай Беларусі, Гомельскім Падняпроўі, паўднёва-ўсходніх раёнах Магілёўскага Падняпроўя, усходніх раёнах Гродзенскай вобласці (Навагрудскі, Дзятлаўскі, Іўеўскі), зрэдку сустракаліся ў паўднёвых раёнах Панямоння. Як паказала картаграфаванне, у Паазер'і, паўночных раёнах Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей печы будавалі без камінкоў.

Верхняя частка печы складалася з роўнай глінабітнай пляцоўкі (на якой адпачывалі, сушылі вопратку, часам збожжа) і коміна («дымаход», «шапка»). У пярэдняй частцы коміна знаходзілася аддушына з засаўкай («юшка», «люшка», «уюшка»), якая служыла для перакрыцця коміну, «каб не дула звонку». Вышыня коміна ўнутры хаты прыблізна была 1,5 м, шырыня ўнізе 0,8 м, зверху комін звужаўся да 0,5 м. Мяркуючы па матэрыялах Н. І. Лебедзевай, пячны комін на гарышчы нярэдка працягваў драўляны даўблёны комін («дуплянка»), унутры «абшмараваная глінай»[1]. Такі комін калісьці ўсталёўваўся ў курных хатах у адтуліне верхніка. Набліжаны да вусця печы, ён, верагодна, і паслужыў прататыпам сучаснага коміна.

У кутку каля печы, знаходзіўся «качарыжнік», «кашэшнік», «важужнік», дзе ставілі качаргу («кавеня», «качарга»), рагач («вілкі», «рагач»), чапялу («ёмка», «чапля», «чапяла», «чаплайка»). «Вілкі» і «ёмкі» ў даследуемы перыяд звычайна былі жалезныя з драўлянымі ручкамі, «кавеня» ў большасці выпадкаў драўляная, выраблялася з суцэльнага ствала сасны, выкапанага з коранем.



Печ з падпрыпечкам з в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Пачатак XIX ст.

На вуглу печы, амаль у сярэдзіне хаты, усталёўваўся слуп («стоўп», «конь», «конеў стовб»), у які часта ўсякалі жэрдку – біла. Экспедыцыйныя даныя паказваюць наступныя абазначэнні жэрдкі: часцей за ўсё – «біла», «шост», сустракаецца «ашостак», рэдка «перасоўка». Слуп служыў апорай для «пола», палацяў і ляжанкі. Быў найбольш распаўсюджаны ў Магілёўскай і Віцебскай губернях. У ім рабіліся паглыбленні, якія служылі для прасушкі тытуню, насення.

Ад месцазнаходжання печы ў хаце залежала размяшчэнне іншых частак інтэр'ера. Як вядома, Беларусь уваходзіла ў рэгіён з адзінай украінска-беларускай планіроўкай. Характэрнай яе асаблівасцю было размяшчэнне печы каля дзвярэй. Па дыяганалі ад печы ў беларускім сялянскім жыллі знаходзілася покуць («кут») – найбольш каштоўная і ганаровая частка жылля селяніна. У сваю чаргу ў доме ўсё было зарыентавана ў адносінах да покуці.

[1] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. М., 1929. Вып. 1. С. 10.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Покуць з в. Волева, Дубровенскі раён Віцебскай вобласці. Пачатак XX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Спальнае месца («пол») з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

На покуці звычайна ставілі стол – адзін з самых старажытных відаў перасоўнай мэблі, што складае асаблівасць беларускага жылля. У Беларусі сталы часцей за ўсё рабілі на «казюлях»[1], г. зн. на козлах – дзвюх крыжавінах, злучаных перакладзінай. Стол быў пакрыты абрусам («ад суботы да суботы»). Падчас абеду абрус здымалі. Як паказалі палявыя даследаванні, у шэрагу раёнаў Цэнтральнай Беларусі, Заходняга і Усходняга Палесся, у адрозненне ад астатняй тэрыторыі Беларусі, кутны стол у звычайны час не пакрывалі настольнікам і пакідалі пустым без хлеба і солі («настольнік засцілалі толькі ў нядзельку»), а ў паўднёва-заходніх раёнах Брэсцкай вобласці на стале заўсёды былі хлеб і соль[2].

У XIX ст. члены сям'і за стол падчас абеду рассаджваліся ў строга ўстаноўленым парадку. Па этнаграфічных матэрыялах І. А. Сербава, бацька сядзеў у цэнтры, побач з ім браты або старэйшыя сыны, жанчыны сядалі дзе-небудзь з краю «на ўслонцах, але часта, калі не хапала за сталом месца, елі стоячы»[3].

Наступнай функцыянальнай часткай жылля, якая мела агульны характар для Беларусі, з'яўляецца

[1] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 314.

[2] Наровська А. М. Спільні риси в матеріальній культурі білорусів та українців: на матеріалах інтер'еру селянського житла кінця XIX – початку XX ст. // Народна творчість та етнографія. 1987. № 5. С. 35.

[3] Сербов И. А. Белорусы-сакуны. Пг., 1915. С. 12.



Калыска (зыбаўка). Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

месца адпачынку. Тут размяшчалася найбольш масіўная канструкцыя, якая прызначалася для сну, – «пол». Габарыты «пола» часта вызначаліся шырынёй печы і кутным прыпечным слупам. Накінуты на «ашостак» полаг аддзяляў «пол» ад астатняй прасторы хаты. Гэта рабілася, у прыватнасці, тады, калі ў сям'і мелася парадзіха.

Над «полам» на ўзроўні печы рабілася больш вузкая пляцоўка – «палаці» ці «палаткі», дзе спалі звычайна старыя і дзеці[1]. Як рудымент палаці ў рэдкіх выпадках захаваліся да ХХ ст. У прыватнасці, яны былі выяўлены падчас этнаграфічнай экспедыцыі ў 1984 г. ў в. Парэчча Пухавіцкага раёна ў хаце, якая належала І. С. Скачок.

Экспедыцыйныя даследаванні паказваюць, што палаці шырока бытавалі ў Паазер'і, Цэнтральнай Беларусі, Магілёўскім Падняпроўі, усходніх раёнах Панямоння. Зрэдку палаці можна было сустрэць у паўднёвых раёнах Панямоння і ўсходніх раёнах Усходняга Палесся.

Каля краю «пола» на доўгай гнуткай жэрдцы ў беларусаў падвешвалася калыска. На тэрыторыі Беларусі былі вядомы разнастайныя тэрміналагічныя абазначэнні калыскі. У адных выпадках яны адлюстроўвалі практычнае прызначэнне калыскі:



Палаці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

«калыска», «калубель», «калубень», «люлька», у іншых – розніцу ў спосабе падвесу і гойдання: «зыбка», «зыбаўка». Так, калі «калыска» падвешвалася да бэлькі столі і гайдалася з боку ў бок, то «зыбка» прымацоўвалася да канца гнуткай жэрдкі і гайдалася зверху ўніз (адзначана паўсюдна ў Паазер'і, Крупскім, Барысаўскім, Лагойскім раёнах Мінскай вобласці, у Астравецкім, Смаргонскім, Ашмянскім раёнах Панямоння). Часам назва калыскі непасрэдна паказывала на матэрыял вырабу: «лубяначка». Дыялектнае «таганы» адзначана ў Віцебскім

[1] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России...: Гродненская губерния. Ч. 1. С. 493; Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии. Могилев, 1882. Кн. 1. С. 474.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Хадуны з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

і Шумілінскім раёнах, дзе яно азначае палатняную калыску[1].

Да рухомай часовай мэблі сялянскага жытла адносяцца розныя прыстасаванні для маленькіх дзяцей – стаякі, хадуны і сядзелкі. Найбольш шырокае бытаванне на тэрыторыі Беларусі атрымаў тэрмін «стаяк». Мяркуючы па экспедыцыйных даследаваннях, самымі распаўсюджанымі тэрмінамі былі «стойка» і «стаяк». Гэтыя назвы ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі ўжываліся нароўні з іншымі, а ў некаторых яны пераважалі. Асаблівая распаўсюджанасць іх прасочваецца ў паўночнай і заходняй Беларусі. На паўночным захадзе Мінскай вобласці, па звестках інфарматараў, існаваў тэрмін «стаёнка», а ва Усходнім Палессі – «стоячка».

Стаяк уяўляў сабой дзве драўляныя асновы, злучаныя чатырма планкамі «стоечкамі». У верхняй дошцы прарэзвалася круглая адтуліна, куды ставілі дзіця. У паўночных раёнах Беларусі верхняя дошка заўсёды мела форму авала, на Палессі абедзве дошкі былі квадратнай формы.

Мяркуючы па этнаграфічных матэрыялах Я. Э. Бломквіст, «найбольш распаўсюджаная форма хадункоў у беларусаў – гэта табурэтачка з колцамі на ножках, замест сядзення – дошка з круглай адтулінай або вялікім кальцом»[2].

Шматлікія экспедыцыйныя даследаванні не пацвярджаюць дадзенае палажэнне. Тып хадуноў, апісаных Я. Э. Бломквист, існаваў у нязначнай колькасці. Як сведчаць палявыя даныя, на тэрыторыі Беларусі быў шырока вядомы зусім іншы тып хадуноў. Асновай іх служыў вертыкальны шост, верхні канец якога прапускаўся ў пятлю або клямар, прымайстраваны збоку бэлькі, ніжні канец упіраўся ў ямку, зробленую ў глінабітнай падлозе. У ніжнюю частку шаста на вышыні грудзей дзіцяці прыбівалі папярочную планку з прымацаваным да яе паўколам з сагнутага дубца. У яго ставілі дзіцяці, якое хадзіла вакол шаста, трымаючыся за планку.

Цікавы тып хадуноў, па звестках А. С. Копаць (1918 г. н., жыхаркі в. Гнесевічы), існаваў у Навагрудскім раёне. «Хадункі» ўяўлялі сабой два драўляныя абручы, злучаныя шасцю сагнутымі ножкамі, выробленымі з арэшніку. Адлегласць паміж абручамі і ножкамі пераплятали лазовымі прутамі[3].

Экспедыцыйныя матэрыялы выявілі наступныя абазначэнні хадуноў: часцей за ўсё – «хадуны», «хадункі», «хадухі». Паняцце «хадуны» знайшло адлюстраванне і ў дыялектнай тэрміналогіі. Так, у в. Галынка Зэльвенскага раёна прыстасаванне для навучання дзяцей хадзе называлі «круцёлка»[4]. У в. Воўкавічы Навагрудскага раёна казалі «пахадзяшчая стойка». У Цэнтральнай Беларусі аб хадунах казалі «хадакі» (Крупскі раён), «хадэлка» (Барысаўскі раён).

Каб навучыць дзіця сядзець, карысталіся «сядзелкай». Яе выраблялі з кавалка бервяна даўжынёй 40–50 см, частку якога выдзёўбвалі з аднаго боку, пакідаючы апору для спінкі дзіцяці – атрымлівалася своеасаблівае крэселка. Каб дзіця не выпала, праз вуглы сценак крэселка прапускалі гарызантальны прут – «запор». «Сядзелку» звычайна ставілі на лаву, да «запору» прывязвалі цацкі. Мяркуючы па матэрыялах палявых даследаванняў, на тэрыторыі Беларусі таксама існавалі «сядзелкі» іншых канструкцый.

Каля сцен стацыянарна ўстанаўліваліся шырокія лавы. Яны з'яўляліся фамільнай каштоўнасцю сялян і перадаваліся з пакалення ў пакаленне; пры

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Віцебскі раён у 1984 г., Шумілінскі раён Віцебскай вобласці ў 1985 г.

[2] Бломквист Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов // Восточнослав. этногр. сб. М., 1956. С. 436.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці ў 1987 г.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці ў 1983 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Бабін кут. Паліца. З в. Агароднікі, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Бабін кут. Паліца. Канец XIX – пачатак XX ст. З в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўваходзінах яны ўрачыста пераносіліся са старой хаты ў новую.

Лавы служылі месцам адпачынку і працы. Часта ў лавах рабілі адтуліны і ціскі для замацавання калаўротаў, часальных грабянёў[1], а часам ціскоў для сталярнага і іншых рамёстваў.

Пры ўваходзе, насупраць вусця печы знаходзіўся гаспадарчы кут («бабін кут»). Каля дзвярэй на нерухомай лавачцы (у Цэнтральнай Беларусі, Паазер'і) стаяла кадушка («цэбар») для вады з чарпаком («конаўкай»). У Магілёўскім Падняпроўі для захоўвання вады выраблялася адмысловая кадушка («яшчык») круглай формы з клёпак (прастакутныя выгнутыя дошчачкі) з вечкам. Яна была шчыльна абвіта 6–8 лазовымі абручамі. На вечка «яшчыка» ставілі два драўляныя вядры[2]. У панёманскім жыллі вядро з вадой стаяла на калодзежы альбо яго падвешвалі на дрот да бэлькі.

Своеасаблівай функцыянальнай зонай у беларускім жыллі служыла прастора паміж покуццю і «полам». Гэта было працоўнае месца, звычайна сезоннага характару. У кутняй сцяне паміж сталом і «полам» для сну ставілі ткацкі станок («кросны») (паўднёвая частка Магілёўскай вобласці). У шэрагу месцаў «ставы» ўсталёўваліся ля падоўжнай сцяны паміж двума вокнамі, побач з гаспадарчым кутом.

[1] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. В 3 т. СПб., 1902. Т. 3. С. 501.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.



Кросны ў інтэр'еры жылля

Тамсама паміж покуццю і «полам» стаяў кубел для захоўвання адзення і іншых рэчаў. Найбольш старажытная разнавіднасць кубла на Беларусі – кубел, выраблены з цэльнага кавалка ствала дрэва з дуплом, які выкарыстоўваўся ў ляжачым выглядзе, з устаўнымі днішчамі і бакавым выразаным «вечкам». Больш позняя форма кубла – стаячая, вышынёй 1 м і болей, вузкая выдзеўбаная кадка з вушкамі, накрыўкай і накладным замком.

У канцы XIX – пачатку XX ст., мяркуючы па этнаграфічных матэрыялах, у Беларусі ўжо быў шырока распаўсюджаны кубел бандарнай працы – шырокая невысокая дзяжа (каля 60 см вышынёй і каля 70 см шырынёй) з клёпак, з накладкай і вісячым замком. У другой палове XIX ст. кубел хутка стаў выходзіць з ужытку і замяняцца куфрамі.

У сярэдзіне XIX ст. падлога ў хаце была глінабітная або земляная («ток», «тачок»), радзей драўляная («памост», «мост»). Перавага ў гэты перыяд традыцыйнага глінабітнага тока з'яўляецца агульнанацыянальнай асаблівасцю беларускага народнага жылля. Канструкцыя глінабітнага і землянога тока была простай. Для стварэння землянога тока («зямля») прыкладна да ўзроўню другога вянка зруба насыпалася зямля, якая ўтрамбоўвалася адмысловымі прыстасаваннямі («чакухамі»). Каб атрымаўся глінабітны «ток», таксама насыпалася зямля да гэтага ж узроўню, утрамбоўвалася, а пасля яе некалькі разоў залівалі растворам гліны. «Добра выраблены ток, – пісаў І. А. Сербаў, – трымаў цяпло і сухасць, яго можна было нават мыць»[1].

Агульным для ўсёй Беларусі быў характар асвятлення жылля. Як вядома, колькасць вокнаў у жыллі і іх размяшчэнне з'яўляецца адной з характэрных рыс таго ці іншага этнасу. Агульнанацыянальная асаблівасць беларускага народнага жылля – наяўнасць 3–4 вокнаў: 1–2 на вулічным фасадзе і 2 з боку двара. Гэта традыцыя была настолькі моцнай, што захоўвалася сялянамі нават пры перасяленні ў раёны, якія адрозніваліся па кліматычных і геаграфічных умовах ад іх ранейшага месца жыхарства (у прыватнасці, Сібір, Алтай і іншыя раёны Расіі).

У некаторых раёнах Палесся колькасць вокнаў была рэгламентавана народным звычаем. Так, у лакальнай этнаграфічнай групы беларусаў-сакуноў у жыллі ніколі не прарубалі больш за тры акны. І. А. Сербаў прыводзіць выпадак, які адбыўся ў в. Ляўкі Брэсцкай вобласці ў пачатку XX ст. Гаспадар хаты, адведзенай пад земскую школу, прарубіў акно ў хаце толькі з блаславення святара і мірскага сходу[2]. У той жа час у шэрагу раёнаў Усходняга Палесся, акрамя 3–4 вокнаў, прарубалі яшчэ адно маленькае «акенца» над спальным месцам – «полам» («Каб падглядзець, калі развіднее і чуць, дзе хто крычыць на сяле»)[3]. Іншыя разнавіднасці насілі таксама лакальны характар. Напрыклад, адсутнасць вокнаў у тарцовай сцяне вулічнага фасада, якая сустракаецца ў Заходнім Палессі, была абумоўлена размяшчэннем хаты паміж гаспадарчымі пабудовамі ў пагонным радзе[4].

Для беларускага народнага жылля былі характэрны невысокія аднастворкавыя дзверы, скалоча-

[1] Сербаў І. А. Вічынскія паляне. Мінск, 1928. Ч. 1. С. 17.

[2] Сербов И. А. Белорусы-сакуны. С. 34.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці ў 1981 г.

[4] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. С. 103; Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся. Мінск, 1978. С. 37–38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя з 4–5 дошак. Дзвярам, як і аконным праёмам, у беларускім будаўніцтве надавалася вялікая ўвага, ад іх дакладнай падгонкі ў значнай меры залежала захаванне цяпла ў жыллі.

У інвентарах XVII–XVIII стст. неаднаразова згадваюцца дзверы, якія круцяцца на драўлянай восі («на бегунах» або «пятцы»). «...Вход в сени через дверь на бегуне. С правой стороны пекарня. Дверь на бегуне с крючком и пробоями...»[1]. Для такіх дзвярэй унізе ставілася калодка з паглыбленнем – «чашкай», у якой круціўся завостраны канец восі дзвярэй. Такія самыя дзверы нярэдка сустракаліся і ў XIX ст. Аднак у другой палове XIX ст. найбольш распаўсюджанымі становяцца дзверы на кованых завесах з драўлянымі або каванымі клямкамі і замкамі.

У XIX ст. на тэрыторыі Беларусі былі вядомы дзве разнавіднасці столі – скляпеністая і гарызантальная («столь», «сталяванне», «суфіт», «пацёс», «пакот»). Архаічная скляпеністая столь сустракалася рэдка, пераважнай формай была плоская столь.

Скляпеністая столь была вядома ў двух варыянтах. У адных выпадках яна выраблялася з круглых бярвенняў, якія накладваліся на бярвёны («франтоны»), што паступова звужаліся. Другая канструкцыя скляпеністай столі заключалася ў тым, што тры бэлькі ўмацоўвалі ўздоўж хаты: сярэднюю па ўзроўні вышэй за дзве крайнія. Перпендыкулярна бэлькам насцілалі колатыя плахі. Такая канструкцыя столі з'яўлялася пераходнай формай ад скляпеністай да гарызантальнай і была зафіксавана Н. І. Лебедзевай і іншымі этнографамі яшчэ ў пачатку XX ст. на тэрыторыі Палесся[2].

Пра бытаванне скляпеністай столі ў канцы XIX – пачатку XX ст. на Магілёўшчыне гаворыцца ў этнаграфічным даследаванні Е. Р. Раманава: «У старых курных хатах захаваліся яшчэ скляпеністыя столі, у выглядзе арак»[3]. Скляпеністыя столі, з'яўляючыся архаічнымі элементамі, вызначалі аб'ёмна-прасторавую форму ўнутранага памяшкання, падоўжнае размяшчэнне столевых брусоў, наяўнасць прысценных «град» як абавязковага элемента, «верхніка» для дыму, адсутнасць гарышча і інш. У XIX ст. скляпеністыя столі былі цалкам выцеснены гарызантальнымі[4]. Але яшчэ ў пачатку XX ст. яны сустракаліся ў гаспадарчых пабудовах, а часам і ў хатах, што сведчыць пра іх ранейшае шырокае распаўсюджанне.

Гарызантальная столь насцілалася паралельна дзвярам на бэльку, пакладзеную ўздоўж хаты. Мяркуючы па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый і літаратурных крыніцах XIX – пачатку XX ст., на тэрыторыі Беларусі часцей за ўсё сустракалася столь, якая складалася з двух радоў дошак, прычым першы рад насцілаўся вельмі рэдка, з невялікімі прагаламі, другі рад намашчвалі на гэтыя прагалы.

Для абазначэння такой канструкцыі столі на Віцебшчыне ўжываліся наступныя назвы: «у рашотку», «у нахлёст». Разам з гэтымі тэрмінамі на тэрыторыі Беларусі ўжываліся таксама: «у накладку» (Дзяржынскі раён Мінскай вобласці), «у расшыўку» (Валожынскі раён), «пакрываны» (Мінскі раён). Тэрмін «у налапку» пераважае на Магілёўшчыне.

Уздоўж хаты праходзіў падоўжны брус («трам»), размешчаны ніжэй узроўню бэлек. Цесна звязана з канструкцыяй даху столь на траме і яе разнавіднасці, характэрныя таксама для ўкраінскага Палесся, заходняй часткі Польшчы, Літвы[5]. Трам (маціца) акрамя Беларусі сустракаўся і ў чэхаў[6].

Агульнанацыянальныя асаблівасці інтэр'ера можна выявіць у традыцыйным спосабе асвятлення хат. Так, па тыпу асвятляльных прыстасаванняў тэрыторыя Беларусі можа быць падзелена на два рэгіёны: для паўночнага былі характэрны пераносныя лучнікі, а для паўднёвага – падвясныя.

Экспедыцыйныя матэрыялы паказваюць наступныя абазначэнні пераноснага лучніка: часцей за ўсё – «светач», «светоч», сустракаецца «светош», «светыш», рэдка – «свеч», «свяціла». Дыялектнае «дзед» адзначана ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці[7].

Прыкметнай асаблівасцю адрозніваўся традыцыйны спосаб асвятлення хат у Паазер'і, паўночных раёнах Цэнтральнай Беларусі, Панямонні і ў Магілёўскім Падняпроўі. У шэрагу раёнаў гэтых рэгіёнаў лучыну ўтыкалі ў спецыяльную адтуліну над «чалеснікам» печы ці ў паз паміж бярвеннямі[8].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

[1] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 3 адв.

[2] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. С. 9; Материалы по этнографии Гродненской губернии. С. 22.

[3] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 9.

[4] Беларускае народнае жыллё. Мінск, 1973. С. 38.

[5] Самойлович В. П. Українське народне житло (кінець XIX – початок XX в.). С. 51–54, 160–162.

[6] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 201.

[7] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Мастоўскі раён Гродзенскай вобласці ў 1984 г.

[8] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у паўночныя раёны Мінскай вобласці ў 1987 г., у Чавускі раён у 1987 г.



Лучнік. Палессе.
1935–1938 гг.
Фота Г. Паддэмбскага

Ва Усходнім і Заходнім Палессі, Гомельскім Падняпроўі, паўднёвых і ўсходніх раёнах Цэнтральнай Беларусі шырокае распаўсюджанне атрымалі падвясныя лучнікі («лушнік», «свяцельнік», «прысвітач», «світыльнік», «пасвет»). Ён складаўся з дзвюх частак: падстаўкі для лучыны і выцяжнога коміну над ёй, які праходзіў праз столь і дах. Гэты комін у беларусаў называўся лучнікам[1]. Ён змяшчаўся насупраць вусця печы на адлегласці каля 1 м ад «прыцапечнага» акна.

Комін меў усечаную канічную форму даўжынёй каля 1 м, шырынёй 45–50 см у ніжняй частцы, да 20–30 см у сярэдняй і верхняй частках. Падстаўкай служыў пень з пастаўленым на яго чарапком, каменем альбо шост, ніжні канец якога ўрубаўся ў абрэзак дошкі або абрубак дрэва, на верхнім канцы знаходзіліся металічныя краты, на іх гарэла лучына.

Інтэр'ер і ўнутранае абсталяванне беларускага народнага жылля фарміраваліся ў адзіным працэсе развіцця жылля ўсходніх славян. Агульныя рысы назіраюцца ў тыпова беларускай асаблівасці – наяўнасці аднаго-двух вокнаў на вулічным фасадзе. Наяўнасць аднаго-двух вокнаў на тарцовай сцяне характэрна для літоўскага і польскага жылля і ўласціва ўсім вузкафасадным жылым пабудовам, распаўсюджаным у заходняй частцы Усходняй Еўропы. З прасоўваннем на ўсход і паўночны ўсход шырыня фасада павялічваецца.

Па колькасці і размяшчэнні вокнаў беларускае народнае жыллё асабліва збліжаецца з украінскім. Больш за тое, як і ва ўкраінскім жыллі, вокны ў залежнасці ад размяшчэння называліся па-рознаму: размешчаныя каля кута называліся «кутнымі» ў беларусаў ці «пакутнымі» ў украінцаў. Акно насупраць печы – «проціпечнае», «прадпечнае», «препічнае» або «пасметнае» ў беларусаў, «передпічне» ў украінцаў, другое акно па франтоне – «акалапольное» ці «запечнае» ў беларусаў, «застільне» ў украінцаў[2].

Шэраг агульных рыс можна прасачыць у апрацоўцы сцен. На поўначы Палесся ў украінцаў, як і ў беларусаў, сцены хат пакрываліся глінай і бяліліся толькі ўнутры[3]. У шэрагу раёнаў Беларускага і Украінскага Палесся сцены бялілі без абмазкі. Тынкоўка і пабелка былі шырока распаўсюджаны і ў палякаў, чэхаў, славакаў, венграў, у паўднёвай

[1] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. С. 13.

[2] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 55.

[3] Наулко В. И., Миронов В. В. Культура и быт украинского народа. Киев, 1977. С. 43.

РЕПОЗИТОРИЙ

Расіі. Ацеска сцен знутры, уласцівая для паўночнай часткі Беларусі, была характэрна таксама для рускіх і прыбалтыйскіх народаў. У Падняпроўі, як і ў сярэдняй паласе Расіі, была шырока распаўсюджана традыцыя мыцця сцен.

Для Беларусі характэрна кутняе размяшчэнне печы, вусце якой павернута да бакавой сцяны. Літаратурныя крыніцы канца XIX–XX стст. сведчаць пра існаванне дадзенай асаблівасці таксама ў сялянскім жыллі рускіх і ўкраінцаў. Для паўночнарускіх абласцей характэрна арыентацыя печы вусцем унутр жылля (Архангельская, Валагодская, Кіраўская вобласці, Паволжа і г. д.)[1].

Разам з тым аналагічнае размяшчэнне печаў сустракаецца і ў народным жыллі Эстоніі і Латвіі, беларускім Паазер'і і Падняпроўі, з гэтага вынікае, што фарміраванне гэтай традыцыі ў жыллі розных народаў ішло па меры прасоўвання на поўнач.

Супастаўленне этнаграфічных матэрыялаў усходнеславянскіх і іншых народаў паказвае, што печ распаўсюджана і за межамі ўсходнеславянскай этнічнай тэрыторыі – у палякаў, чэхаў, славакаў. Печ харватаў і славенцаў па канструкцыі і дэталях мае падбенства з усходнеславянскай. Напэўна, печы такога тыпу ў мінулым у прымітыўнай форме былі распаўсюджаны ад Усходняй Еўропы да Усходніх Альп[2].

Можна выявіць і падабенства канструкцыі печаў. Так, печы Падняпроўя і паўночнага ўсходу Паазер'я блізкія да печаў сярэднерускай паласы, ўскладняецца іх канструкцыя, глінабітныя матэрыялы часцей замяняюцца абпаленай цэглай, павялічваюцца памеры. Печы Палесся, паўднёва-заходняга Панямоння па канструкцыі, форме і габарытах маюць падабенства з украінскімі.

Як ужо адзначалася вышэй, па дыяганалі ад печы ў беларускім сялянскім жыллі знаходзілася покуць (як у паўночнарускім тыпе). «Покуць», «чырвоны» ці «вялікі кут» у ўкраінцаў, у заходнерускім і паўночнарускім жыллі таксама змяшчаўся супраць уваходу. У гэтым адрозненне яго ад «святога кута» паўднёварускай хаты, размешчанага каля ўваходных дзвярэй.

Важным элементам усходнеславянскага жылля быў стол. У старажытнасці былі вядомы і нерухомыя глінабітныя сталы з ножкамі, укапанымі ў зямлю[3]. У Беларусі стол ставіўся звычайна доўгім бокам да фасаднай сцяны, як у ўкраінцаў і ў заходніх губернях Расіі, што было зручна ў невялікай па памерах хаце. У паўночнарускіх народаў ён ставіўся вузкім бокам да фасаднай сцяны жылля. У Верхнім Паволжы існаваў звычай прыбіраць стол пасля ежы на лаву. Аб бытаванні ў паўночных паветах Віцебскай губерні падобнага звычаю згадвае М. Анімеле: «пасля трапезы стол адсоўвалі ў кут, да той сцяны, ля якой знаходзілася печ»[4].

Унутранае абсталяванне ўсходнеславянскага жылля разам з яго канструкцыямі ўяўляла непарыўнае цэлае («пол», лавы, палаці і г. д.). «Пол» – нары – адна з агульных рыс усходнеславянскага жылля. Арэал іх ахоплівае Беларусь, Украіну, заходнерускія і ўсе паўднёварускія раёны. У залежнасці ад той ці іншай планіроўкі жылля «пол» размяшчаўся ў беларускім, украінскім і заходнерускім жыллі паміж печчу і тарцовай «кутняй» сцяной, у паўднёварускім жыллі заходніх раёнаў – ад уваходнай сцяны да печы, у паўднёварускім жыллі ўсходніх раёнаў – насупраць уваходу[5]. Агульнасць можна прасачыць у распаўсюджанні палацяў у беларускім, рускім і ўкраінскім жыллі. Так, распаўсюджанне палацяў у сярэдняй паласе Беларусі, у прыватнасці на Магілёўшчыне, этнічна звязана з іх бытаваннем у суседніх абласцях сярэдняй паласы Расіі. Адсутнасць падвясных палацяў у заходніх раёнах Беларусі і Заходнім Палессі звязана з аналагічнай асаблівасцю Украінскага Палесся.

Аналагічныя этнаграфічныя сувязі прасочваюцца і ў выкарыстанні ў цэнтральнай, усходняй і паўночна-ўсходняй частках Беларусі ў якасці дадатковага жылля сенцаў, клеці. Наяўнасць ложкаў у сенцах, звычка спаць «на халадку» летам – з'ява, характэрная і для рускага сялянскага жылля, як і ўладкаванне «шлюбнага ложка» ў клеці[6]. Тое ж характэрна для літоўцаў і латышоў, у прыватнасці, у іх жылых комплексах-рыгах.

Шэраг агульных рыс выяўлены намі ў асвятленні сялянскага жылля. Так, светачы, распаўсюджаныя ў паўночнай Беларусі, знаходзяць аналогію ў народ-

[1] Бломквист Е. Э. Общие черты в крестьянском жилище русских, украинцев и белорусов. С. 30–31.

[2] Тамсама.

[3] Бломквист Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов. С. 420.

[4] Анимеле Н. Быт белорусских крестьян // Этногр. сб. СПб., 1854. Вып. 2. С. 127.

[5] Бломквист Е. Э. Общие черты в крестьянском жилище русских, украинцев и белорусов. С. 37.

[6] Бломквист Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов. С. 439.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

ным жыллі латышоў і літоўцаў. Шырока бытавалі светачы разнастайнай формы і велічыні ў рускіх. Напрыклад, паўночнарускае «светильно» рабілася з карытам на ножках. На тэрыторыі Расіі былі распаўсюджаны і каваныя «светцы», арнаментаваныя раслміннымі ўзорамі. Вядомы на Паазер'і «светач» у выглядзе ўбітага ў сцяну жалезнага зажыма бытаваў таксама ў сярэдняй паласе Расіі. Каваны «святец» у выглядзе літары V утыкалі ў шчыліны бярвеністай сцяны, паміж пласцінамі зажыма ўстаўлялі лучыну, на падлогу ставілі посуд з вадой, каб туды падала вуголле.

Ва Украіне, дзе ў паўночнай частцы галоўным асвятленнем таксама была лучына (Валынь, Чарнігаўшчына, паўночныя раёны Кіеўшчыны, Харкаўшчына), не ведалі «светца». Тут, як і ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі, бытавала «бабка», у якую ўстаўлялі лучыну. Мяркуючы па літаратурных і экспедыцыйных матэрыялах, на Украінскім Палессі, гэтак жа, як і на тэрыторыі Беларускага Палесся, шырока выкарыстоўваліся падвясныя лучнікі (укр. «світник», «світоч», «світач», «посвет»).

Такім чынам, вывучэнне традыцыйнага інтэр'ера беларусаў у гістарычным плане дало магчымасць выявіць у ім пераемнасць многіх традыцый, вызначыць, якія рэліктавыя з'явы ў канструкцыйна-будаўнічай тэхніцы розных элементаў жылля і гаспадарчых пабудоў (печы-каменкі, слупавая і зрубная аснова печы, збудаванне спальных нараў і палацяў, прыстасаванняў для асвятлення лучынай і г. д.) захаваліся да канца XIX – пачатку XX ст. Даследаванне інтэр'ера сялянскага жылля XIX – пачатку XX ст. выявіла шэраг агульных асаблівасцей. Параўнаўчае вывучэнне інтэр'ера народнага жылля Беларусі канца XIX–XX стст. і інтэр'ераў іншых усходнеславянскіх народаў гэтага перыяду выявіла агульныя рысы, якія склаліся ў гэтых народаў у працэсе працяглых этнакультурных кантактаў.

## Абсталяванне падсобных памяшканняў

**Сенцы.** Інтэр'ер беларускага народнага жылля шмат у чым залежаў ад размяшчэння і ўнутранага абсталявання падсобных памяшканняў – сенцаў, варыўні, клеці, каморы і г. д. Асабліва цесную сувязь жыллё мела з сенцамі («сені»). Дадзены тэрмін у шэрагу рэгіёнаў Беларусі ўжываўся нароўні з іншымі, у іншых ён пераважаў. Асаблівая распаўсюджанасць яго прасочваецца ў Гродзенскай, Віцебскай абласцях, паўночных раёнах Мінскай вобласці.

Па звестках А. Харузіна, разам з гэтым словам у Віцебскай губерні ўжывалі тэрмін «сенкі», у Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні казалі «синэ»[1]. На паўднёвым захадзе Палесся, па звестках інфарматараў, сенцы называлі «сіны»[2]. Тэрмін «сенцы» пераважаў у Магілёўскай, паўднёвых раёнах Мінскай вобласці, сустракаўся ва Усходнім Палессі. На Паазер'і да сенцаў ўжывалася назва «трысцен», у Мядзельскім раёне – «прывен», што падкрэслівае дапаможны характар гэтага памяшкання.

На старажытнарускай мове «сень» азначала навес, балдахін, шацёр, будан. Тэрмін «сенцы» ўжываўся і ў сэнсе дома (які называўся таксама «сенніцай»), а таксама ў значэнні судовага месца архірэйскага падворка, княжацкага палаца. У Старажытнай Русі «сеннікам» называўся халодны пакой без печы, а сенцамі і сенніцай – пляцоўка ганка на слупах, пакрытая навесам. Шматзначнасць гэтага слова была звязана, верагодна, з тым, што ў складаных старажытных пабудовах сенцы былі пераходамі, якія злучалі асобныя часткі дома, палаца. З гэтай нагоды І. Забелін адзначаў, што княскі палац не з'яўляўся цэльным будынкам, а складаўся з мноства клецяў, будынін, хат, якія па неабходнасці звязваліся пераходамі – сенцамі.

У беларускім жыллі сенцы прыбудоўваліся да вузкай тарцовай сцяны. Уваходныя дзверы ў сенцы звычайна прарубалі з бакавой сценкі дома, са двара. Толькі ў Суражскім павеце Віцебскай губерні і ў шэрагу паветаў Магілёўскай губерні ўваход у сенцы прасякалі з тарцовага боку пабудовы. Такое адрозненне ад шырока распаўсюджанага тыпу ўсходнеславянскага жылля беларускія этнографы тлумачаць польскім уплывам. У этнаграфічных матэрыялах М. Я. Нікіфароўскага і А. Харузіна адзначаецца, што ў Віцебскай губерні ў адрозненне ад астатняй тэрыторыі Беларусі сенцы мелі выхад на ўсе чатыры бакі: у хату, варыўню, двор і ў хлявы для скаціны[3]. Аб бытаванні на Віцебшчыне скразных дзвярэй згадваецца таксама ў матэрыялах рукапіснага фонду Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта[4].

[1] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 213.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Кобрынскі раён у 1980 г., у Пружанскі раён Брэсцкай вобласці ў 1981 г.

[3] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 211; Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 80.

[4] Рукапісны аддзел бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 34. Адз. зах. 550. Арк. 6 адв.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



Сенцы з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Ступы з адкрытых фондаў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту



Інтэр'ер сенцаў з в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Ступа. Сенцы. Пачатак XX ст. З в. Варашылкі, Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

Непасрэдная сувязь сенцаў з падсобнымі пабудовамі і хлявамі давала магчымасць у зімовы час выконваць мноства гаспадарчых работ, не выходзячы з хаты.

Аналіз літаратурных крыніц канца XIX – пачатку XX ст. і палявых матэрыялаў сведчыць, што сенцы ў беларускім сялянскім жыллі нярэдка па плошчы былі роўныя жыламу памяшканню[1].

Каля дзвярэй пры ўваходзе ў сенцы прасякалі невялікае акно без рамы, якое служыла для святла і праходу паветра. Гэта акенца мела і іншае прызначэнне: праз яго прасоўвалі руку, каб адчыніць засаўку з унутранага боку двара.

[1] Сербов И. А. Поездки по Полесью 1911 и 1912 года. Вильна, 1914. С. 11.

Як у двухкамерным, так і ў трохкамерным жыллі беларусаў, сенцы звычайна не мелі столі. Адсутнасць столі з'яўляецца перажыткам таго часу, калі жыллё ацяплялася па-чорнаму і дым выходзіў у сенцы, а адтуль разыходзіўся па гарышчы. У побытавых адносінах адсутнасць столі ў сенцах рабіла іх будаўніцтва больш танным і спрашчала сувязь з гарышчам (у беларусаў гарышча называлася «гара», «верх»). На гарышча падымаліся пры дапамозе лесвіцы («драбіны»). Яшчэ ў 1920-я гг. дзенідзе для гэтага карысталіся бервяном з засечкамі. Як паказалі палявыя даследаванні, у тым выпадку, калі хата была на сохах (напрыклад, як у в. Падбалоцце Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці), вертыкальны слуп сахі акрамя канструкцыйнага



Куфар у сенцах. Канец XIX – пачатак XX ст. З в. Забродддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Сенцы. Жорны. З в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

меў і ўтылітарнае прызначэнне – служыў асновай лесвіцы на гарышча.

У сенцах, як правіла, была ўтрамбаваная земляная або глінабітная падлога. На тэрыторыі Беларусі існавалі таксама і іншыя віды падлог. Так, у Н. Е. Скалана знаходзім, што ў Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні ў сенцах сустракалася падлога, выкладзеная камянямі[1]. Мяркуючы па этнаграфічных матэрыялах А. К. Сержпутоўскага і М. Я. Нікіфароўскага, у Гомельскай і Віцебскай губернях падлогу ў сенцах часта масцілі дошкамі[2]. Бытаванне драўлянай падлогі ў сенцах ў канцы XIX – пачатку XX ст. пацвярджаецца і палявымі матэрыяламі аўтара[3]. Але ў асноўным гэта было характэрна для сераднякоў і заможных сялян.

Як правіла, сенцы служылі дадатковым памяшканнем, дзе размяшчаліся розныя прадметы хатняга ўжытку. Звычайна кожны сялянскі будынак вылучаўся сваім нязменным інтэр'ерам або наборам характэрных для яго прадметаў. У інтэр'еры сенцаў не было ўстойлівага размяшчэння тых ці іншых прадметаў. Акрамя таго, у сенцах не было якога-небудзь тыповага для іх начыння, акрамя драўлянай ступы і жорнаў («жорна», «жораў», «жарнавы»). Даследаванне тыпаў жорнаў у XIX–XX стст. дазваляе зрабіць выснову, што каменныя жорны паўсюдна існавалі ў Паазер'і, Панямонні, Заходнім Палессі. Звычайна яны мелі рычажны механізм для рэгулявання буйнога і дробнага памолу. Для Падняпроўя і ўсходніх раёнаў Усходняга Палесся характэрны драўляныя жорны. Паўночныя і паўднёва-ўсходнія раёны Цэнтральнай Беларусі з'яўляліся пераходнай паласой, дзе сустракаліся і тыя, і іншыя тыпы жорнаў. Аднак і ступа, і жорны былі вынаснымі і таму часта адсутнічалі. У сенцах знаходзіліся разнастайныя бандарныя і даўблёныя вырабы, прадметы ўжытку і вытворчыя прыстасаванні – валькі, каромыслы, сякеры, сярпы. У сенцах да бэлек падвешвалі кашы з мяснымі прадуктамі. Гэты спосаб захоўвання шырока бытаваў у паўднёва-заходняй частцы Беларусі[4]. Да бакавой сцяны сенцаў часта прымацоўвалася

[1] Скалон Н. Е. Описание крестьянского жилого дома в д. Загорье Волковыского уезда Гродненской губернии // Вилен. временник. 1907. Кн. 2. С. 112.

[2] Сержпутовский А. К. Отчет о поездке в Гомельскую губернию в 1926 году. Менск. 1926. С. 5; Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии. С. 253.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Віцебскі і Полацкі раёны Віцебскай вобласці ў 1988 г.

[4] Титов В. С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов. Минск, 1983. С. 59.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Сенцы. Ложак. З в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Сенцы. Ложак. З в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

паліца («палічка») для інструментаў. На агульнай з хатай сцяне вісела штодзённае адзенне. У рэдкіх выпадках у бедных сем'ях у сенцах можна было сустрэць тое, што ў больш заможных захоўвалася ў адмысловых памяшканнях, напрыклад, куфар з каштоўнымі рэчамі, вопраткай і грашыма, кадкі або кашы з хлебам і мукой («пакутай»). Тут жа маглі стаяць цэбры, бочкі, дзежкі з вадой.

Узімку сенцамі карысталіся для кармлення свіней, курэй і гусей. У бяднейшага сялянства было нярэдкім двухкамернае жыллё (хата + сенцы). Пры такой планіроўцы, як пісаў А. Харузін, «у сенцах, як правіла, адгароджвалася невялікае памяшканне («катух») для жывёлы»[1]. Такі спосаб размяшчэння жывёлы некалі быў распаўсюджаны не толькі ў беларусаў, але і ў іншых славян.

Часам сенцы ператвараліся ў рамесную майстэрню, такім чынам іх інтэр'ер набываў характэрныя рысы ў залежнасці ад роду дзейнасці гаспадара. У Панямонні і часам у Цэнтральнай Беларусі ў сенцах нярэдка рабілі склеп, куды складывалі на зіму бульбу, бручку («брушку») ставілі ў кадках капусту, буракі і інш. «У гэтых жа склепах, – адзначае П. В. Шэйн, – дзяўчаты захоўвалі ў пяску руту – на выпадак замужжа ці калі ёй давядзецца быць дружкай у нявесты, дзе без руты нельга было паказацца»[2].

Такім чынам, сенцы з'яўляліся прамежкавым памяшканнем, галоўная мэта якога – абараняць жыллё ад холаду, а таксама злучаць яго з іншымі памяшканнямі.

Як паказваюць матэрыялы этнаграфічных экспедыцый і літаратурныя крыніцы XIX – пачатку XX ст., на тэрыторыі Палесся сенцы («ляцён») выкарыстоўваліся не толькі як дапаможнае, але і як жылое памяшканне. І таму меліся свае асаблівасці ў арганізацыі іх інтэр'ера. Разам з прадметамі ўжытку і посудам тут размяшчаўся ложак (ці ўладкоўваўся спецыяльны памост), дзе летам спалі. На покуці вешалі абраз. Па звестках Н. І. Лебедзевай, ва Усходнім Палессі сустракаліся сенцы з падлогай, покуццю і пасцелямі (вёскі Сарычаў, Лучнікі, Таль)[3]. Як паказалі палявыя матэрыялы, аналагічныя сенцы былі характэрныя для Бярэзінскага раёна.

У якасці летняга жылога памяшкання сенцы выкарыстоўваліся таксама ў паўднёвых раёнах Цэнт-

[1] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 122.

[2] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 62.

[3] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. С. 15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Інтэр'ер сенцаў з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Інтэр'ер сенцаў з в. Агароднікі, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

ральнай Беларусі (Слуцкі, Капыльскі, Нясвіжскі раёны) і часткова ў Падняпроўі[1].

У гэтым выпадку сенцы абстаўляліся як жылое памяшканне («трысцен»), якое мела печ і столь. Мяркуючы па выніках экспедыцыйных даследаванняў, найбольш багаты інтэр'ер сенцаў быў у Слуцка-Нясвіжскім лакальным раёне. Гэта было, хутчэй за ўсё, звязана з тым, што сенцы тут насілі пераходны характар жылога памяшкання. Яны мелі звычайнае акно, звернутае ў двор, і покуць, якая прымыкала да бакавой сцяны, што выходзіла ў двор. Тут віселі абразы, упрыгожаныя ручнікамі, стаяў кухонны стол. Каля процілеглай сцяны ставілі вялікі куфар на колцах, тыповы для гэтых мясцін, а побач – драўляны ложак.

[1] Титов В. С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов. С. 32.

Своеасаблівая структура інтэр'ера складвалася ў хатах з жылымі сенцамі ў Паазер'і[2]. У прыватнасці, печ і гаспадарчы кут разам з інвентаром выносіліся ў трысцен. Пры гэтым печ, як правіла, прымыкала да сцяны, якая падзяляла хату і сенцы. Аналіз літаратурных і палявых матэрыялаў сведчыць, што часам яна размяшчалася ў цэнтры сенцаў. У частцы трысцена, сумежнай з вусцем печы, знаходзіўся кухонны стол. На куце вісеў невялікі абраз, упрыгожаны ручніком. Злева ад печы знаходзіўся «палок» і «палаці» ці два-тры ложкі. Па этнаграфічных матэрыялах М. Анімеле, каля «ложкаў стаялі 2–3 кублы з адзеннем і 2–3 кашы з бруднай бялізнай»[3]. Па звестках інфарматараў, у Віцебскай губерні кублы і куфры часта стаялі на «палках». Злева ад печы размяшчаліся лавы і стол. Пры ўваходзе ў хату была лавачка, на якой стаялі вёдры з вадой. Тут жа размяшчаліся каменныя жорны і ступа. Рэгіянальнай асаблівасцю сенцаў Паазер'я з'яўляецца наяўнасць столі і драўлянай падлогі.

У адрозненне ад Паазер'я ў сенцах панёманскага жылля быў ўтрамбаваны земляны або глінабітны ток. Столь, як правіла, адсутнічала, што давала магчымасць больш рацыянальна выкарыстоўваць усё ўнутранае памяшканне. У паўночных раёнах рэгіёну (Астравецкі, Смаргонскі, Ашмянскі раёны) печ размяшчалася звычайна ў цэнтры сенцаў. Каля сцяны, якая падзяляла хату і сенцы, комін праходзіў пад зямлёй. За печкай знаходзіўся гаспадарчы кут, у якім стаялі чыгуны («саганы», «цэбры»), качэргі, чапяла, рагач, ляжалі дровы. Сенцы мелі акно, якое выходзіла на вуліцу. У адрозненне ад Паазер'я і Усходняга Палесся абразоў у сенцах не вешалі.

**Варыўня** ўяўляла з сябе зрубную ацяпляемую пабудову з земляной падлогай («істопка», «іздёбка», «стёбка», «стёпка»). Гістарычныя крыніцы захавалі нам і іншыя назвы гэтага будынка: «истба», «истьба», «истобъка». На большай частцы тэрыторыі Беларусі тэрмін «варыўня» азначае кладоўку для зімовага захоўвання гародніны, якая ацяпляецца падчас моцных маразоў. Па матэрыялах М. Я. Нікіфароўскага, у Віцебскай губерні «ісцёпка» адрознівалася ад жылой хаты тым, што не мела палацяў і поўнай печы, а толькі ніжнюю частку яе да «прыпічка» – каменную аснову[4].

[2] Анимеле Н. Быт белорусских крестьян. С. 128.
[3] Тамсама.
[4] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 255.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Гаспадарчае памяшканне з в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Варыўня з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народный архітэктуры і побыту

РЕПОЗИТОРИЙ

Як вядома, у паўночных раёнах дамінуючай была традыцыйная планіроўка «хата + сенцы + варыўня». Такая самая структура жылога комплексу сустракалася ва Усходнім Палессі і ва ўсходніх раёнах Панямоння. Пры такой планіроўцы варыўня размяшчалася, як правіла, у адным шэрагу з хатай і сенцамі. Яна ставілася са столлю і без столі. Часам у ёй праразалі адно-два акенцы, якія ўзімку звычайна зачынялі засаўкамі. Па звестках П. Сергіеўскага, у той жа сцяне прабівалі невялікую адтуліну – «дзюрку» ці «душнік» для вентыляцыі[1].

Супраць уваходу на зямлі выкладвалі камянямі ямку («бічайку») дыяметрам больш за паўметра. У зімовы час у яе прыносілі з хаты ў вядры або чыгуне гарачае вуголле, каб падтрымаць патрэбную тэмпературу. Мяркуючы па літаратурных крыніцах, часам замест ямкі ў варыўні рабілі курную печ з каменя[2]. Каб гародніна не замерзла, печ зрэдку тапілі.

Каля сцяны насупраць дзвярэй часта рабілі загарадкі («засекі») для захоўвання гародніны. У варыўні таксама знаходзіліся дзежкі для квашання капусты і салення агуркоў, кошыкі, сявенькі, грабяні для часання лёну. Тут жа на паліцах захоўваўся печаны хлеб, халодныя стравы. Часам у варыўні стаялі жорны і ступа.

У паўднёвых раёнах Панямоння і Заходнім Палессі сустракаўся крыху іншы тып планіроўкі: варыўня невялікіх памераў размяшчалася ў сенцах[3]

[1] Сергиевский П. Сведения о белорусских крестьянских постройках, собранные летом 1903 г. в деревнях Молодеченской волости Вилейского уезда Виленской губернии. Вильна, 1907. С. 7.

[2] Каспяровіч М. Пра быт на Чэрвеншчыне // Наш край. 1930. № 4. С. 56.

[3] Титов В. С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов. С. 34.




Бочкі, дзежкі і прадметы побыту. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

і прымыкала да хаты. Яе інтэр'ер набываў некаторыя спецыфічныя рысы. У варыўні з аднаго боку знаходзіліся палаці, якія прызначаліся для маладых і служылі для начлегу ў летні перыяд. Узімку на іх ставілі разнастайнае гаспадарчае начынне: кошыкі («кышы»), начоўкі для таўчэння куцці, часальныя грабяні і г. д. На сцяне над палацямі віселі сумкі («вярэнькі»). У шчыліны паміж бярвеннямі ўстаўлялі лёзы кос і сярпоў. У сцяне было прарэзана маленькае акенца, над якім знаходзілася паліца, на якой ляжалі сталярныя і цяслярскія інструменты. У куце насупраць паліцы стаяла вялікая бочка для квашання капусты.

У правабярэжнай частцы Прыпяці і басейне Бярэзіны варыўня часцей будавалася асобна ад жылля. Звязуючым звяном паміж поўначчу і поўднем быў басейн Бярэзіны, дзе гэта пабудова была тыповай для дваровага комплексу. На астатняй тэрыторыі яна адсутнічала або сустракалася рэдка (Панямонне). Функцыянальна яе замяняў склеп («пограб», «склеп», «байрак»).

Такім чынам, канструкцыйна-планіровачныя асаблівасці падсобных памяшканняў (колькасць дзвярэй у сенцах, іх размяшчэнне, наяўнасць вокнаў, падлогі або столі) залежалі ад рэгіянальнай прыналежнасці. Інтэр'ер падсобных памяшканняў вызначаўся як мясцовымі традыцыямі, так і родам дзейнасці гаспадара.

## Залежнасць інтэр'ера ад планіроўкі жылля

Расстаноўка прадметаў і арганізацыя інтэр'ера шмат у чым залежалі ад планіроўкі жылля, размяшчэння падсобных памяшканняў.

Пасля рэформы 1861 года ў сувязі з бурным працэсам маёмаснага расслаення сялянства ў тыпах планіроўкі з'яўляецца вялікая разнастайнасць. Мяркуючы па літаратурных крыніцах канца XIX – пачатку XX ст., у бяднейшага сялянства працягвала пераважаць двухкамернае жыллё, інтэр'ер якога пачаў змяняцца ў сувязі з пераходам да топкі «пабеламу» (паступова знікае пячны слуп і звязаныя з ім каляпечныя канструкцыі). У сярэдніх слаёў сялянства больш ярка праяўляецца тэндэнцыя да паляпшэння жыллёвых умоў шляхам увядзення перагародак, прырубаў і дадатковых зрубаў, пра што сведчаць архіўныя звесткі. У заможных сялян з'яўляюцца шматкамерныя і шматпакаёвыя дамы. У матэрыялах рукапіснага фонду Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта неаднаразова даецца апісанне такога жылля заможных сялян: «одно деревянное здание с двумя хатами чистыми в середине сени. Окна в длину вершков 12, а в ширину 9 вершков»[1].

[1] Рукапісны аддзел бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 34. Адз. зах. 193. Арк. 4 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Спальнае месца з в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

Інтэр'ер жылля дзвюх апошніх груп сялянства таксама зазнаў змены: нерухомыя канструкцыі замяняліся рухомай мэбляй, уводзіліся новыя аддзелачныя і дэкаратыўныя матэрыялы (пабелка, тынкоўка, шпалеры)[1]. У дамах заможных сялян можна было сустрэць мэблю, зробленую па гарадскіх узорах.

Такім чынам, жыллё кантрасна адрознівалася па сацыяльнай прыкмеце: заможныя сяляне жылі ў шматкамерных, часам у двухкамерных дамах, а беднякі – у нізкім, часцей за ўсё двухкамерным жыллі.

Для інтэр'ера беларускага сялянскага жылля другой паловы XIX ст. былі характэрны агульныя рысы ў планіроўцы, што было абумоўлена традыцыйным дзяленнем жылога памяшкання на функцыянальныя зоны. Кожны куток жылога памяшкання ў залежнасці ад яго функцыянальнага прызначэння запаўняўся адпаведным абсталяваннем і прадметамі гаспадарча-пабытовага прызначэння.

Найбольш распаўсюджанай на тэрыторыі Беларусі была планіроўка «хата + сенцы» і «хата + сенцы + варыўня» (або камора)[2]. Пра шырокае бытаванне такіх планіровак на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. гаворыцца ў працах П. В. Шэйна[3], Е. Р. Раманава[4] і шэрага іншых этнографаў.

Такая схема ўнутранай планіроўкі была ўласцівая і для ўсяго ўсходнеславянскага жылля, рэалізоўвалася ў некалькіх лакальных тыпах. Для беларускага сялянства было характэрна двухкамернае жыллё тыпу «хата + сенцы» і з пераходам да топкі «па-беламу». Як правіла, у такіх хатах захоўваліся канструкцыйна звязаныя з жыллём элементы інтэр'ера (лавы, падлога, палаці, паліцы). Часам у жылым памяшканні аддзяляўся толькі кухонны кут з печчу, кухонным сталом, паліцай, услонам для вады, а таксама гаспадарчымі прыладамі і кухонным посудам. Такім чынам чыстае памяшканне адзялялася ад бруднага.

Развіццё трохкамернага жылля тыпу «хата + сенцы + варыўня» таксама ішло шляхам сегментацыі. У канцы XIX ст. у беларускай вёсцы ўзмацняецца тэндэнцыя да размежавання памяшкання па функцыянальнай прыкмеце на 2–3 пакоі. Але размяшчэнне прадметаў інтэр'ера (печы, памоста, стала і інш.) і кухні застаецца традыцыйным.

[1] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 11.

[2] Беларускае народнае жыллё. С. 75.

[3] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 506.

[4] Романов Е. Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии. Вып. 1. С. 21.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спачатку ў хаце вылучаецца спальнае месца, а потым і кухня. Такая мадыфікацыя стала значным дасягненнем у развіцці народнага жылля.

Спальню ў хаце рабілі заўсёды там, дзе знаходзіліся палаці. Першым крокам у гэтым выдзяленні было простае завешванне спальнага месца, а пасля аддзяленне яго перагародкай («пераборкай»)[1]. У гэтым выпадку жыллё ад краю печы да франтоннай сцяны адзялялася перагародкай, якая не даходзіла да столі. Гэта не змяняла істотна інтэр'ер жылля. Іншы прыклад знаходзім у А. Харузіна. Гэта хата шляхціца, у якой спальня адгароджана ад астатняй часткі хаты шчыльнай перагародкай, дзякуючы чаму спальня з'яўляецца больш дыферэнцыяванай, чым у папярэднім прыкладзе. Пазней спальню ад астатняй часткі хаты сталі аддзяляць печкай-сцяноўкой. Прычым калі жылы дом меў сувязь з двух хат, як пісаў А. Харузін, то абедзве яны маглі мець выдзеленыя спальні, пры гэтым адна з іх магла аддзяляцца драўлянай сцяной, а іншая – печчу-сцяноўкой. Існаваў і іншы варыянт, калі спальня часткова аддзялялася печчу і часткова перагародкай[2].

Падобнае вылучэнне спальні ўласціва не толькі Беларусі. Такога роду спальні сустракаліся як вельмі распаўсюджаная з'ява на ўсёй тэрыторыі рассялення ўсходніх славян.

Дыферэнцыяцыя жылога памяшкання па функцыянальных прыкметах у другой палове XIX ст. ішла таксама шляхам выдзялення спальні ў сенцах. Такі спосаб вылучэння спальнага месца быў зафіксаваны падчас этнаграфічных экспедыцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў Кобрынскім і Пружанскіх раёнах. Спальню звычайна рабілі ў сенцах каля сцяны, якая прымыкала да печы. У гэтай частцы сенцаў адгароджвалі каморку, якая называлася хаткай і прызначалася для сну. Тут жа стаялі ложак, стол, шафа і лавы[3]. Аб аналагічным выдзяленні месца для сну ў Гродзенскай губерні гаворыцца ў даследаванні А. Харузіна[4].

Ускладненне планіроўкі хата + сенцы + камора ішло некалькімі шляхамі. Адзін з іх заключаўся ў тым, што сенцы перагароджвалі на дзве часткі па шырыні. Меншая з іх выконвала функцыю сенцаў, а большая абсталёўвалася пад спальню. У спальню выходзіла і адна сцяна печы. Выдзяленне спальні ў сенцах сустракалася таксама ў рускім традыцыйным жыллі[5], шырока вядома ў літоўцаў, латышоў, у іх жылых комплексах-рыгах.

Наступным крокам у развіцці народнага жылля было вылучэнне кухні. Гэты працэс, мяркуючы па даных беларускіх этнографаў, пачаўся ў Беларусі параўнальна позна – у канцы XIX – пачатку XX ст.[6], у той час як на поўначы Расіі аддзяленне кухні ад хаты было шырока распаўсюджана ўжо ў пачатку XIX ст.[7]

Ва ўнутранай планіроўцы прасторы беларускага жылля перш за ўсё імкнуліся аддзяліць печ ад чыстага памяшкання хаты. Для гэтага ставілі драўляную перагародку[8], якая праходзіла ад кута печы да процілеглай бакавой сцяны, адгароджваючы прастору чырвонага кута ад кухоннай. Прычым прастору перад вусцем печы адгароджвалі звычайна так, каб на кухні засталося для асвятлення адно бакавое акно. Атрымлівалася кухня, якая ў беларусаў звалася па-рознаму – «бабін кут», «куць»). Пры такім аддзяленні печы яна па-ранейшаму заставалася адзінай крыніцай ацяплення хаты.

Перагародка звычайна не даходзіла да столі, а замацоўвалася наверсе ў перакладзіне, якая ішла ад печы да процілеглай бакавой сцяны, часам замест яе кухню ад хаты аддзяляла шырокая занавеска.

Пазней печ пачалі выносіць з хаты ў сенцы («трысцен»), у якіх сталі рабіць асобную кухню. У той жа час частка трысцена па-ранейшаму выкарыстоўвалася як сенцы. У такіх выпадках хата абагравалася грубкай.

Архіўныя матэрыялы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі сведчаць аб тым, што ў в. Гарадная Столінскага раёна існаваў і іншы спосаб вылучэння кухні. Але ён быў магчымы ў тым выпадку, калі печ ставілася вусцем у сенцы, а сама знаходзілася ў хаце[9]. Пазней гэтую частку сенцаў сталі адгароджваць і яна ператварылася ў кухню. Аналагічнае

[1] Беларускае народнае жыллё. С. 75.

[2] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 280.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Кобрынскі раён у 1979 г., Пружанскі раён Брэсцкай вобласці ў 1980 г.

[4] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 263.

[5] Бломквист Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов. С. 439.

[6] Беларускае народнае жыллё. С. 79.

[7] Бломквист Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов. С. 145.

[8] Сергиевский П. Сведения о белорусских крестьянских постройках. С. 12; Скалон Н. Е. Описание крестьянского жилого дома в д. Загорье Волковыского уезда Гродненской губернии. С. 115.

[9] Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі (далей АІМЭФ). Ф. 6. Воп. 3. Спр. 74. Арк. 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вылучэнне кухні можна было сустрэць і ў іншых арэалах Заходняга Палесся, як адзначаецца ў даследаванні А. Харузіна[1].

Аналіз дакументаў паказвае, што вылучэнне ў сенцах кухні было вядома яшчэ ў XVI ст.: «...светлица малеваная с коморою, в боку сени с кухонкою» (1586 г.)[2]. Больш грунтоўную інфармацыю атрымліваем з інвентара г. Смаргонь ў Смаргонскай воласці, дзе адзначана: «...В сенях кухонька, отгороженная с одной стороны досками... В этой кухне кирпичная печь на фундаменте, возведенном на двух балках, опирающихся на кирпичное основание»[3].

Такім чынам, нягледзячы на тое, што вышэйзгаданы факт адносіцца да жылля прывілеяванага класа, ён важны з пункту гледжання развіцця планіроўкі жылля ў больш позні час – у XIX ст. Гэта з'ява паўтараецца ў развіцці сялянскай хаты (вылучэнне ў сенцах кухні).

Наступным крокам у развіцці гэтай планіроўкі стаў вынас печы цалкам на кухню і ацяпленне хаты грубкай. У сувязі з вылучэннем кухні ўнутраная планіроўка змянялася, адпаведна з гэтым адбываліся змены і ў інтэр'еры. Прычым інтэр'ер кухні звычайна захоўваў рысы традыцыйнай хаты.

З вынасам печы ў кухню і з'яўленнем спальнага месца інтэр'ер пярэдняга пакоя мяняўся. Ён ператварыўся ў пярэдні пакой – святліцу. Стол трохі адсоўваецца да цэнтра, а месца лавак займаюць канапа і дэкараваны куфар. Тут жа стаялі шафа, ложкі, крэслы, лаўка.

Развіццё капіталізму ў вялікай ступені аказала ўплыў на паскарэнне дыферэнцыяцыі сялянства, што, у сваю чаргу, адбілася на якасці будаўнічага матэрыялу і на планіроўцы жылля.

Заможныя сяляне і сераднякі мелі, як правіла, жыллё тыпу «хата + сенцы + хата» або «хата + хата + сенцы», што абумоўлівала і пэўныя змены ў традыцыйным інтэр'еры.

У трохкамерным жыллі тыпу «хата + хата + сенцы» інтэр'ер меў свае асаблівасці. Тут печ і гаспадарчы кут (разам з інвентаром) аддзяляўся ад чыстай хаты (святліцы), у якой былі покуць і прастора, дзе размяшчаліся стол, ложкі, шафа, лаўка і інш. Звычайна чыстая хата ацяплялася сцяной ад печы ці грубкі, якая знаходзілася ў суседнім памяшканні.



Грубка ў інтэр'еры жылля

Тып жылля «хата + хата + сенцы» быў найбольш характэрны для Падняпроўя і цэнтральных раёнаў Беларусі[4], дзе шырока бытавала хата з трысценам («прыдзел», «прыруб»).

У трохкамерным жыллі тыпу «хата + сенцы + хата» інтэр'ер набываў свае характэрныя рысы. Арганізацыя інтэр'ера ў жыллі такога тыпу не толькі ішла па шляху функцыянальнага размежавання жылых памяшканняў, алё і з'яўлялася часта вынікам сямейных падзелаў, калі ў адной хаце жылі дзве сям'і. У такіх выпадках сенцы звычайны перагароджвалі сцяной на дзве часткі з асобнымі ўваходамі[5]. Інтэр'ер адной хаты быў ідэнтычным інтэр'еру другой. Так, інтэр'ер падзеленага братамі дома заможнага селяніна быў зафіксаваны ў Чавускім раёне: «У кожнай хаце знаходзілася печ.

[1] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 266.
[2] АВАК. Т. XIV. С. 343.
[3] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8263. Арк. 2.

[4] Титов В. С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов. С. 27.
[5] Скалон Н. Е. Описание крестьянского жилого дома в д. Загорье Волковысского уезда Гродненской губернии. С. 111.



Інтэр'ер хаты з в. Варашылкі, Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Пачатак ХХ ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жылых пакояў у іх было па два, у сярэдзіне якіх знаходзіліся верхнія і ніжнія палаці, на якіх спала сям'я падчас адпачынку. Падлога драўляная, вокны ў хатах вялікія...»[1].

Тое, што другое памяшканне насіла назву «хата», цалкам лагічна, паколькі гэтыя хаты ў большасці выпадкаў нічым не адрозніваліся адна ад адной, з той толькі розніцай, што ў адной з іх прадметы інтэр'ера былі размешчаны ў адваротным парадку. Другое жылое памяшканне называлі таксама «хатка праз сенцы», «чыстая хата», у Гродзенскай губерні – «комната», у Віцебскай – «ісцепка». Па словах М. Я. Нікіфароўскага, «ісцепка» ўяўляла сабой запасную хату, якую ўжо не выкарыстоўвалі з прычыны яе непрыдатнасці[2]. У тым выпадку, калі другая хата служыла ў якасці каморы, яна не абагравалася. З цягам часу ў залежнасці ад росту сям'і, а таксама пры павелічэнні дабрабыту гаспадаркі камора страчвала сваю функцыю і ператваралася ў дадатковае жылое памяшканне. У заможнай сям'і гэта магло быць сталае жылое або летняе памяшканне («летняя», «святліца»).

У сярэдзіне XIX ст. у сувязі з вылучэннем заможнай праслойкі ў вёсцы тып жылля «хата + сенцы + хата» пачаў выкарыстоўвацца для паляпшэння камфортнасці побыту. У такіх выпадках вокны хаты значна адрозніваліся ад іншых. Чыстая хата прызначалася для гасцей, яе ацяплялі (грубкай, сцяноўкой, шчытком). Пра гэта сведчаць як літаратурныя, так і архіўныя матэрыялы: «жилой дом на две половины со светлицей, в которой чистая и хорошая мебель, деревянный пол, голландские печи, окна большие двойные растворчатые с форточками...»[3].

Свяцёлка была святлейшай і чысцейшай за жылую хату. Яна мела высокую столь і добрую дашчаную падлогу. У чыстай хаце пры захаванні асноўных рыс старажытнага традыцыйнага абсталявання з'яўляюцца і новыя прадметы побыту: драўляныя ложкі, канапы, шафы саматужнай работы, зэдлікі, радзей крэслы. Ложкі ў чыстай хаце старанна ўпрыгожваліся. На іх клалі пярыны, мноства падушак у вышываных ці ўпрыгожаных тканым арнаментам навалачках. У гэты перыяд назіралася ўжыванне двух тыпаў навалачак – прастакутных і квадратных, абумоўленых формай падушак. Вышыўку ўжывалі для дэкарыравання навалачак квадратнай формы, якія з'явіліся ў сувязі са зменай інтэр'ера – заменай палка драўляным ложкам[4]. Такія багата ўпрыгожа-

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.

[2] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 255.

[3] Рукапісны аддзел бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 34. Адз. зах. 541. Арк. 4 адв.

[4] Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество. С. 83.

ныя ложкі служылі своеасаблівай выставай майстэрства жанчын дома, дэманстрацыяй заможнасці сям'і і выконвалі функцыю ўпрыгажэння, у той час як сям'я працягвала спаць на памосце.

У даследуемы перыяд у такім тыпе жылля адна хата магла заставацца курной, а другая мець печ з комінам. Так, у архіўных матэрыялах адзначаецца: «дом разделен сенями на две половины, из которых одна чистая... другая курная с земляным полом, окнами маленькими, состоящая из одного покоя»[1]. Звычайна ў чорнай хаце не жылі, а выкарыстоўвалі яе як кладоўку. У ёй захоўвалі вопратку, ставілі бочкі з капустай, агуркамі, буракамі і г. д. «...В чистой хате пол был деревянный... Пол в черной хате был земляной, окна маленькие и состояла она из одного помещения»[2]. У чыстай хаце вокны былі значна большыя, і складалася яна нярэдка з некалькіх пакояў.

Такім чынам, тып планіроўкі «хата + сенцы + хата» даваў магчымасць утрымліваць адно жылое памяшканне больш чыстым, у той час як прыгатаванне ежы можна было перанесці ў іншае памяшканне. Акрамя таго, чыстую хату можна было выкарыстоўваць і як жыллё для жанатага сына ці для старых: «строений у него две жилые избы. Одна на два конца, в которой помещается все семейство, а другая на двор называется светелка, в которой живут отец старик со старшим сыном, где принимаются гости»[3].

У канцы XIX – пачатку XX ст. жылы дом, які складаўся з дзвюх жылых частак, размешчаных па абодва бакі сенцаў, быў характэрны для рускіх, украінцаў, заходніх і часткова паўднёвых славян[4].

Такім чынам, інтэр'ер жылля быў цесна звязаны з матэрыяльным і сацыяльным становішчам селяніна: калі заможныя жылі звычайна ў шматкамерных дамах, то беднякі жылі ў нізкім двухкамерным жыллі. З ускладненнем планіроўкі і вылучэннем кухні, спальні, святліцы, дыферэнцыруецца і абсталяванне жылля. Кухонны кут з печчу, кухонным сталом, а таксама гаспадарчымі прыладамі застаецца ў першай камеры або за перагародкай, у той час як месца для сну і покуць пераходзяць у другую «чыстую», пярэднюю хату. Традыцыйнае месца для сну – «пол» – некаторы час заставаўся за печчу. У гэты ж час адбываецца дзяленне сям'і па ўзросце. Дзеці і старыя, як і раней, спяць на кухні на нарах («палу», «палацях»). У далейшым, калі чыстая хата пачала дзяліцца на дзве, спальню і свяцёлку, абсталяванне жылля пачало дапаўняцца новымі прадметамі: драўлянымі ложкамі, канапамі, шафамі і г. д.

## Развіццё інтэр'ера ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

У другой палове XIX ст. унутранае ўбранне і абсталяванне беларускага традыцыйнага жылля пад уплывам сацыяльна-эканамічных змен зведалі значную эвалюцыю. Курныя печы амаль паўсюдна замяняліся «чыстымі», ці «белымі», печамі, якія мелі комін. Працэс замены курных печаў на печы з комінам адбываўся нераўнамерна: найбольшую актыўнасць ён атрымаў у гаспадарках дзяржаўных сялян. Паводле даследаванняў, апублікаваных у працы «Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба Гродненской губернии», у сярэдзіне XIX ст. на 47 тыс. прыгонных сялян «белыя» печы былі ў хатах толькі 13%, а з 34 тыс. дзяржаўных сялян – больш за палову[5].

Мяркуючы па архіўных матэрыялах Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у шэрагу вёсак Барысаўскага павета Мінскай губерні ужо ў 1872–1873 гг. «хаты у всех крестьян бывших государственных были с дымопроводными трубами»[6]. У той час як масавае знікненне курных печаў на тэрыторыі Беларусі адбываецца ў канцы XIX ст., а ў пачатку XX ст. вялікая частка печаў была ўжо з комінам.

Печ з комінам не адразу стала такой, якой мы цяпер яе ведаем. Пераходным тыпам ад курной печы да белай была «напаўбелая» печ. Аб бытаванні такіх печаў сведчаць этнаграфічныя матэрыялы М. Я. Нікіфароўскага: «у Віцебскай губерні курныя хаты нярэдка мелі трубы, якія выраблялі з 3–4 дошак. Яны выводзіліся на дах і пасля выхаду дыму зачыняліся комам анучак, пакулля ці старога адзення, што называлася «заткнуць бакоўку»[7]. «Напаўбелыя» печы былі вядомыя і на Панямонні, што пацвярджа-

[1] Рукапісны аддзел бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 34. Адз. зах. 553. Арк. 6.

[2] Тамсама. Адз. зах. 548. Арк. 1 адв.

[3] Тамсама. Адз. зах. 574. Арк. 7 адв.

[4] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 278; Маланчук В. А. Інтер'єр українського народного житла. Київ, 1973. С. 7.

[5] Бобровский П. Материалы для географии и статистики... Гродненская губерния. Ч. I. С. 212.

[6] Рукапісны адзел бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 34. Адз. зах. 194. Арк. 4.

[7] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 247.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ецца экспедыцыйнымі даследаваннямі. Так, па даных І. Г. Капацэвіча (1909 г. н., жыхара в. Воўкавічы Навагрудскага раёна), «у драўляны комін адзін на другі ставілі наўмысна зробленыя гладышы без дна і з боку страхі залівалі шчыліны паміж дошкамі і гладышамі «жвырам» (гліна, змяшаная з пяском). Калі дым выходзіў з хаты, комін забівалі анучкамі»[1].

У даследаванні Е. Р. Раманава адзначаецца, што ў Магілёўскай губерні «коміны выходзілі не на дах, а праз сцяну хаты ў сенцах: падчас топкі печы дым праходзіў праз дах сенцаў і суседняй клеці»[2]. Аналагічныя «напаўбелыя» печы былі зафіксаваныя этнографамі ў Заходнім Палессі[3]. Як паказалі палявыя і архіўныя матэрыялы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, на Палессі і Віцебшчыне комін часта плялі з дубцоў, якія потым абмазвалі глінай. Звонападобная выцяжная частка коміна падвешвалася да столі над прыпечкам, сама яна ішла пад столлю да сцяны, якая падзяляла хату і сенцы, у якой была адтуліна для выхаду дыму з хаты. Пасля топкі адтуліна («душнік») з боку сенцаў закрывалася ўстаўным чурбаном[4]. У паўднёвай частцы Брэсцкай вобласці для вываду дыму з сенцаў рабілі іншы комін, збіты з чатырох дошак. Па звестках Л. А. Малчанавай, такія коміны яшчэ ў сярэдзіне XX ст. выкарыстоўваліся ў Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці для вэнджання свіных кумпякоў[5].

У літаратурных крыніцах XIX ст. неаднаразова адзначалася, што «ад дрэннага вываду труб, ад рэдкага вычышчэння ў іх сажы адбываюцца пажары»[6]. Па даных царскай статыстыкі, «вясковая Русь» выгарала дашчэнту кожныя 20 гадоў[7]. У адной толькі Гродзенскай губерні на працягу 1882–1883 гг. пажары прынеслі страт больш чым на 3 млн рублёў[8].

У цыркуляры міністра ўнутраных спраў ад 2 красавіка 1842 г. гаворыцца, што яшчэ ў 1830 г. была прынята пастанова аб тым, каб «чорныя хаты выводзіць з ужытку па меры магчымасці і замест гэтага імкнуцца печы ў хатах рабіць з цаглянымі комінамі, узводзячы іх вышэй за страху на адзін аршын»[9].

Аднак многія сяляне працягвалі будаваць курныя печы аж да канца XIX ст. Мяркуючы па звестках інфарматараў і літаратурных даных, тлумачылася гэта наступнымі прычынамі: 1) пераемнасцю традыцый мінулых пакаленняў: «як дзяды і бацькі будавалі, так і мы будзем»; 2) тым, што печ без коміна давала больш цяпла, добра праветрывалася ў хаце падчас топкі, у ёй амаль ніколі не заводзілася вільгаць; пракопчанае дрэва і салома дэзынфіцыраваліся і не псаваліся; 3) чорныя печы былі больш таннымі, трывалымі і патрабавалі менш паліва.

Распаўсюджванне коміна ў Беларусі ішло з усходу на захад. Аналіз архіўных матэрыялаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі сведчыць, што ў шмат якіх вёсках усходніх абласцей краіны старажылы ўжо ў 1910-х гг. не памяталі курных печаў. У той жа час у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях асобныя курныя хаты ў выглядзе складскіх памяшканняў захаваліся да 1980-х гг. З'яўленне ў другой палове XIX ст. цаглянага коміна адбілася на вонкавым выглядзе печы. Застаючыся глінабітнай, яна стала выглядаць больш акуратна, што звязана і са з'яўленнем звычаю яе бяліць. Прыстасаванне для вываду дыму не толькі стварала значную цягу, але і засцерагала ад пажараў. Увядзенне топкі «па-беламу» змяніла ўнутранае аблічча жылля. А. С. Дэмбавецкі так пісаў пра гэта: «Ранейшыя нізкія і цёмныя курніцы з заткнутымі анучамі дзіркамі замест вокнаў, якімі адрозніваліся цэлыя беларускія вёскі, сустракаюцца цяпер рэдка, як жыллё бабыля-жабрака... З'явіліся прасторныя і светлыя хаты большай часткай «белыя», а менавіта з печамі, якія маюць коміны»[10].

Аднак сама печ яшчэ мала чым адрознівалася ад курной. Яе па-ранейшаму збівалі з гліны з дабаўленнем камянёў. Як паказалі, экспедыцыйныя даследаванні, у Гомельскай вобласці яшчэ ў канцы 1970-х гг. у сялянскіх хатах можна было зрэдку сустрэць старадаўнія глінабітныя печы, звод якіх быў выкладзены невялікімі камянямі.

Раней, чым у іншых рэгіёнах, глінабітныя печы былі заменены на цагляныя на Гродзеншчыне. Але гэта ўасноўным было характэрна для сярэдніх

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці ў 1987 г.

[2] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 12.

[3] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. С. 119.

[4] АІМЭФ. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 22. Арк. 5.

[5] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. С. 118.

[6] Витебские губернские ведомости. 1850. Часть неофиц. № 38. С. 2.

[7] Виленский вестник. 1877. 17 авг.

[8] Сборник сведений по России за 1883 год. С. 186.

[9] НГАБ. Ф. 2784. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 2.

[10] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 3. С. 821.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

і заможных сялян. Прычым найбольшае распаўсюджанне атрымалі печы, у якіх под і звод выкладвалі з абпаленай цэглы, а саму печ – з сырцовай цэглы.

Побач з рускай печкай у другой палове XIX ст. у сялянскім жыллі з'явіліся спецыяльныя абагравальныя печы розных відаў («груба», «шчыт», «сцяна», «сцяноўка» і г. д.). Раней за іншыя рэгіёны грубкі з'явіліся на Гродзеншчыне, што было звязана з умовамі этнічнага і сацыяльнага развіцця заходніх рэгіёнаў. Так, у вёсках Морына Іўеўскага раёна, Крупава Лідскага раёна, Лядск Шчучынскага раёна, Абуховічы Гродзенскага раёна на пытанне пра час з'яўлення грубак і «сценак» старажылы, якім у канцы 1970-х гг. было па 80–90 гадоў, паведамілі наступнае: «за памяццю заўседы былі». Як правіла, «грубу» і печ у аднакамерным жыллі ставілі побач, аб'ядноўваючы агульным комінам. Пазней грубкі сталі будаваць і асобна ад печы. Грубка ўяўляла сабой высокую чатырохкутную печ тыпу галандкі, вышынёй амаль да столі.

А. М. Харузін пісаў, што «грубкі» або «грубы» сустракаліся ў Віцебскай і Мінскай губернях[1]. Аналіз літаратурных і экспедыцыйных матэрыялаў паказаў, што ў Віцебскім рэгіёне грубкі існавалі толькі ў паўднёвых раёнах (Докшыцкі, Лепельскі, Бешанковіцкі, Чашніцкі, паўночная частка Лагойскага, Барысаўскага і Вілейскага раёнаў) і заходніх (Мядзельскі, Пастаўскі, Браслаўскі раёны). На астатняй тэрыторыі Паазер'я былі распаўсюджаны «шчыткі». У паўночных раёнах рэгіёну (Полацкі, Верхнядзвінскі, Міёрскі) былі вядомыя «шчыткі з ляжанкамі»[2]. Шчыт меў форму масіўнай доўгай скрыні вышынёй амаль да столі. Ляжанка была падобная да шчыта, толькі з пляцоўкай для ляжанкі. Мяркуючы па палявых даных, яны былі шырока распаўсюджаны ў Магілёўскім Падняпроўі. Гэта пацвярджаецца таксама архіўнымі матэрыяламі[3].

Па звестках А. Харузіна, «у Гродзенскай губерні часцей сустракалася сцяна ці «сцяноўка»[4]. Сцяноўка сваю назву атрымала па месцы размяшчэння, бо яна ставілася звычайна пасярод хаты і дзякуючы падоўжанай форме стварала сцяну, якая падзяляла хату на дзве паловы. Яна звычайна аддзяляла тую частку хаты, у якой знаходзіўся спальны памост – «пол». Гэтай печчу карысталіся пераважна ўзімку, пры гэтым рускую печ тапілі зранку, а «сцяноўку» – ўвечары.

Па этнаграфічных матэрыялах Е. Р. Раманава з Гродзенскага павета бачна, што ў вёсках, якія былі размешчаны побач з цэнтрам ганчарства, можна было сустрэць печы і грубкі, абліцаваныя кафляй[5], часам нават каляровай з рэльефнымі ўзорамі. Але такія кафляныя печы звычайна былі ў дамах замож-



Печ з плітой з в. Варашылкі, Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Покуць з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

[1] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 177.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Полацкі і Верхнядзвінскі, Міёрскі раён Віцебскай вобласці ў 1985 г.

[3] АІМЭФ. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 529. Арк. 8; Спр. 527. Арк. 9.

[4] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. С. 177.

[5] Романов Е. Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии. С. 22.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Ручнік. 1900-я гг. Палатно, бавоўна, вышыўка крыжыкам, карункі. Магілёўская вобласць



Ручнік з в. Стары Доўск, Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці. 1920–30-я гг. Лён, бавоўна, чатырохнітовае і закладное ткацтва, карункі

ных сялян. Як паказалі палявыя даследаванні, часам у пярэднюю частку печы ўмацоўвалі толькі адну кафляную плітку або нават люстэрка – «вока» печы (Шклоўскі, Клічаўскі раёны). Гэта сведчыць аб тым, што і пры рацыяналізме побыту ў селяніна заўсёды было жаданне ўпрыгожыць сваё жыллё.

У другой палове XIX ст. ў дамах заможных сялян з'яўляюцца пліты, убудаваныя ў перадпечча. Часам будавалі пліты, якія стаялі асобна ад печы, але мелі агульны з ёй комін. З'яўленне грубок і пліт было значным крокам у развіцці народнага жылля, але спачатку іх было вельмі мала. Колькасць грубок і пліт найбольш інтэнсіўна пачынае павялічвацца з канца XIX – пачатку XX ст. Аднак гэты працэс на тэрыторыі Беларусі адбываўся нераўнамерна. Мяркуючы па архіўных і палявых матэрыялах, у Панямонні пліты ўжо шырока бытавалі ў пачатку XX ст., у той час як у Падняпроўі, Усходнім і Заходнім Палессі яны атрымалі распаўсюджанне толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны[1].

Са знікненнем курных хат, а таксама ўскладненнем планіровачнай структуры сялянскага жылля (з'яўленнем трохкамернага жылля) пэўныя змены закранулі «чырвоны кут». Абразы сталі больш багата ўпрыгожваць затканымі і вышытымі ручнікамі з выкарыстаннем геаметрычнага і расліннага, а часам зааморфнага арнаменту. Для беларускіх ручнікоў гэтагу перыяду характэрна спалучэнне чырвонага і чорнага колераў. Разам з тым нярэдка ўжо сустракаліся і больш разнастайныя спалучэнні, якія ўключалі сіні, зялёны, жоўты і іншыя колеры. Такая паліхромная яркасць і сакавітасць расліннага арнаменту была характэрная для турава-мазырскіх ручнікоў, капыльска-клецкім была ўласціва двух-

[1] АІМЭФ. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 696, 697, 701, 704, 796, 799 і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, воўна, васьмінітовае і закладное ткацтва, карункі, пампоны. Ляхавіцкі раён Брэсцкай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры



Ручнік. 1920-я гг. Ільняныя і бавоўняныя ніткі, карункі. З в. Лукі, Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каляровая гама геаметрычнага і раслiннага арнаменту. Ручнікі Панямоння і Цэнтральнай Беларусі выраблялі звычайна строгімі спалучэннямі белага і шэрага льну, саржавай тэхнікай.

Як паказалі палявыя даследаванні, у Беларусі нароўні з паўсюдна распаўсюджанай назвай «ручнік» ўжываліся таксама: «набожнік» – ручнік для пакрыцця абразоў, «набразнік» – тэрмін выкарыстоўвалі жыхары Міёрскага раёна, «ручнікі-накручнікі для красы» (Брагінскі раён), «хустка» (Светлагорскі, Буда-Кашалёўскі раёны) – тэрмін, раўназначны ручніку.

У другой палове XIX ст., па звестках Е. Р. Раманава, «у дамах заможных сялян можна было сустрэць хромалітаграфаваныя абразы ў драўляных рамках з бардзюрам, пад шклом і нярэдка са штучнымі кветкамі»[1]. «На покуці, – пісаў П. В. Шэйн, – нярэдка сустракаліся і бліскучыя абразы, упрыгожаныя фольгай і пазалотай, да абраза ў ківоце ставілі свечку, перад абразамі падвешвалася лампадка»[2]. Іконы з лампадкай на покуці не толькі неслі культавую нагрузку, але і ўпрыгожвалі жыллё. Па звестках інфарматараў, у бедным жыллі былі адзін-два абразы, у заможным мноства абразоў ледзь змяшчалася на покуці. Часам у куце святліцы ўсталёўваўся самаробны іканастас. Аб бытаванні такіх іканастасаў сведчаць даныя этнаграфічных экспедыцый[3].

Інтэр'ер фарміраваўся адначасова з будаўніцтвам дома. Як вядома, асноўным будаўнічым матэрыялам было дрэва, якое сваім колерам і структурнай выразнасцю аб'ядноўвала ўсе элементы інтэр'ера ў адзінае цэлае. Але гэта магло адбыцца толькі

[1] Романов Е. Р. Белорусский сборник. С. 15.

[2] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 508.

[3] АІМЭФ. Ф. 6. Воп. 12. Спр. 49. Арк. 9; Воп. 13. Спр. 1. Арк. 3.



Покуць з в. Агароднікі, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

з пераходам да топкі «па-беламу», калі сцены з закураных дымам ператварыліся ў сцены з выразна выяўленай структурай. Як паказаў аналіз літаратурных і палявых матэрыялаў, у Віцебскай і Гомельскай абласцях, цэнтральнай частцы Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. хаты па-ранейшаму будавалі з круглых бярвенняў. У гэтых рэгіёнах, за выключэннем Паазер'я, сцены на стыках уздоўж пазоў замазвалі глінай. Драўляныя сцены хаты з буйнога лесу, з добра прыгнанымі пазамі і старанна зробленымі кутамі гарманіравалі са столлю на масіўным траме, шырокімі масніцамі, бярвенчатым апечкам і іншымі дэталямі ўнутранага ўбрання хаты. Прыкладам можа служыць хата І. Ф. Сыч канца XIX ст., выяўленая падчас экспедыцыі ў в. Бабічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. У Панямонні і заходніх раёнах Цэнтральнай Беларусі сцены жылля, як правіла, счэсвалі («апілоўвалі», «пілавалі», «склютавалі») знутры, часам адступіўшы ад кутоў на 15–20 см. Куты хаты набывалі своеасаблівую прыгажосць, асабліва калі ў будаўніцтве ўжывалі буйны лес. Ніжнія вянцы бярвення ад падлогі да лаў часта пакідалі несчасанымі. Сцены хат у Заходнім Палессі, паўднёвых раёнах Панямоння і Цэнтральнай Беларусі часта бялілі. Аналіз архіўных матэрыялаў сведчыць, што сцены ў дамах заможных сялян тынкавалі па ўсёй паверхні ўжо ў 60–70-я гг. XIX ст.[1] Мяркуючы па шматлікіх звестках інфарматараў, тынкоўка шырока ўвайшла ў побыт селяніна толькі «пасля мікалаеўскай вайны».

У сувязі з пераходам да топкі «па-беламу» змяняецца інтэр'ер жылля. У сялянскіх хатах канца XIX ст. часцей можна было сустрэць драўляную падлогу. Па звестках інфарматараў, часам яе масцілі на адной палове хаты, дзе знаходзілася покуць, а прастора ад печы да бакавой сцяны мела глінабітны ток. Жылыя памяшканні сталі больш прасторнымі і светлымі. Мяркуючы па этнаграфічных матэрыялах Е. Р. Раманава, М. А. Янчука прыкметна павялічыліся аконныя праёмы. Вокны ўжо мелі шырокае падваконне, вушакі, створкавыя падвойныя шыбы[2]: іх, як правіла, шклілі.

У другой палове XIX ст. канструкцыйна-планіровачнае развіццё народнага жылля прывяло да змены абсталявання. З пранікненнем капіталізму ў вёску і павялічэннем класавага расслаення сялянства пачалася ўсё большая дыферэнцыяцыя тыпаў жылля. Ускладнялася планіроўка жылля сераднякоў і заможных сялян, што прывяло да далейшага развіцця трохкамернага жылля, з'явіліся святліцы, узнік пяцісценак, вылучылася чыстая палова. Нераздзельнае жылое памяшканне замянілася летняй і зімняй хатай – усе гэтыя дадатковыя памяшканні патрабавалі новай мэбліроўкі.

І чым большы быў дастатак у сям'і, тым больш магчымасцей сялянін меў набыць гарадскую абстаноўку. Вялікую ролю ў вырашэнні інтэр'ера жылых памяшканняў мела мэбля, якая ў значнай ступені вызначала яго рэгіянальную своеасаблівасць.

Як правіла, у старых хатах з невялікімі акенцамі аж да канца XIX ст. захоўваліся канструктыўна звя-

[1] Рукапісны аддзел бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Ф. 34. Адз. зах. 599. Арк. 8 адв.

[2] Романов Е. Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии. С. 19; Янчук Н. А. Этнографический очерк Белоруссии. М., 1918–1920. С. 169.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Канапы ў інтэр'еры хаты. З в. Варашылкі, Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Канапа ў інтэр'еры хаты завознікаў. Чыстая палова. Гісторыка-культурны музей-запаведнік Заслаўе



Канапка з в. Старынка, Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры

заныя з жыллём элементы інтэр'ера – лавы, «пол», «палаці», пра што сведчаць шматлікія этнаграфічныя матэрыялы канца XIX – пачатку XX ст. Аднак разам з гэтым ў канцы XIX ст., па звестках П. В. Шэйна і іншых этнографаў, «у хаце з'явіліся ўжо і лаўкі, і нават драўляныя крэслы»[1]. Крэсла мела квадратнае або злёгку звужанае да спінкі сядзенне на чатырох высокіх прамых ножках, профіль спінкі нярэдка быў выгнуты. Характэрнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца крэслы з нежылой хаты ў в. Грыдні Нараўлянскага раёна (гаспадар Наско Афанасій Сцяпанавіч). Яны мелі правільныя прапорцыі, папярочныя дошчачкі спінак былі фігурна выпіленыя.

У інтэр'еры сялянскага жылля другой паловы XIX ст. з'яўляюцца драўляныя канапы. «У заможных сялян, – піша Е. Р. Раманаў, – яны бываюць пакрытыя алейнай фарбай і са спінкамі, каб тыя, хто сядзіць на іх, не дакраналіся да сцяны»[2]. У канструкцыйным плане яны адрозніваліся ад лаў наяўнасцю спінкі і падлакотнікаў. Канапы мелі параўнальна невялікую даўжыню, каля 2 м, і дэкаратыўную апрацоўку асобных дэталяў.

[1] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 6.

[2] Романов Е. Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии. С. 22.

РЭПАЗІТАРЫЙ БГПУ



Канапка з в. Кулажын, Брагінскі раён Гомельскай вобласці



Ложак у інтэр'еры жылля з в. Варашылкі, Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Пачатак XX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

На тэрыторыі Беларусі існавалі шматлікія варыянты канап, якія адрозніваліся паміж сабой канструкцыяй, прызначэннем і мастацкай апрацоўкай. Шматлікія ўзоры канап канца XIX – пачатку XX ст. з этнаграфічных калекцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, музея-запаведніка ў Заслаўі і Музея старажытнабеларускай культуры сведчаць аб тым, што канапы былі доўгія і кароткія, шырокія і вузкія, з разьбой і без яе, з выгнутымі ножкамі і г. д. Уся ўвага ў мастацкім афармленні канап была засяроджана на падлакотніках, ножках і асабліва верхняй частцы канапы. Спінкі самай разнастайнай формы ўпрыгожваліся разьбой, фігурнымі ці гладкімі выпіленымі рэечкамі. Пярэднія ножкі і падлакотнікі звычайна рабіліся злёгку выгнутымі.

Арыгінальныя канструкцыі лаў сустракаліся ў Заходнім Палессі (Столінскі, Драгічынскі, Пінскі раёны), Усходнім Палессі (Брагінскі, Нараўлянскі раёны). Спінкі ў такіх лаў не было, а працяг ножак, звязаных папярочнымі планкамі, ствараў апору. Лаву можна было ставіць да сцяны любым бокам, яе пярэдняя і задняя часткі былі абсалютна аднолькавымі. Як паказалі палявыя матэрыялы, у заходніх і паўднёва-заходніх раёнах Цэнтральнай Беларусі (в. Стары Свержань Стаўбцоўскага раёна, в. Securityанавічы Нясвіжскага раёна і інш.) шырока бытавалі «шлябаны» – канапы з сядзеннем у выглядзе скрыні на нізенькіх ножках з падлакотнікамі і спінкай, як у канапы[1]. У скрыню звычайна складвалі рэчы. Яна ўпрыгожвалася больш сціпла, таму што, як правіла, прызначалася для падсобных памяшканняў.

У канцы XIX – пачатку XX ст. з інтэр'ера сялянскага жылля паступова знікае «пол» для сну. Яго замяняюць ложкі, якія выраблялі з драўляных дошак. Дэкор драўляных ложкаў сведчыць аб вялікай разнастайнасці афармлення тарцовых сценак[2]. Тут можна знайсці фігурныя контуры (Панямонне), завяршэнне спінак разьбянымі грабянямі (Падняпроўе) або элементамі, вырабленымі на такарным станку (Паазер'е). Ва Усходнім Палессі сценкі ўпрыгожваліся рознымі накладнымі дэталямі, вытачанымі на такарным станку[3]. Мастацкая выразнасць асабліва ўзмацнялася пластыкай прафіляваных дошак, а часам і колерам. Найбольш цікавае дэкаратыўнае аздабленне тарцовых сценак ложкаў была знойдзена падчас этнаграфічных экспедыцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў 1980–1981 гг. у вёсках Скарада Верхнядзвінскага раёна, Аўдзеевічы Навагрудскага і Падбалоцце Зэльвенскага раёнаў.

З усіх відаў перасоўнай мэблі ва ўсходнеславянскім жыллі раней за іншыя з'явілася шафа («шахва»). Эвалюцыю развіцця беларускай шафы можна прасачыць, даследуючы працэс паступовай замены адкрытых паліц шафай з задняй сценкай і дзверцамі. Хуткае распаўсюджанне перасоўнай шафы обумоўлена даўняй звычкай да такога роду мэблі. Ужо ў інвентарах XVI–XVIII стст. неаднара-

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Стаўбцоўскі раён у 1981 г., Нясвіжскі раён Мінскай вобласці ў 1982 г.

[2] Сергачев С. А. Белорусское народное зодчество. Минск, 1992. С. 103.

[3] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. С. 20.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



Шафа і спальнае месца ў інтэр'еры жылля з в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Канец XIX – пачатак XX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

зова згадваюцца такія шафы: «шафа одна с подвоенными дверками, на завесе...» (1778 г.)[1].

Літаратурныя крыніцы канца XIX – пачатку XX ст. сведчаць аб шырокім распаўсюджанні іх у даследуемы перыяд. Цікавая шафа (вырабу 1878 г.) была знойдзена падчас экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў 1978 г. у Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Паверхня дзверак двухстворкавай шафы пакрыта блакітным грунтам, на якім выкананы роспіс. З левага боку на зялёным фоне намаляваны бусел, з правага – вершнік. Уся паверхня шафы пакрыта роспісам. На дзверках раслінны арнамент у выглядзе павоя. Значны ўплыў на развіццё рухомай мэблі аказаў горад, тым не менш асновай амаль усіх відаў мэблі з'явілася традыцыйнае абсталяванне сялянскага жылля.



Шафа для посуду з в. Надтачаеўка, Нараўлянскі раён Гомельскай вобласці. Музей старажытна-беларускай культуры

У першай палове XIX ст. для беларускага народнага жылля былі характэрныя сталы на козлах. У паслярэформенны перыяд яны зведалі некаторыя канструкцыйныя змены. Стол набывае даволі масіўнае падстолле. Супрацьлеглыя пары ножак у месцах сваіх перакрыжаванняў злучаюцца папярочнай перакладзінай, прапушчанай праз ножкі.

Яшчэ адна разнавіднасць стала другой паловы XIX ст. – стол на дзвюх Т-падобных ножках. Ён таксама меў масіўнае, сабранае на шыпах падстолле. Дошкі і перакладзіны фігурна выпілоўваліся па краях, утвараючы вытанчаную канструкцыю Т-падобных ножак.

[1] АВАК. Т. XXXV. С. 217.

У другой палове XIX ст. кубел стаў хутка выходзіць з ужытку і замяняцца куфрамі. Дэкарыраваны куфар быў адным з найбольш важных элементаў мэблі. Звычайна яго ставілі каля тарцовай сцяны недалёка ад покуці. Куфры розных рэгіёнаў Беларусі адрозніваліся паміж сабой формай і дэкаратыўнымі элементамі. На Гродзеншчыне і Віцебшчыне быў распаўсюджаны штампаваны арнамент з геаметрычнымі элементамі, якім упрыгожвалі паверхню куфра. Прыкладам можа служыць куфар, знойдзены

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Куфар у інтэр'еры жылля. З в. Забродздзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Стол з в. Міхайлаўка, Нараўлянскі раён Гомельскай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры

ў в. Куляўцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, які знаходзіцца ў фондах Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Не менш цікавы куфар з в. Вераб'і Мядзельскага раёна (дата вырабу 1878 г.), упрыгожаны стылізаваным раслінным арнаментам у спалучэнні з зааморфным.

Разнастайнасць дэкаратыўнага ўбрання куфраў у тым ці іншым арэале ў значнай ступені абумоўлівалася танальнасцю каляровага фону. Так, напрыклад, на Гродзеншчыне і Віцебшчыне пераважаў роспіс па сінім фоне, а ва Усходнім Палессі – па цёмна-чырвоным. На Магілёўшчыне ўзоры наносілі чорнай фарбай па зялёным або карычневым фоне[1]. На думку М. С. Кацара, асабліва прыгожыя скрыні выраблялі ў Сенненскім павеце Магілёўскай губерні[2]. У дэкаратыўным афармленні куфраў найбольшую ўвагу на-

[1] Сергачоў С. А. Інтэр'ер жылля // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1984. С. 25. № 4. С. 23–25.

[2] Кацер М. С. Народно-прикладное искусство Белоруссии (от первобытного общества до 1917 г.). Минск, 1972. С. 117.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

давалі вечку і павернутай да ўваходу пярэдняй часткі. Бакавіцы ўпрыгожваліся больш сціпла.

Палескія куфры адрозніваюцца больш складанай кампазіцыяй арнаменту і большай дэкаратыўнасцю роспісу. Тут у арнаменце куфраў пераважалі раслінныя матывы, тым не менш і тут існавала вялікая розніца ў арнаментацыі. Так, адзін яе тып блізкі да размаляваных украінскіх куфраў (асноўны матыў – вазон), іншыя мала адрозніваліся ад літоўскіх і латышскіх куфраў: пярэдняя сценка ўпрыгожвалася палосамі, канцэнтрычнымі коламі і буйнымі разеткамі з ланцужкоў, складзеных з дробных разетак і лісця. Гэтыя ўзоры наносіліся яркімі фарбамі па каляровым фоне пры дапамозе штампаў, выразаных з сырой бульбіны. На Палессі існавалі мастацкія цэнтры па вырабе дэкарыраваных куфраў (вёскі Огава і Опаль Іванаўскага раёна, Крамно і Хомск Драгічынскага раёна, Давыд-Гарадок Столінскага раёна). Асабліва прыгожыя куфры былі выяўлены падчас этнаграфічных экспедыцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў 1979 г. у вёсках Хойна, Кнубава, Вялікія Дварцы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. У інтэр'еры сялянскай хаты куфар добра гарманіраваў з тканымі ручнікамі, посцілкамі і ажыўляў яе сціплы каларыт.

У адрозненне ад заходніх раёнаў ва Усходнім Палессі куфры, як правіла, не распісвалі. Іх дэкарыравалі плоскай контурнай разьбой[1]. Палескія скрыні мелі звычайна плоскае вечка, а часам і выдзвіжныя скрыні ў ніжняй частцы[2], сумяшчаючы такім чынам у сабе і некаторыя элементы камоды. У верхняй частцы ўнутры куфра, як правіла, прыраблялі збоку вузенькую скрынку для дробязей («прыскрынак»).

Па форме палескія скрыні можна падзяліць на заходні тып з вертыкальнымі сценкамі і ўсходні, звужаны да долу, са скошанымі сценкамі. Акрамя таго, куфры розных рэгіёнаў адрозніваліся не толькі формай, але і сваімі памерамі. Скрыні асабліва вялікіх памераў выраблялі на Случчыне. Для зручнасці перамяшчэння да іх прыраблялі невялікія драўляныя або металічныя колцы. Аналагічныя скрыні на колцах і з выдзвіжнымі шуфлядкамі зафіксаваны ў Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці[3].

[1] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. С. 21.

[2] Титов В. С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов. С. 57.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.



Куфар. 1950-я гг. Дрэва, роспіс. З в. Крамно, Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры



Куфар. Хойніцкі раён Гомельскай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры



Куфар. 1950-я гг. Дрэва, акоўка жалезам. Брагінскі раён Гомельскай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ



Куфар. Нараўлянскі раён Гомельскай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры

Колькасць мэблі, як і характар упрыгажэння жылля, залежалі ад эканамічнага становішча селяніна. Заможныя сяляне набывалі вырабы гарадскіх рамеснікаў, а бяднейшыя сяляне па-ранейшаму карысталіся традыцыйным абсталяваннем уласнага вырабу.

Такім чынам, інтэнсіўнае развіццё капіталістычных адносін у беларускай вёсцы, якое пачалося пасля сялянскай рэформы 1861 года, унесла вялікія змены ў інтэр'ер сялянскага жылля. Інтэр'ер ужо выразна размяжоўваецца ў залежнасці ад эканамічнага і сацыяльнага становішча селяніна. У дамах найбольш заможных гаспадароў сталі насцілаць у хатах драўляныя падлогі. Замест спальнага «пола» з'явіліся драўляныя ложкі; разам з простымі лавамі сустракаліся канапы, крэслы на гарадскі ўзор. Часцей сталі сустракацца вокны і дзверы на жалезных завесах. Аднак нягледзячы на вялікія перамены, якія адбыліся на працягу другой паловы XIX ст., інтэр'ер беларускага народнага жылля захоўваў у аснове традыцыйныя рысы.

## Мастацка-дэкаратыўнае аздабленне абрадавага інтэр'ера

Разглядаючы інтэр'ер жылля канца XIX – пачатку XX ст. як структуру стабільную і нязменную, даследчыкі недастаткова ўвагі надавалі дынаміцы і характару змен, якія адбываліся ва ўнутранай прасторы. У той час, як паказалі палявыя і літаратурныя крыніцы, яна не з'яўлялася сістэмай статычнай. Усе найбольш важныя моманты каляндарнага цыкла адпаведным чынам адлюстроўваліся ў інтэр'еры.

Святочнае ўбранне вырашалася шляхам насычэння буднічнага інтэр'ера культавымі, абрадавымі і дэкаратыўнымі прадметамі (з абавязковай рэгламентацыяй іх матэрыялу, колькасці, колеру, арнаментацыі, месца размяшчэння і г. д.). Сукупнасць усіх гэтых элементаў семантычна змяняла інтэр'ер жылля.

У сувязі з тым, што святочны інтэр'ер вырашаўся на аснове штодзённага, неабходна даць агульную характарыстыку апошняга. Для штодзённага інтэр'ера была характэрна наступная сістэма мастацка-дэкаратыўных элементаў: гліняная падлога, сцены з бярвення ці пабеленыя, нічым не аздобленыя; абразы, упрыгожаныя сціплымі «набожнікамі», «пол» засцелены штодзённай бела-шэрай ці двухкаляровай посцілкай («дубальтоўкай»); навалачкі падушак з нявыбеленага палатна без каляровых тканых упрыгажэнняў, на жэрдках вісела штодзеннае адзенне. Па звестках інфарматараў, у шэрагу раёнаў Цэнтральнай Беларусі, Заходняга і Усходняга Палесся стол у звычайныя дні, як правіла, не накрывалі настольнікам і пакідалі пустым без хлеба і солі («настольнік засцілалі толькі ў нядзельку»).

З надыходам нядзелі ці свята штодзённае аздабленне хаты пераўтваралася за кошт увядзення дадатковых дэкаратыўных элементаў. У інтэр'еры беларускага народнага жылля канца XIX – пачатку XX ст. шырока выкарыстоўваліся настольнікі («абрус», «сарвета»). Святочныя настольнікі ўпрыгожвалі чырвонымі палоскамі, размяшчаючы іх звычайна па вузкіх краях. Часам такія палосы ўпрыгожвалі ўсе чатыры краі вырабу. Акрамя таго, настольнікі часта па краях аздабляліся карункамі ці махрамі[1].

Асаблівую вытанчанасць інтэр'еру надавалі ажурныя абрусы. Узор у іх складаўся ў асноўным з квадратаў рознага памеру, запоўненых унутры дробнымі ажурнымі клетачкамі. Такія абрусы сустракаліся на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Значную ролю ва ўпрыгожванні святочнага інтэр'ера адыгрывала ўбранне «пола» ці ложкаў адмысловымі пакрываламі («посцілка», «прасцілка», «коўдра» і інш.). Асноўны арнаментальны малюнак дэкаратыўных посцілак быў нескладаным і часцей за ўсё складаўся з клетак або палосак. Клятчатыя посцілкі былі распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Бе-

[1] Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество. Минск, 1981. С. 91.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Святочны інтэр'ер з в. Волева, Дубровенскі раён Віцебскай вобласці. Пачатак XX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

ларусі. Дамінавалі спалучэнні чырвонага і чорнага, чорнага і жоўтага, чорнага і зялёнага колераў. Нават пры такой каларыстычнай стрыманасці, кантраснай і рытмічна вытрыманай, малюнак посцілак на фоне драўляных або пабеленых сцен аказваў моцны дэкаратыўны эфект.

У заходніх раёнах Беларусі шырока бытавалі папярочна-паласатыя посцілкі. Для посцілак паўднёвых і цэнтральных раёнаў Беларусі характэрны як геаметрычны, так і раслінны арнамент[1].

На ўсёй тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. былі шырока распаўсюджаны таксама посцілкі жакардавага перапляцення. Для іх характэрны нескладаныя геаметрычныя ўзоры, у асноўным клеткі, кругі, якія аб'ядноўваліся дробнымі клетачкамі («стоўбікі», «драбнічкі»), маленькія прастакутнікі, размешчаныя ў форме агурка («агурочкі»).

У канцы XIX – пачатку XX ст. у беларусаў былі вядомы і браныя пакрывалы («перабіранка», «на-



Абрус (фрагмент). 1930-я гг. Лён, бавоўна. З в. Неглюбка, Веткаўскі раён Гомельскай вобласці. Музей старажытнабеларускай культуры

[1] Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество. С. 94.



Святочны інтэр'ер. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Абрус. Сярэдзіна XX ст. Лён, ажурнае ткацтва, бавоўна, вышыўка, кутасы. З в. Мосар Глыбоцкі раён Віцебскай вобласці

боркі», «пераборы» і г. д.). У іх пераважалі раслінныя ўзоры: «дубовае лісце», «грабовае лісце», «веткі бэзу», «вазоны», «пеўні» і г. д.

Багаццем узораў і каляровай гамы характарызуюцца пакрывалы, вытканыя закладной тэхнікай, – «закладанкі», «укладанкі». Арнамент часцей геаметрычны – ромбы з размешчанымі ўнутры іх васьміпялёсткавымі разеткамі («звёзды»), раслінны («цвяты») і зааморфны («каты», «ільвы» і інш.)[1]. Посцілкі, вырабленыя закладной тэхнікай, найбольш распаўсюджаны на паўднёвым усходзе, у той час як браныя і шматрамізныя вядомыя на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У канцы XIX – пачатку XX ст. у інтэр'еры беларусаў шырока распаўсюджваюцца даматканыя дываны («набіванкі»), якія мелі свае лакальныя адрозненні. Так, на поўначы Беларусі такія «дываны» былі звычайна паласатымі, а для паўднёвых раёнаў характэрны дываны з раслінным і геаметрычным арнаментам[2].

[1] Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество. С. 95.
[2] Тамсама. С. 98.

Вокны ў святочныя дні занавешвалі тканымі ажурнымі фіранкамі («фіранкі», «афіранкі», «завескі»), якія з'явіліся пад уплывам гораду. Папяровымі ўзорамі, выробленымі з белай, чорнай ці каляровай паперы, упрыгожваліся ў дні святаў таксама сцены, бэлькі, рамы абразоў, паліцы для посуду. Аснову фарміравання сістэмы разнога папяровага дэкору інтэр'ера беларускага жылля складалі традыцыйныя матывы арнаменту, мастацка-вобразная мова якога на працягу стагоддзяў была адным са сродкаў адлюстравання народнага светапогляду. Асноўнымі элементамі кампазіцыі з'яўляюцца ромбы, крыжыкі (старажытны сімвал урадлівасці), традыцыйныя матывы ў выглядзе «дрэва жыцця» і хвалістых ліній (знак бясконцасці)[1].

Круглыя разеткавыя выцінанкі, верагодна, выразалі як сімвал сонца, тым больш што іх выраблялі да Вялікадня. Па звестках Я. М. Сахуты, у шэрагу вёсак Навагрудскага і Лідскага раёнаў Гродзенскай вобласці старажылы яшчэ памятаюць назвы «сонца» і «месяц», якія адносяцца ды круглых разеткавых матываў на фіранках[2].

На аснове штодзённага інтэр'ера стваралася сістэма ўнутранай прасторы, якая семантычна пераўтварала інтэр'ер жылля ў час свят. Самым знакавым святам зімняга цыкла лічылася Раство. Рытуальная калядная вячэра, у час якой, па меркаванні беларусаў, адбывалася сувязь з памерлымі продкамі («дзядамі»), патрабавала максімальнай сакралізацыі прасторы. Гэта дасягалася за кошт маркіравання яе асноўных кропак – месца дзеяння («цэнтр»), верху і нізу («неба» і «зямлі»).

Па звестках Ю. Ф. Крачкоўскага, «на покуці ставілі сноп жыта, а на стале рассцілалі сена, куды гаспадыня ставіла гаршчок з куццёю»[3]. Абразы ўпрыгожвалі арнаментаванымі «набожнікамі» і папяровымі кветкамі. Па інфармацыі О. А. Яцко (1908 г. н., жыхарка в. Гольчыцы Слуцкага раёна), «на Раство на шэст вывешвалі ўсе посцілкі»[4].

Бытавалі і іншыя варыянты. Стол ставілі пасярэдзіне хаты і накрывалі вышытым ці затканым настольнікам, які пасля свята старанна захоўвалі, бо лічылася, што ён можа аказаць магічнае ўздзеян-



Посцілка ў інтэр'еры жылля з в. Агароднікі, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Посцілка з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. 1920-я гг. Лён, воўна, бавоўна, аднабаковы перабор. Музей старажытнабеларускай культуры

[1] Рыбаков Б. А. Язычество древних славян. М., 1987. С. 314.
[2] Сахута Я. М. Выцінанкі // Мастацтва Беларусі. 1988. № 12. С. 64.
[3] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. М., 1874. С. 163.
[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Слуцкі раён Мінскай вобасці ў 1981 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Посцілка з в. Трайчаны, Любанскі раён Мінскай вобласці. 1950-я гг. Лён, воўна, бавоўна, аднабаковы перабор. Музей старажытнабеларускай культуры



Дыван (фрагмент) з в. Дарасіно, Любанскі раён Мінскай вобласці. 1930-я гг. Лён, воўна, бавоўна, аднабаковы перабор. Музей старажытнабеларускай культуры



Павук. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

не на людзей, жывёлу, пасевы. На покуці падвешвалі кашэль з насеннем ячменю, жыта, пшаніцы.

На падлозе раскладвалі пласт саломы. Славенскі этнограф В. Новак выказаў меркаванне, што тая роля, якая адводзілася на Раство саломе, тлумачыцца не столькі ўплывам царкоўнага падання аб нараджэнні Хрыста ў яслях на сене, колькі перажыткамі культу продкаў[1]. Рассціланне ў калядны вечар саломы на падлозе жылля шырока вядома і іншым славянскім народам. Да бэлькі беларускія сяляне падвешвалі складаную аб'емную канструкцыю з саломы – «павука», упрыгожанага папяровымі кветкамі.

Падобныя «павукі» сустракаліся ў Чэхіі[2]. Вельмі блізкую па форме фігуру падвешвалі да столі польскія сяляне, для якіх, дарэчы, характэрным было і ўсталяванне ў ганаровым куце саламянага снапа. Як паказалі палявыя матэрыялы, у шэрагу раёнаў Падняпроўя «павука» замянялі цыбулінай або бульбінай з уваткнутымі саломінкамі[3].

Абавязковым элементам інтэр'ера зімовага сваточнага цыкла былі саламяныя крыжыкі. Так, па звестках А. І. Асьміровіч (1902 г. н., жыхаркі в. Майсеевічы Асіповіцкага раёна), «Каля абраза з саломы крыжык пастановяць, а як выйдзе Каляда, яна еты хрэсцік на яблыньку і павесіць, каб яблычкі не ўпалі»[4]. На Вадохрышча крыжыкі падвешвалі таксама да аконных і дзвярных праёмаў, клалі на падваконне. Часам крыж з дзвюх лучынак устаўлялі ў куццю. Матэрыял і месца размяшчэння крыжыкаў паказваюць, што яны выконвалі функцыю абярэгаў ад нячыстай сілы, якая ў дні святаў лічылася асабліва небяспечнай.

Нядзельны варыянт інтэр'ера з'яўляўся асновай для фарміравання ўнутранага святочнага асяроддзя ў дні асноўных вясенне-летніх святаў (Вялікадня, Сёмухі, Купалля).

Напярэдадні Вялікадня, у «чысты чацвер» кожная гаспадыня бяліла печ. У Ляхавіцкім раёне падлогу скраблі лапатай і пасыпалі белым пяском, у Кобрынскім – дробна набітай чырвонай цэглай. Як паказалі палявыя матэрыялы, у в. Акцябр Кобрынскага раёна земляны ток да святаў падмазвалі чор-

[1] Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: зимние праздники. М., 1973. С. 248.

[2] Тамсама. С. 130.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Хоцімскі раён Магілёўскай вобласці ў 1988 г.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці ў 1982 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най глінай[1]. На накрытым абрусом стале «ставілі некалькі бабак пасхі (абрадавы хлеб), яйкі, алей, сыр, каўбасы»[2]. Па звестках С. Я. Макоўскага (1913 г. н., жыхара в. Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці), «над кожным акном вешалі арнаментаваны ручнік». Столь, сцены, мэблю, драўляныя канструкцыі і канструктыўныя элементы старанна мылі. Па словах І. С. Сцяпанава (1897 г. н., жыхара в. Бракава Слабада Чавускага раёна), «мялі, мылі падлогу, сцены і мэблю, каб пазбавіцца ад усяго старога і нячыстага»[3]. Відавочная сувязь з ачышчальным магічным абрадам, генетычныя карані якога варта шукаць у старажытнаславянскай ачышчальнай абраднасці.

За абразы затыкалі пучкі галінак вярбы, асвячоныя ў «вербную нядзелю». Дзякуючы высокаму семіятычнаму статусу падчас урачыстасцей вярба сакралізавалася і выкарыстоўвалася ў далейшым для рознага роду «ахвярапрынашэнняў». Так, у в. Дубровіца Хойніцкага раёна «як грыміць, паставяць у хаце на куту вярбу, а як моцна грыміць у вакно заткнуць». А ў Мазырскім раёне «як ідзе град, дык паляць свечану вярбу, каб дым шоў у печ»[4]. Па звестках Е. Р. Раманава, вярба выкарыстоўвалася і ў іншых экстраардынарных выпадках: «асвячонай вярбой білі хворых, прыгаворваючы: «Не я б'ю, вярба б'е! Хіра ў лес, здароў'е ў косці»[5]. Адной з гэтых галінак у першы раз выганялі ў поле жывёлу.

Значныя змены ў інтэр'еры жылля адбываліся на Сёмуху. Галінкамі вярбы і кветкамі («маем») ўпрыгожвалі сцены жылля ўнутры і звонку. Акрамя вярбы для сімвалічнага азелянення жылля сяляне выкарыстоўвалі таксама галінкі бярозы, ліпы, рабіны і клёна[6]. Па палявых даных, на Панямонні падлогу высцілалі яварам, а ў Заходнім Палессі – клёнам і бярозай[7].

Характэрную асаблівасць інтэр'ера сялянскага жылля на свята Івана Купалы ўяўляла сімвалічнае прасторавае абмежаванне жылога аб'ёму за кошт маркіравання чатырох кутоў (па гарызанталі), пола і трама (па вертыкалі). Беларусы лічылі, што пачынаючы з купальскага свята на працягу тыдня вядзьмаркі і наогул «нячыстая сіла» можа асабліва моцна пашкодзіць людзям і жывёлам, урываючыся праз вокны, дзверы і іншыя адтуліны дамоў. Асаблівую моц, на думку беларусаў, злыя сілы набывалі пасля заходу сонца. Таму з надыходам вечара напярэдадні свята гаспадыня рвала крапіву і раскладвала яе на вокнах, кутах, парогах і іншых адтулінах свайго жылля. Па звестках Ю. Ф. Крачкоўскага, у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні для абярэгу ад злых сіл на дзвярах, вокнах, кутах вешалі вянкі, сплеценыя з зеляніны[8].

Святочны інтэр'ер служыў асновай для фарміравання семантычных і семіятычных характарыстык унутранай прасторы жылля, адпаведных радзіннай і вясельнай абраднасці. Абавязковым элементам радзіннай абраднасці было завешванне «пола» адразу ж пасля нараджэння дзіцяці ільняным полагам, які не здымалі на працягу шасці тыдняў, абараняючы маці і дзіця ад сурокаў.

Вясельны інтэр'ер фарміраваўся на аснове святочнага. Пры гэтым святочны варыянт дадаткова ўзбагачаўся за кошт увядзення папяровых упрыгажэнняў, кветак, дэкаратыўных тканін. Так, па звестках Т. А. Дарафеюка (1906 г. н., жыхара в. Брылёва Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці), напярэдадні вяселля ў хаце маладой на сцены вешалі ад 3 да 10 ручнікоў. Асабліва змяняўся інтэр'ер за кошт дэкаратыўных тканін, калі маладая прыходзіла ў хату свякрухі. Па даных інфарматараў, у Пружанскім раёне нявеста клала два абрусы накрыж і ставіла каравай; на кожны абраз і па сценах вешала ручнікі, ад 3 да 30[9]. У Кобрынскім раёне нявеста, «як прыедуць да яе госці, выкладала на стол усе настольнікі». Існавалі і іншыя варыянты. Так, па звестках П. П. Лагвіненка (1899 г. н., жыхаркі в. Надтачаеўка Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці), «як прывозілі маладую, то яна на жэрдку вешала пасцілкі. А калі была адна дачка ў бацькоў, то было да 30 пасцілак»[10].

Будзённы інтэр'ер служыў падставай для фарміравання семантычных і семіятычнай характарыстык ўнутранай прасторы жылля, адпаведных

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці ў 1979 г.

[2] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 106.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Хойніцкі раён у 1981 г. і Мазырскі раён Гомельскай вобласці у 1980 г.

[5] Романов Е. Р. Белорусский сборник. С. 153.

[6] Тамсама. С. 203.

[7] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Кобрынскі раён у 1979 г., Маларыцкі раён Брэсцкай вобласці ў 1981 г., Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці ў 1987 г., Навагрудскі раён у 1981 г.

[8] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 127.

[9] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Пружанскі раён у 1980 г.

[10] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Нараўлянскі раён у 1981 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Святочны інтэр'ер з в. Варашылкі, Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Пачатак XX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

пахавальнаму рытуалу. У выпадку смерці аднаго з членаў сям'і, у Баранавіцкім раёне тарцовае і фасаднае вакно завешвалі посцілкай («дзяружкай»), у Драгічынскім раёне – фартухамі. Па звестках А. А. Буцэнка (1919 г. н., жыхаркі в. Боруцк Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці), «Кутна вакно напалову запіналі настольнікам, які пры пахаванні клалі ў труну»[1]. Перад абразамі запальвалі лампадку ці васковую свечку. Стол накрывалі белым абрусам, клалі бохан хлеба і соль. На акно, як правіла, ставілі шклянку з вадой («Каб душы было ў чым памыцца»)[2]. Па звестках Е. Р. Раманава, «шклянка з вадой стаяла ў куце пад абразамі на працягу шасці тыдняў, паколькі лічылі, што да саракавога дня душа нябожчыка знаходзіцца ў доме і мае патрэбу ў пітве»[3]. Нябожчыка клалі на жытнюю салому, пакрытую палатном. Як паказалі палявыя матэрыялы, у Падняпроўі мужчыну клалі на «мужчынскую лаўку», жанчыну – на бакавую, «бабскую»[4]. Месца кожнага члена сям'і вакол лаўкі, на якой ляжаў нябожчык, было строга рэгламентавана. На ток («зямлю») каля нябожчыка кідалі трэскі і стружкі, на якія ставілі труну. Мяркуючы па палявых матэрыялах, калі памірала жанчына, то каля яе ног клалі два скруткі палатна. Па звестках Ю. І. Петушкевіч (1908 г. н., жыхаркі в. Юшкавічы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці), «Як малады памрэ, то в'юць вянок з кветак на ўвесь рост, а ўзімку ядлоўцам выкладваюць, ды паўтыкаюць каляровыя паперкі ці кветкі»[5].

Такім чынам, усе галоўныя жыццёвыя падзеі ў сям'і і найбольш важныя моманты каляндарнага цыклу адпаведным чынам адбіваліся ў інтэр'еры. Уключэнне ў інтэр'ер культавых, абрадавых і дэкаратыўных прадметаў візуальна і семантычна змяняла ўнутраную прастору. Падставай для фарміравання ўсіх пераўтварэнняў інтэр'ера служылі будзённы і святочны варыянты. Мастацка-вобразная структура апошняга ўзбагачалася за кошт абнаўлення стацыянарных дэкаратыўных элементаў (падмазвання тока, падбельвання печаў) і ўключэння дадатковых (тканін, святочнага адзення).

Вывучэнне і аднаўленне абрадавага інтэр'ера дазваляе зрабіць выснову, што ў пераўтварэнні ўнутранай прасторы, у яго ідэйнай сутнасці знайшлі адлюстраванне не толькі традыцыйныя эстэтычныя каноны, але і старажытныя ўяўленні чалавека пра стварэнне свету і яго ўнутраныя ўзаемасувязі.

## Прадметы інтэр'ера ў абрадах і звычаях

Для методыкі этнаграфічнага вывучэння з'яў матэрыяльнай культуры характэрна не толькі дакладнае апісанне прадметаў, але і выяўленне іх сацыяльнага існавання. Вывучаючы прадмет, нельга не браць пад увагу ўсіх тых людзей, якія маюць да

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці ў 1980 г.

[2] Сержпутоўскі А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. М., 1930. С. 208.

[3] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 524.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён у 1987 г.

[5] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці ў 1989 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

яго тое ці іншае дачыненне. Больш за тое, для этнографа важна ведаць не столькі адносіны рэчы да чалавека ці адносіны чалавека да рэчы, колькі адносіны паміж людзьмі ў дачыненні да гэтай рэчы[1]. Вось чаму важнай задачай этнаграфічнага вывучэння інтэр'ера беларускага народнога жылля з'яўляецца пытанне аб месцы і ролі прадметаў інтэр'ера ў звычаях і абрадах народа.

Найважнейшай умовай існавання любога грамадства з'яўляецца наяўнасць агульнай калектыўнай памяці. У культуры, арыентаванай пераважна на рытуал, адсутнічала аднародная семіятычная сістэма, якая прызначалася для фіксацыі і захавання інфармацыі. У «вуснай культуры» прыроднаму і культурнаму асяроддзю чалавека (прадметам побыту, часткам жылля, адзенню і г. д.) надаваўся знакавы характар. Усе гэтыя семіятычныя сродкі разам з моўнымі тэкстамі, міфамі, тэрмінамі сваяцтва і іншымі з'явамі культуры валодалі агульным полем значэнняў. Усе структуры аб'ядноўваліся ў адзіную знакавую сістэму такім чынам, што элемент адной сістэмы мог мець сваім значэннем элемент іншай. Але нават пры такім захаванні сціранне сэнсу таго ці іншага значэння было непазбежным. І з улікам гэтага грамадства вылучала найбольш значныя фрагменты памяці і аднаўляла іх пры дапамозе рытуалу[2].

**Семіятычная роля покуці ў абрадах.** Найбольш пачэснай часткай інтэр'ера беларускага народнага жылля канца XIX – пачатку XX ст. была покуць. Прастора на покуці мела ярка выражаны знакавы характар. Яе каштоўнасць узрастала ў кірунку да самага сакральнага месца – пад абразамі. Сядзець «на куце» ў беларусаў лічылася пачэсным, тут звычайна сядзеў гаспадар альбо званыя госці, напрыклад, кумы падчас радзін (Мсціслаўскі павет Магілёўскай губерні)[3]. Сачылі за тым, каб гаспадар сядзеў не на самім куце пад абразамі, а трохі адсунуўшыся, каб было месца для Бога, бо «на куце сядзіць альбо поп, альбо дурань». Па баках ад гаспадара садзіліся старэйшыя мужчыны, за імі – маладзейшыя, а на самым канцы стала – жанчыны. Тыя, каму не хапала месца за сталом, елі на лаўцы ці каля печы. Калі ў сям'і не было бацькі, то яго месца займаў старэйшы жанаты сын, а калі ён яшчэ нежанаты, то маці. Жанчыны, як правіла, сталага ўзросту, маглі займаць пачэсныя месцы за сталом і падчас пэўных абрадаў: кума на хрэсьбінах, хросная маці аднаго з маладых на вяселлі.

Рассаджванне падчас ежы ў шматлікіх культурах звязана з падзяленнем унутранай прасторы жылля на часткі, надзеленыя розным сімвалічным значэннем: больш пачэсную і менш пачэсную, мужчынскую і жаночую, правую і левую. Пры гэтым самым прэстыжным у многіх народаў лічылася месца насупраць уваходу.

Семіятычная роля покуці падкрэслівалася і тым, што там захоўваліся найбольш значныя культурныя сімвалы: абразы, Біблія, малітоўныя кнігі, крыж, асвячоная вярба, свечкі. Менавіта абразы пераносілі ў новую хату ў першую чаргу.

Высокі знакавы статус абразоў патрабаваў і адпаведных паводзін чалавека з імі. Іх нельга было прадаваць, паліць ці знішчаць, можна было толькі закопваць ці пускаць па вадзе. Чысцілі абразы двойчы ў год: перад Раством і Вялікаднем. Сярод прадметаў, якія размяшчалі ў бажніцы, асаблівае значэнне надавалася свечкам, сярод якіх былі вянчальныя, велікодныя, чацвярговыя. Усе яны выкарыстоўваліся падчас хваробы, родаў, навальніцы, пажару. У апошнім выпадку асаблівай сілай надзялялася чацвярговая свяча.

За абразамі знаходзіліся і галінкі вярбы, якія асвячаліся ў Вербную нядзелю. Дзякуючы высокаму семіятычнаму статусу падчас свят вярба сакралізавалася і выкарыстоўвалася супраць хваробы і навальніцы. Так, у в. Дубровіца Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці «як грыміць ставяць у хаце на куце вярбу, а як моцна грыміць у вакно затыкаюць». А ў Мазырскім раёне «як ідзе град, дык паляць свечану вярбу, каб дым шоў у комін»[4].

У каляндарным цыкле покуць адзначана як месца для першага і апошняга снапа, якія ставяць пад абразамі. Важнейшым элементам не толькі покуці, але ж і ўсёй жылой прасторы быў стол. Так М. Я. Нікіфароўскі пісаў, што за «оцецкім столом» адбываецца ўсё лепшае ў жыцці селяніна, стол стаіць вышэй за астатнія рэчы ў хаце: пусціць на стол кошку, курыцу ці дзіця лічылася ганебным, таму што на ім ляжаў дар божы – хлеб і соль»[5]. Па звестках Ф. Грома (1885 г. н.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Токарев С. А. К методике этнографического изучения материальной культуры // Сов. этнография. 1970. № 4. С. 3–17.

[2] Байбурин А. К. Ритуал в традиционной культуре: структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов. СПб., 1993. С. 237.

[3] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 535.

[4] Нароўская А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX – пачатак XX ст.). Мінск, 2008. С. 12.

[5] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 317.



Покуць. Хата сям'і Хмялеўскіх з в. Лісічыцы, Касаўскі павет. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыхара в. Хабавічы Кобрынскага раёна) лічылася вялікім грахом пакідаць стол без хлеба і солі. У шэрагу раёнаў Заходняга Палесся і Цэнтральнай Беларусі нельга было пакідаць на стале нож. Апытанне інфарматараў высветліла наступны сэнсавы змест: «нельга нож пакідаць, бо нячысцікі будуць ім усю ноч ваяваць». У в. Бацэвічы Клічаўскага раёна гэту забарону тлумачылі: «каб у хаце не сварыліся»[1].

Покуць была звязана з абрадамі, якія рэгулявалі сацыяльны аспект жыцця чалавека, яго сацыялізацыю і дэсацыялізацыю. Пры цяжкіх родах жанчыну абводзілі кругом стала. Пасля родаў закапвалі «дзіцячае месца» (паслед) на покуці.

Зафіксавана мноства магічных абрадаў і павер'яў, звязаных са сталом на Каляды. Стол да рытуальнай вячэры накрывалі святочным настольнікам. Вячера суправаджалася магічнымі дзеяннямі, звязанымі з аграрным і ахоўна-магічным культам. Стол выконваў функцыю своеасаблівага хатняга ахвярніка – на стол і пад яго клалі розныя прадметы, якія сімвалізавалі ўрадлівасць, дабрабыт, ахову ад злых сіл. Так, Ю. Ф. Крачкоўскі пісаў, што «разам з сенам пад настольнік сыпалі зерне розных культур. Калі са стала здымалі сена, то глядзелі ці не засталося на стале зярнят, якіх зярнят будзе больш, то і ўраджай менавіта гэтага роду хлеба будзе большы» (в. Альшаны Ашмянскага павета Віленскай губерні)[2]. Гэта зерне надзялялі магічнай сілай урадлівасці і дадавалі яго ў насенне. Альбо на Каляды «на стол» і ў покуці клалі сена з саломаю і пасля абеду ўсе выцягівалі саломінкі: калі выцягне гаспадыня доўгую саломінку, то вырасце добры лён.

Пасля вячэры гаспадар, тройчы перахрысціўшыся, сядаў на покуці, а жонка насупраць яго на «ўслоне» і пытала:

«– Чы бачыш мяне?

– Не бачу.

– Каб жа ты не бачыў за стагамі, за копамі, за вазамі, за снапамі свету.

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці ў 1980 г.

[2] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 164.



Калядны інтэр'ер. Покуць. З в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

– Чы бачыш ты мяне, жонка?

– Не бачу.

– Каб жа ты не бачыла за гуркамі, за гарбузамі, за качанамі, за буракамі свету».

Пасля вымаўлення гэтых слоў гаспадыня брала качаргу і піхала гаспадара. Ён хуценька «валіўся» на лаву і казаў «дай жа Божа, каб снапы так хутка падалі на ніве»[1].

Са сталом былі звязаны і іншыя абрадавыя дзеянні. Так, у першы дзень Каляд вілі шворку і звязвалі ёю ножкі стала, каб скаціна «не травіла палёў». Этнаграфічныя матэрыялы паказываюць, што абвязванне ножак адбывалася і з іншых нагод з самымі рознымі матывіроўкамі. Так, выкананне гэтага звычаю забяспечвала поспех у асаджванні раёў пчол (в. Докшыца Барысаўскага павета Мінскай губерні)[2]. П. Г. Багатыроў, прааналізаваўшы гэты абрад, зрабіў выснову, што нягледзячы на розніцу ў народных тлумачэннях гэты абрад падпарадкоўваецца наступным законам магіі: закону кантакту і закону падабенства.

Асаблівая роля адводзілася сталу, як і ўсёй застольнай прасторы, у вясельнай абраднасці. Так, згодна з матэрыяламі П. В. Шэйна, у в. Дзякавічы Мазырскага павета дзяўчына ў знак згоды выйсці замуж брала з сенцаў стол, ставіла яго на покуці, дзе сядзеў сват, і накрывала настольнікам[3]. У этнаграфічных апісаннях штораз прыгадваецца і тое, што маладых урачыста абводзілі вакол стала. Гэта падцвярджаецца і палявымі матэрыяламі аўтара: перад тым, як ехаць у царкву, бацькі благаслаўлялі маладых і тройчы абводзілі кругом стала У іншых мясцінах гэта праводзілася яшчэ больш урачыста. Так, у в. Ярэмічы Навагрудскага павета «дружка браў белы ручнік, адзін канец якога даваў маладому, а другі трымаў сам. Потым тройчы абводзіў маладога кругом стала і кожны раз яны кланяліся ўсім прысутным, а таксама хлебу, які ляжаў на стале»[4]. Такім чынам, стол у вясель-

[1] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 1, ч. 1. С. 47.

[2] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 166–167.

[3] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 394.

[4] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Покуць. Канец XIX – пачатак XX ст. 3 в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

ным абрадзе з'яўляўся цэнтрам найбольш каштоўнай у рытуальным значэнні часткі дома.

Менавіта за сталом адбывалася канчатковае далучэнне нявесты да новага дома і новай сям'і: за сталом адбывалася адкрыванне маладой, бласлаўленне маладых. Рытуальны сэнс надаваўся і пакрыццю стала настольнікам. У шэрагу рэгіёнаў настольнік клалі навыварат, каб не было сурокаў на маладых.

Са сталом было звязана і шмат іншых абрадаў. Так, у выпадку цяжкіх родаў парадзіху абводзілі кругом стала. Е. Р. Раманаў пісаў: «беларусы лічылі, што неабходна было абвесці парадзіху вакол стала, засланага настольнікам, дзеля таго, каб народжаны быў прывязаны да дома і жыў у дастатку»[1]. Такім чынам, стол уключаўся ў сістэму ўяўленняў аб добрым выніку родаў.

Стол быў вельмі важнай часткай ва ўсіх народаў, напрыклад, у Славакіі не хацелі набываць дом без стала. Такія адносіны да стала звязаны з асаблівасцямі яго семантыкі. У традыцыйных уяўленнях амаль паўсюдна праводзіліся аналогіі паміж сталом у доме і алтаром, прастолам у царкве. Цікава, што покуць не толькі аздаблялася, як алтарная частка храма (бажніца з абразамі, свечкі, Біблія і г. д.), але ў гэтым месцы і паводзіць сябе трэба было адпаведна.

Устойлівая сувязь покуці з комплексам уяўленняў аб смерці, продках праяўлялася ў дні памінання дзядоў. На саракавы дзень чакалі нябожчыка дахаты. На стол ставіўся дадатковы посуд. На покуці слалася чыстая пасцель для госця. У час пахавання заўважалі, куды адхіляецца (пры вынасе нябожчыка) полымя свечкі, якая гарэла каля яго галавы: «Пойдзе ў чырвоны кут, то добра, а калі полымя пойдзе ў дзверы, то хутка ў хаце будзе яшчэ адзін нябожчык»[2].

Гаворачы аб выкарыстанні прадметаў інтэр'ера на покуці, трэба адзначыць шматзначнасць іх функцыянальнага прызначэння. Гэта перш за ўсё функцыі аховы будучага ўраджаю, аховы здароўя людзей і хатніх жывёл. Абрадавыя дзеянні з прадметамі

[1] Романов Е. Р. Белорусский сборник. С. 304.

[2] Мышко А. П. Этнография дер. Рывков Скидельской волости Гродненской губернии // Сов. этнография. 1941. № 5. С. 86.



Дзявочы пакой. З в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Сукня маладой з в. Варашылкі, Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

РЕПОЗИТОРИЙ

інтэр'ера ў шматлікіх выпадках былі абумоўлены захаванасцю перажыткаў язычніцкіх вераванняў. Як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы, к канцу XIX – пачатку XX ст. сэнс абрадаў часта быў страчаны ці набыў новае тлумачэнне.

**Печ у абрадах беларусаў.** З печчу былі звязаны асноўныя характарыстыкі ўнутранай прасторы жылля. Печ служыла адначасова крыніцай цяпла, месцам прыгатавання ежы і месцам для сну, а ў большасці раёнаў Заходняга Палесся ў печцы мыліся і парыліся[1].

З усіх работ, якія адносіліся да арганізацыі ўнутранай прасторы жылля рытуальным характарам вызначалася «печабіцце». У беларусаў традыцыйна для выканання гэтай працы склікалася талака.

Калі печнікі пачыналі «біць» печ, гаспадыня імкнулася задобрыць майстроў, каб печка не дыміла, каб добра выпякала хлеб, доўга трымала цяпло і патрабавала мала дроў. Лічылася, што калі ў печцы кепска выпякаецца хлеб, то гэта печнікі зрабілі так, што як бы горача не тапіў чалавек печку, у ёй не будзе выпякацца хлеб. А залажыўшы ў печ «ліновішча» гадзюкі (скуру змяі, калі яна ліняе), печнікі рабілі гэтую печку непрыдатнай для выпечкі хлеба.

Каб печка ніколі не дыміла, пры печабіцці ў яе сценкі закладвалі кавалачкі ладану, а часам паміж цаглінамі клалі грошы.

Такім чынам, рытуальныя дзеянні, звязаныя з печабіццем, былі вынікам асаблівай ролі печкі не толькі ў гаспадарча-эканамічнай, але і ў рытуальна-міфалагічнай, сацыяльнай сферах жыцця калектыву.

З печчу быў звязаны культ агню. У кожным жыллі існаваў хатні ачаг і так званы ў народзе «свой агонь». У этнаграфічных апісаннях неаднаразова адзначаецца, што ў пэўныя дні, асабліва на святы, а таксама ў дзень пачатку сяўбы лічылася за грэх даваць нават суседу з хаты агонь, а калі пазычалі, то з абавязковай умовай вярнуць «жар». У заклад гаспадар пакідаў сабе якую-небудзь рэч суседа[2].

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Столінскі раён Брэсцкай вобласці ў 1980 г.

[2] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 329.



Печ з в. Агароднікі, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Пачатак XX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

Паўсюдна на Беларусі бытавала павер'е, што гаспадар які падчас свят дае агонь, будзе мець страты ў гаспадарцы. Па звестках Ю. Ф. Крачкоўскага, у Гродзенскай губерні лічылася, што разам з пазычаным агнём да даўжніка быццам бы пераходзіў і паспяховы рост хлеба[1]. З гэтай самай прычыны «парадзіха на працягу дзевяці тыдняў не пазычала агню з хаты». Апытанне інфарматараў з нагоды сэнсавага значэння дадзенага звычаю ў іншых рэгіёнах выявіла наступнае: «нікому не давай агню, а то дзіця будзе недаўгавечным» (в. Маргавіца Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці); «суткі нічога не давалі, каб дзіця плаксівым не было» (в. Цна Лагойскага раёна Мінскай вобласці); «не давалі агню, каб адзежа хутка не рвалася» (в. Вароўскае Барысаўскага раёна Мінскай вобл.)[2]. Па меркаванні Д. К. Зяленіна, у аснове ўсіх гэтых абмежаванняў ляжалі вельмі старажытныя магічныя ўяўленні аб нечысціні родаў і неабходнасці магічнага ачышчэння.

Тыя самыя ўяўленні аб «сямейным агні» можна бачыць і ў звычаі пры пераходзе ў новаё жыллё забіраць з сабою агонь са старой хаты; замест агню можна было ўзяць галавешку ці нават качаргу, чапялу ці іншую прыладу печкі. Згодна з матэрыяламі П. В. Шэйна, «калі ў новую хату перасяляецца ўся сям'я, то галава сям'і накладвае гарачых вугалляў у гаршчок і нясе яго ў новую хату, – следам за ім ідзе ўся яго сям'я, якая вязе астатнія хатнія рэчы, посуд. Увайшоўшы ў хату гаспадар абносіць гаршчок з вугаллем уздоўж сцен і, прыпыняючыся ў кожным куце, ставіць яго на «прыпечак» і запальвае агонь у печцы»[3]. Характэрна, што з усіх функцый печкі выдзяляецца прыгатаванне ежы, якое мела ярка выражаны рытуальны характар, прычым гэта адносілася да прыгатавання не толькі абрадавых, але і штодзённых страў. Гэты працэс суправаджаўся рознымі прыкметамі: пры выпечцы хлеба, прыгатаванні кашы сачылі, у які бок адхіляюцца вярхушкі хлябоў ці з гаршка выходзіць каша: калі ўнутр печкі – гэта прыбытак, поспех, шчасце, калі да вусця – да беднасці. Перад тым як паставіць у печ велікодныя булкі («паскі»), выграбалі на прыпечак вугалле і попел ад яго захоўвалі да таго часу, пакуль не пачнуць садзіць капусту. Попелам пасыпалі капусныя градкі, каб зберагчы капусту ад «папільніцы» (капуснай тлі)[4].

Такім чынам, працэс прыгатавання ежы звязаны з усім комплексам рытуальна-гаспадарчай дзейнасці чалавека, уключаючы земляробства, догляд за свойскай жывёлай і г. д.

У XIX ст. сярод сялян было распаўсюджана павер'е, што печ дапамагае пазбавіцца чалавеку ад самых розных захворванняў. У беларусаў існаваў звычай ачышчаць («палаць») дзіця, якое крычала ў сне, пры дапамозе агню.

Прычынай крыку лічылі «начніц» – маленькіх злых духаў. У гэтых выпадках дзіця клалі ў прыпол

[1] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 92.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Докшыцкі раён Віцебскай вобласці ў 1981 г. ; у паўночныя раёны Мінскай вобласці ў 1987 г.

[3] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 323–324.

[4] Нароўская А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX – пачатак XX ст.). С. 19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Калыска з капшуком. З в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

спадніцы і раскачвалі перад спецыяльна запаленым агнём печкі, пры гэтым казалі замову[1]. Падчас палявых экспедыцый аўтарам зафіксаваны і іншы спосаб ачышчэння дзіцяці ад начных «крыксаў». Так, па звестках А. Д. Камковай (1890 г. н., жыхаркі в. Боханы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці): «…дзеля гэтага трэба было ўзяць крайчык аржанога хлеба, загарнуць у белую анучачку ды перавязаць чырвонай ніткай; пагладзіць вузельчыкам дзіцёнка па галоўцы ды кінуць у падпечак, а потым тры разы падпечку пакланіцца»[2]. Агнём лячылі і іншыя дзіцячыя хваробы: «прысік» – прышчы на целе і «вогнік» – плямы на твары. Самі гэтыя хваробы разглядалі, як пакаранне за непавагу да агню.

Такім чынам, печ выкарыстоўвалі пры лячэнні ад самых розных захворванняў, дзякуючы распаўсюджаным уяўленням аб ачышчальных якасцях агню. З печчу суадносіліся і павер'і, звязаныя са свойскай жывёлай. Напрыклад, шворку, на якой купленую жывёлу прывялі да хаты, вешалі ў печцы. А калі са двара сыходзіла скаціна, збягала сабака ці чалавек спазняўся дадому, то іх клікалі праз пячны комін: лічылі, што той, хто заблукаў, пачуе «па дыму» кліч і хутка вернецца дахаты. Каля коміна казалі замовы і заклінанні. Так, у Гродзенскай губерні са следу злодзея здымалі мерку і вешалі яе ў комін, «каб злодзей высах, як гэтая мерка»[3]. Цікавыя звесткі аб магічнай сіле коміна мы атрымалі падчас экспедыцыі на Панямонне. Па словах А. Т. Дземянчук (1908 г. н., жыхаркі в. Ракевічы Навагрудскага раёна), «праз комін» лячылі людзей і скаціну. Дзеля гэтага да пляшкі з вадой прывязывалі шворку і тры разы працягвалі праз комін[4].

Печ фігуравала і ў радзінных абрадах. Так, па звестках М. Е. Сапегі (1911 г. н., в. Бракава Слабада Чавускага раёна Магілёўскай вобласці), «дзіцячае

[1] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка… Т. 3. С. 324.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Хоцімскі раён Магілёўскай вобласці ў 1988 г.

[3] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 204.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці ў 1987 г.

месца» пасля нараджэння дзіцёнка закопвалі пад печчу, каб было пры бацьках»[1]. З гэтай жа мэтай, «каб дзіця любіла сваю хату і пільнавалася яе, кума ахрышчонае дзіця, як прынясе ў хату, абносіць тройчы кругом стаўпа печы, пакалыша перад чалешнікам і тады аддае маці»[2].

З печкаю было звязана і шмат іншых магічных абрадаў. Так, у в. Пагост Вілейскага раёна Мінскай вобласці, павітуха з хлопчыкам на руках бралася за печку з мэтаю магічна забяспечыць яму ў будучым здольнасць авалодаць майстэрствам печніка. А калі народзіцца дзяўчынка, «то кума клала дзяўчынку на загнёт, каб яна «пільнавала» печы, як гэта павінна рабіць добрая гаспадыня»[3].

Такім чынам, мяркуючы па багатым этнаграфічным матэрыяле і экспедыцыйных даных, з печчу і прасторай вакол яе ў беларускага селяніна было звязана ўяўленне аб лёсе і шчасці, дабрабыце.

Печ займала выключнае месца ў вясельных абрадах і звычаях беларусаў. Па звестках А. Сержпутоўскага, на Палессі: «Як сваты першы раз прыдуць да дзеўкі, то яны, увайшоўшы ў хату, трохі сутрымоўваліся каля печы ды й ціхенька казалі – печ, печ памажы, – потым ужо казалі дабрыдзень, ды праходзілі да стала» (в. Калкі)[4]. Згодна са звычаем у Касцюковіцкім раёне перад прыходам сватоў, нявеста залазіла на печку. У выпадку нязгоды выйсці замуж, яна злазіла з печкі і пачынала месці хату ад стала да дзвярэй. Калі ж была згодная выйсці замуж, то мяла наадварот.

У Нараўлянскім раёне Гомельскай вобласці калі жаніх прыходзіў са сватам, то жаніх заставаўся стаяць каля печкі, а сват ішоў на сярэдзіну хаты і казаў: «Мы ж не гуляць прыйшлі, а ў сваты зайшлі». Па звычаі нявеста перад гэтым лезла на печ, калі яна спускалася з печы, то гэтым выказвала сваю згоду на шлюб, гатоўнасць пакінуць бацькоўскую хату і перайсці ў дом жаніха[5].

Вялікае значэнне ў вясельнай абраднасці меў пячны слуп. Рэшткі архаічных вераванняў, звязаных з пячным слупом, захаваліся ў беларускай традыцыі, дзе ён называўся «дзедаў слуп», «конеў слуп» ці проста «конь». Слуп («стоўп») размяшчаўся каля печкі і ў старажытнасці быў адначасова і ахвярнікам, і тым свяшчэнным месцам, на якое станавіўся жрэц ці іншы выканаўца абрадаў[6]. Цікавы абрад быў зафіксаваны П. В. Шэйнам у в. Дворцы Рагачоўскага павета былой Магілёўскай губерні: «Калі малады прыязджаў пасля вянца са свайго дома за маладой, у хаце ўсе месцы за сталом былі занятыя. Малады вяртаўся ў панадворак, сядаў у павозку і пасылаў свата з біклагаю гарэлкі. Тут і адбываўся архаічны абрад. Маці маладой сядзела босая на пячным «стаўпе». У чаканні свата яна пляла лапці, сват даваў ёй рубель «на боты» альбо гатовыя боты. Атрымаўшы падарунак, маці злазіла са слупа, абувалася і ішла за жаніхом»[7].

Існавалі і іншыя цікавыя абрады. Так, у апісанні з Барысаўскага павета згадвалася, што дружка жаніха, увайшоўшы ў хату, адзін пірог клаў на «стоўп каля печкі», а другі – на стол насупраць печкі, «на покуці». У апісанні з Віцебшчыны хросны бацька, які сядзеў на куце, падчас выканання «стаўбавой» песні адзін пірог клаў на бажніцу, а другі кідаў запявалу, які сядзеў на «стаўпе»[8].

Устойлівае дыяганальнае размяшчэнне «покуць – печ» толькі падкрэслівае іх сувязь. Характэрна, што некаторыя абрады маглі адбывацца як каля печкі, так і на покуці (напрыклад, далучэнне нявесты да дома жаніха ў вясельным абрадзе і г. д.).

З печчу звязаны і ўяўленні аб лесе. Маладая, пакідаючы бацькоўскі дом, ужо сеўшы на воз разам з мужам, пачынала прычытаць:

«…Добрая доля, ды ідзі за мной
З печы пламенем, з хаты камінам»[9].

Са старажытным культам агню быў звязаны ў беларусаў абрад «жаніцьба коміна», які святкавалі 1 верасня (дзень Сімяона Стоўпніка). Абрад заключаўся ў тым, што «комін» бялілі, упрыгожвалі, запальвалі на каганцы агонь і кідалі ў яго кавалачкі сала ці масла, каб весялей гарэў: «Гэта яму святочнае частаванне», – казалі сяляне (Бабруйскі павет)[10]. У дзень свята гатавалі смачную вячэру. Стол накрывалі святочным абрусам і прысоўвалі яго да печкі. Як толькі цямнела, вакол яго садзілася ўся сям'я,

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.

[2] Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 155.

[3] Тамсама.

[4] Тамсама. С. 175.

[5] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Нараўлянскі раён Гомельскай вобласці ў 1981 г.

[6] Никольский Н. М. Происхождение и истории белорусской свадебной обрядности. Минск, 1956. С. 172.

[7] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 1, ч. 2. С. 366–374.

[8] Тамсама. Т. 2. С. 229–231.

[9] Потебня А. А. О доле и сродных с нею существах. Харьков, 1914. С. 207.

[10] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 330.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і пачыналася частаванне; выпіваючы па чарзе, кожны вылівае на комін апошнія кроплі гарэлкі і звяртаўся да яго з добрымі пажаданнямі. Пасля вячэры гаспадыня прыносіла пачастункі, а моладзь спявала хорам жаніху-коміну вясельную песню. Гэты абрад бытаваў і ў іншых месцах Беларусі[1], у ім можна бачыць перажытак ахвярапрынашэння агню ці хатняму ачагу.

Такім чынам, як паказаў аналіз літаратурных крыніц і этнаграфічных даследаванняў, праведзеных у час экспедыцый, з печчу і прасторай каля яе ў беларускага селяніна было звязана ўяўленне аб лёсе і шчасці.

Выразна бачна сувязь з печчу і агнём як жыццёвым пачаткам у пахавальнай абраднасці. Калі чалавек паміраў, адчынялі юшку коміна, яна разглядалася селянінам як «шлях да душы». Сэнс гэтага старажытнага звычаю, на наш погляд, непасрэдным чынам звязаны са значэннем дарогі ў жыцці старажытных славян. Такім чынам, комін з'яўляўся звязуючым шляхам з вонкавым светам і адначасова месцам, адкуль чалавек чакаў варожых сіл, як бачных, так і нябачных.

«Чалеснік» печы і пячное начынне беларусы таксама надзялялі магічнай сілай. Так, па звестках інфарматараў з в. Бракава Слабада Чавускага раёна Магілёўскай вобласці, прыйшоўшы ў дом нябожчыка, браліся за «чапялу», «качаргу», а вяртаючыся пасля пахавання ў хату, браліся за «чалеснік» печы, каб не баяцца нябожчыкаў і засцерагчы сябе ад пагібельнага ўплыву смерці[1]. У гэтых звычаях робіцца акцэнт на прыналежнасць «чалесніка» печы і пячнога начыння да стыхіі агню, што робіць іх магічным сродкам ад смерці.

Пячное начынне па гэтай жа прычыне разглядалася беларусамі як магічны сродак у барацьбе з «нябеснай» вадой. Універсальным сродкам для папярэджвання і спынення граду, дажджу ці буры з'яўлялася выкідванне на вуліцу пячных прылад: качаргі, чапялы, хлебнай лапаты, дзежкі, патэльні. Так, па звестках А. Е. Красакова (1904 г. н., жыхара в. Аляксандраўка Кармянскага раёна Гомельскай вобласці), «каб град скончыўся, выкідывалі з хаты крыж накрыж хлебную лапату і памяло»[2]. У Хойніцкім раёне, каб навальніцы не было, выстаўлялі на вуліцу дзяжу. У в. Кіраў Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці, каб спыніць моцны дождж, адчынялі комін. Аналагічныя звычаі па спыненні граду і дажджу зафіксаваны ў Хойніцкім раёне Гомельскай вобласці[3].

Падчас палявых даследаванняў былі зафіксаваны дзеянні з лапатай і ў самім інтэр'еры жылля. Так, у в. Олтуш Маларыцкага раёна, каб у хату не трапіла маланка, білі крыжападобна лапатай па сцяне хаты. Часта рытуальнае спыненне града таксама рабілася хлебнай лапатай разам з іншымі прадметамі інтэр'ера: чапялой, віламі, венікам, дзяжой, настольнікам, патэльняй, абразом. Бытавалі і іншыя варыянты. Па словах З. М. Барсуковай (1919 г. н., жыхаркі в. Цна Лагойскага раёна Мінскай вобласці), «каб гразы не было, хлебную лапату выкідвалі ва двор, а на акно ставілі абразы»[4].

Такім чынам, абрадавыя дзеянні, звязаныя з печчу, у многіх выпадках былі абумоўлены захаванасцю перажыткаў язычніцкіх вераванняў, пра што сведчаць рытуальныя дары-ахвярапрынашэнні ў выглядзе частавання коміну, ахвярапрынашэнні пячному слупу, задабрыванні «дзядоў» і дамавіка і інш.

**Дзверы і вокны ў абрадах беларусаў.** Семіятычнае значэнне ўваходу ў жыллё і вокнаў вельмі вялікае. Наяўнасць уваходу і выхаду – неабходная ўмова для захавання домам свайго статусу. Асаблівасць сімволікі дзвярэй і акон тлумачыцца, хутчэй за ўсё, тым, што яны знаходзяцца на мяжы жылой і нежылой прасторы.

Згодна з этнаграфічнымі крыніцамі існуюць два віды сувязі дома з вонкавым асяроддзем: рэгламентаваны (уваход/выхад праз дзверы) і нерэгламентаваны (праз акно, комін і г. д.). Напрыклад, памерлага выносілі праз акно. Асаблівае значэнне надавалася запорам, якія прызначаны рэгламентаваць сувязь з вонкавым светам. На ўсёй тэрыторыі Беларусі было распаўсюджана павер'е, што на святы нячыстая сіла можа нашкодзіць людзям, а пачынаючы з пярэдадня Купалля вядзьмаркі былі небяспечнымі на працягу цэлага тыдня. Асаблівую моц, па меркаванні беларусаў, яны набывалі пасля захаду сонца. Таму існавала цэлая сістэма сімвалічных спосабаў ачышчэння: абломкі касы, нож або чацвяр-

[1] Шейн П. В. Женитьба комина // Этногр. обозрение. 1898. Т. 38, № 3. С. 152–160.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.

[3] Нароўская А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX – пачатак XX ст.). С. 25.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у паўночныя раёны Мінскай вобласці і Докшыцкі раён Віцебскай вобласці ў 1987 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Сёмуха. Святочны інтэр'ер. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

говую свечку ўтыкалі ў шчыліну парога ці вушака. У паўднёва-заходніх раёнах Палесся і на Панёманні над дзвярыма і аконнымі вушакамі крэйдай альбо сажай ад свечкі пісалі пачатковыя літары імён трох каралёў (К+М+В) з крыжыкамі. Адносна значэння гэтага Я. Л. Кахновіч (1907 г. н., жыхарка в. Лядск Шчучынскага раёна) патлумачыла, што такім чынам людзі адганялі нячыстую сілу[1]. Ёсць звесткі і пра тое, што беларусы імкнуліся прынесці чацвярговую свечку яшчэ цёплаю з царквы і выліць пры дапамозе яе крыжы на верхняй перакладзіне дзвярэй. Да парога ці вушака прыбівалі з гэтай жа мэтаю знойдзеную конскую падкову.

Над вокнамі і дзвярыма дзеля аховы жылля ад злых сілаў на ўсёй тэрыторыі Беларусі развешвалі крапіву і палын. Па звестках Ю. Ф. Крачкоўскага, у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні дзеля засцярогі над аконнымі і дзвярнымі праёмамі развешвалі сплеценыя з зелені вянкі. Усім дзеянням каля ўваходу прыпісвалася высокая ступень семіятычнасці. Самая простая іх інтэрпрэтацыя звязана з прасторава-часовым процістаяннем «пачатак – канец» знаходжання ў жыллі. Характэрным спосабам маркіравання пачатку (уваходу) і канца (выхаду) з'яўляецца прыпынак перад парогам дома, які часта суправаджаецца кароткаю малітваю і звычаем прысесці перад дарогаю. У сітуацыі выпраўлення ў дарогу рэгламентуюцца нават вербальныя паводзіны. М. Я. Нікіфароўскі пісаў, што «апошнія словы падарожніка да дамачадцаў могуць быць толькі перад парогам жылля ды з экіпажа. Перагаворвацца праз парог ці глядзець па кутах ён не павінен, таму што будуць шматлікія паломкі вупражы ды й экіпажа»[2]. Вялікая роля парога і ў этыкетных сітуацыях. Цікавыя звесткі былі зафіксаваны ў этнаграфічных экспедыцыях у Гомельскай вобласці: «Ніколі не вітайся цераз парог, бо з тым чалавекам хутка пасварышся»[3]. «Госця сустракай перад парогам і пускай наперад сябе. Праз парог рукі не падаюць»[4]. Калі ж не прытрымлівацца правілаў, гэта можа прывесці да непажаданых вынікаў.

У вясельных абрадах існавалі пэўныя абавязковыя прадпісанні. Напрыклад, складаны абрад пераходу праз парог удзельнікаў вяселля зафіксаваны ў Віцебскай губерні: згодна з этнаграфічнымі апісаннямі М. Я. Нікіфароўскага, жаніх абавязкова павінен быў прыступам узяць спачатку вароты, а потым і дзверы хаты маладой. П. Шэйн пісаў: «У Барысаўскім павеце часам жаніха пускаюць мірам, а часам дружына жаніха выбівае дзверы хаты сілаю»[5]. У Пінскім павеце Мінскай губерні пры сустрэчы каля парога жаніха будучай цешчай адзін з хлопцаў з боку маладой страляе ў жаніха халастымі зарадамі з ружжа, а ў другім апісанні з тых самых мясцін апавядаецца, што калі жаніха не ўпускаюць каравайніцы нявесты, то ён разам са сваёю дружынаю ўрываецца ў хату сілаю[6].

Узламванне дзвярэй акрамя беларусаў сустракаецца ў эстаў, стральба каля парога з ружжа – у рускіх Поўначы[7]. Асабліва паказальнымі з'яўляюцца абрады, звязаныя з парогам, пры радзінах і пахаванні, калі ў першым выпадку маркіруецца пачатак жыцця чалавека, асваення ім жылой прасторы, а ў другім – канец жыцця, развітанне з домам.

Міфалагізацыя мяжы праяўляецца і ў рытуальных дзеяннях, якія суправаджаюць нараджэнне дзіцяці (адмыканне ўсіх дзвярэй, у тым ліку і «царскай брамы» ў царкве пры цяжкіх родах, адмыканне замкоў, развязванне ўсіх вузлоў, пасыпанне дарогі каля

[1] Нароўская А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX – пачатак XX ст.). С. 27.

[2] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 121.

[3] Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 118.

[4] Даль В. И. Толковый словарь живого великорусского языка. М., 1978. Т. 3. С. 319.

[5] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 156.

[6] Быковский А. Свадебные обряды и песни в Пинском уезде Минской губернии // Памят. кн. Вилен. Генерал-губернаторства. СПб., 1868. С. 70.

[7] Сумцов Н. Ф. О свадебной обрядности. С. 14, 15, 17; Тизик К. Свадебные обычаи эстов Ристинского прихода // Этногр. обозрение. 1892. Кн. 12, № 1. С. 157.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

парога соллю і г. д.). Пры цяжкіх родах бабка-павітуха шукае шчаслівае месца, водзіць дзеля гэтага парадзіху па розных месцах хаты, у сенцы, хлеў, гумно; а для паскарэння і аблягчэння родаў вымае з вушэй завушніцы, здымае пярсцёнкі, адмыкае ў куфрах замкі і адчыняе ўсе дзверы. А калі жанчына доўга пакутуе, то бабка праводзіць яе тройчы праз парог. Сыходзячы са звестак А. М. Семянтоўскага, у Віцебскай губерні пасля хрышчэння, дзіця прыносіла ў хату бацькоў кума; яна клала яго каля парога хаты, адкуль яго браў на рукі кум і, перадаючы маці, казаў: «Бралі ў Вас дзіця народжанае, а аддаём малітвяна і хрышчонае; дай Божа шчоб расло, ды й шчаслівым было»[1].

Такім чынам, «асвяшчэнне» дзіцёнка праз парог павінна было далучыць яго да дома, прынесці шчасце. З гэтым комплексам уяўленняў суадносіцца звычай захавання пад парогам «дзіцячага месца» (паследу) пасля нараджэння дзіцяці. Так, па звестках А. Т. Дземянчук (1908 г. н., жыхаркі в. Ракевічы Навагрудскага раёна), «дзіцячае месца» дзяўчынкі закапвалі ў парозе, каб хутка і шчасліва замуж выйшла, а хлопчыка – пад «покуццю», каб быў «на котлішчы»[2]. Па даных В. М. Гурынай (1919 г. н., жыхаркі в. Волкавічы Навагрудскага раёна), «дзіцячае месца, каб былі дзеці, закапвалі пад парогам ліцом, а калі жанчына не хоча больш мець дзяцей, то ніцма»[3].

Неабходна адзначыць, што нягледзячы на тое, што дзверы і вокны з'яўляюцца элементамі хаты, яны звязаны з катэгорыяй небяспечнага, вонкавага, варожага чалавеку. Таму парог, дзверы надзяляюцца зместам, характэрным для аб'ектаў вонкавага сьвету.

Актуалізацыя мяжы, у прыватнасці парога, пры хваробах звязана з уяўленнямі аб лакалізацыі прычын хваробы па-за межамі дому. Напрыклад, адзін са сродкаў супраць радыкуліта заключаўся ў тым, што рубілі бярозавы венік на парозе. Пры замове вады ад болю ў страўніку ставілі ваду на парог, потым насыпалі крыж-накрыж соль і, перамешваючы нажом, казалі словы замовы.

Мяркуючы па матэрыялах А. Сержпутоўскага, «як толькі чалавек памрэ, хутчэй на вокны ставяць чаркі, або шклянкі з чыстаю вадою, каб душы было дзе памыцца»[4]. У шэрагу рэгіёнаў ставілі ваду на вакно і яна стаяла на працягу 40 дзён, каб душа ў цяжкі час магла зайсці і пакупацца, «каб чалавеку лягчэй было».

Такім чынам, праз акно адбывалася сімвалічная сувязь са светам памерлых. Аб гэтам сведчаць і іншыя даныя, напрыклад, «каб чалавеку лягчэй было паміраць, трэба прыадчыніць дзверы і вокны, а яшчэ лепей адчыніць комін, каб зрабіць дзірку, праз якую душа выходзіць»[5]. Гэта пацвярджаецца і іншымі этнаграфічнымі матэрыяламі. Так, у дзень памінання продкаў гаспадар адчыняў вокны і адтуліну ў столі («душнік»), праз якія павінны былі прылядець душы. Пры гэтым гаспадар запрашаў дзядоў са словамі: «Святыя дзяды, завём Вас, Святыя дзяды хадзіце да нас. Ёсць тут усё, што Бог даў, што я для Вас ахвяраваў, чым толькі хата багата. Святыя дзяды просім вас, хадзіце, ляціце да нас»[6]. Мяркуючы па даных Ю. Ф. Крачкоўскага, на вясеннія «дзяды» пасля вячэры гаспадар вымятаў жыллё і выганяў такім чынам душы: «А киш, киш, душечка! Котора старша и больша та дверьми, а котора меньше, окнами» (в. Верхавічы Слонімскага павета Гродзенскай губерні)[7].

У шэрагу рэгіёнаў, калі паміраў чалавек, вывешвалі ручнік, як шлях, па якім павінны падымацца душы. У Драгічынскім раёне Брэсцкай вобласці калі паміраў чалавек, то тарцовае і фасаднае вокны завешвалі фартухамі, у Баранавіцкім раёне – посцілкай («дзяружкай»). Па звестках А. А. Буцэнка (1919 г. н., жыхаркі в. Боруцк Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці), «кутнае акно напалову запіналі настольнікам, які пры пахаванні клалі ў труну»[8].

Непасрэдная сувязь акна з іншай прасторай бачна і ў забароне выліваць у адчыненае акно ваду, пляваць, выкідываць косці, выпускаць кошку і г. д., таму што, па ўяўленнях беларусаў, там стаяў анёл, які пры гэтым мог сысці. Паведамленні, атрыманыя праз акно, надзяляліся спецыфічным значэннем. Як правіла, яны звязаны з пераменамі ў жыцці чалавека, які пачуў іх. Можна прыгадаць напярэдадні свят: «Усё, што пачуеш пад акном, таго і чакай».

1 Сементовский А. М. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбах и похоронах // Памят. кн. Витеб. губ. на 1865 г. СПб., 1865. С. 78.

2 З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці ў 1987 г.

3 Нароўская А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX – пачатак XX ст.). С. 29.

4 Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 208.

5 Тамсама.

6 Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 1, ч. 2. С. 596.

7 Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 122.

8 Нароўская А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX – пачатак XX ст.). С. 31.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Такім чынам, вокны і дзверы мелі высокі семіятычны статус. Асаблівасць сімволікі дзвярэй і акон тлумачыцца, хутчэй за ўсё, тым, што яны знаходзяцца на мяжы жылой і нежылой прасторы, суадносяцца з ідэяй уваходу, пранікальнасці, сувязі жылля з вонкавым светам. Адсюль вынікае існаванне сістэмы сімвалічных спосабаў ачышчэння і засцярогі ад пранікнення варожых сіл у жыллё.

## Лакальныя асаблівасці інтэр'ера традыцыйнага беларускага жылля

Пры даследаванні інтэр'ераў беларускага народнага жылля дакладных межаў паміж выдзеленымі гісторыка-этнаграфічнымі рэгіёнамі па поўным комплексе прадметаў інтэр'ера правесці практычна немагчыма. Таму пры выяўленні своеасаблівасці інтэр'ера асобных зон разглядалася па магчымасці сукупнасць прыкмет таго ці іншага прадмета інтэр'ера: форма печы, яе прапорцыі, зрубная або слупавая аснова, вынас вусця, наяўнасць прыступкі лежака («зачынак», «пяколак», «прымурак»), «пола», палацяў, лаў і метад іх мацавання, выгляд калысак і спосаб іх мацавання, тып асвятляльных прыстасаванняў, кампазіцыйная расстаноўка мэблі, тэрміналагічныя абазначэнні, дынаміка інавацыйных асаблівасцей. Распрацаваная тыпалогія дае магчымасць і падставы вызначыць лакальныя арэалы існавання прадметаў інтэр'ера на тэрыторыі Беларусі.

Як паказала картаграфаванне, праведзенае беларускімі этнографамі, да сярэдзіны XIX ст. на тэрыторыі Беларусі пераважалі глінабітныя на драўлянай аснове печы без коміна («курныя»). Нанясенне месцаў бытавання такога тыпу печаў на карту выявіла, што ў сярэдзіне XIX ст. яны былі шырока распаўсюджаны ў паўднёва-заходніх раёнах Брэсцкай вобласці, на Гродзеншчыне, у паўднёвых раёнах Віцебскай вобласці (Пастаўскі, Лепельскі, Віцебскі, Сенненскі) і на большай частцы Магілёўшчыны (за выключэннем паўднёва-заходніх раёнаў). Белыя печы ў дадзеным арэале альбо адсутнічалі, альбо сустракаліся вельмі рэдка. Такія печы ў пазначаны перыяд пераважалі на тэрыторыі Мінскай і Гомельскай абласцей (за выключэннем Кастрычніцкага і Жлобінскага раёнаў).

У выніку аналізу палявых і архіўных матэрыялаў выяўлена зона распаўсюджання слупавай асновы печы, якая ахоплівае шырокую тэрыторыю: Брэсцкая, Гродзенская (за выключэннем Навагрудскага, Дятлаўскага, Карэліччскага раёнаў), паўночныя раёны Мінскай вобласці, Магілёўская вобласць і паўночна-ўсходнія раёны Гомельскай вобласці. На аснове картаграфавання слупавай асновы вызначана асаблівасць яе існавання – канцэнтрацыя ў зоне Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцей і паступовае змяншэнне па меры прасоўвання з усходу і захаду на поўнач. Зрубная аснова атрымала шырокае распаўсюджанне ў паўночных раёнах Гомельскай вобласці (за выключэннем паўночна-ўсходніх раёнаў), цэнтральнай частцы Беларусі і на Віцебшчыне.

Характар інтэр'ера паўночнай паласы Беларусі дазваляе вылучыць некалькі лакальных тыпаў печаў, умоўна названых Докшыцкім, Пастаўска-Браслаўскім, Полацка-Віцебскім.

Лакальны тып печаў Докшыцкага арэала назіраецца ў межах шырокай зоны, якая даходзіць на ўсходзе да Віцебскага раёна, на поўначы праходзіць за Докшыцамі, на захадзе даходзіць да Маладзечанскага раёна, паўднёвая мяжа праходзіць па днепра-дзвінскім водападзеле на поўнач ад Барысава і Лагойска. Для гэтага арэала характэрны печы буйных памераў на драўляным апечку. Размяшчэнне коміна, як правіла, асіметрычнае, ён ссунуты ў бок альбо жылля, альбо сенцаў. У выніку адна з яго граняў набывае ступеньчаты характар. Асаблівасцю інтэр'ера з'яўляецца наяўнасць шырокай бакавой прыступкі лежака («ляnуха», «зачынак», «пяколак», «прымурак») і драўлянай бакавой лавачкі, убудаванай у печ («Каб лёгка на печ ускочыць і плечы пагрэць»)[1]. Аналіз палявых матэрыялаў паказвае, што ў Крупскім, Барысаўскім, Лагойскім, Смалявіцкім, Вілейскім, Маладзечанскім раёнах паўсюдна ў печах рабілі «падпрыпечкі» для захоўвання посуду. У Барысаўскім раёне ў печы рабілі нават два «падпрыпечкі»: адзін вузкі для захоўвання патэльняў, другі шырокі для захоўвання гаршкоў. У адрозненне ад паўночна-заходніх раёнаў Віцебскай вобласці, у Докшыцкім арэале печы будавалі з камінкамі. З дадатковых ацяпляльных збудаванняў у паўднёвых раёнах Віцебскай вобласці (Докшыцкі, Лепельскі, Чашніцкі, Сенненскі) і паўночнай частцы Барысаўскага, Лагойскага, Вілейскага раёнаў Мінскай вобласці існавалі грубкі-стаякі[2]. Але ўжо з прасоўваннем на поўнач арэала (памежжы Лепель-

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у паўночныя раёны Мінскай вобласці ў 1987 г.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Лепельскі, Чашніцкі раёны ў 1985 г., у Сенненскі раён Віцебскай вобласці ў 1984 г.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ




Распаўсюджанне печаў на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.: *1* – курная печ; *2* – печ з комінам (*а* – пераважае, *б* – бытуе, *в* – сустракаецца)




Распаўсюджанне печаў на слупавай і зрубнай аснове на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.: *1* – слупавая; *2* – зрубная

скага і Ушацкага раёнаў) яны змяняюцца шчыткамі з ляжанкамі[1]. Мяркуючы па экспедыцыйных даных, у Крупскім, Лагойскім, Барысаўскім, Смалявіцкім раёнах шырока бытавалі «печкі» з уманціраванымі плітамі, злучанымі металічным комінам з печчу. Па звестках інфарматараў, такія печкі з'явіліся ў пачатку XX ст. У 1920–30-я гг. такія печы ўжо былі шырока распаўсюджаны на поўначы Міншчыны. Так, напрыклад, у в. Мглё Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці у 1930 г. такіх печаў было 17 штук[2].

На захадзе Віцебшчыны выразна вылучаецца Пастаўска-Браслаўскі арэал, які па тыпу печаў з'яўляецца лагічным працягам Докшыцкага арэала. Падабенства адзначана шэрагам рыс: асіметрычным размяшчэннем коміна, наяўнасцю драўлянага апечча, падобнымі прапорцыямі, наяўнасцю «падпрыпечка». Але размяшчэнне печы, формы яе канструкцыйных дэталяў, вынас вусця, памеры прыступкі лежака даюць падставу казаць пра лакальныя асаблівасці Пастаўска-Браслаўскага арэала.

Своеасаблівасць печаў выяўляецца ў наступных прыкметах: у Мядзельскім, Пастаўскім, Браслаўскім, Мёрскім, Шаркаўшчынскім раёнах комін прамы і заўсёды шчыльна прымыкае да сцяны, якая падзяляе хату і сенцы. Адпаведныя адрозненні ба-



Печ з в. Волева, Дубровенскі раён Віцебскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Ушацкі раён у 1984 г. і Лепельскі раён у 1985 г. Віцебскай вобласці.

[2] Войтко М. На беразе Усяжы ракі // Наш край. 1930. № 3. С. 31

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Печ з в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Печ з в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Пачатак XIX ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

чым і ў тым, што печы не прымыкаюць тыльным бокам да глухой сцяны. У выніку паміж печчу і сцяной утвараецца невялікая ніша шырынёй 30–50 см («каб не было пажару»)[1]. Пячная пляцоўка злучаецца са сцяной драўляным насцілам. У адрозненне ад паўднёвых раёнаў Паазер'я бакавая приступка печы вузкая («на адну цаглінку»)[2]. Асаблівасцю арэала з'яўляецца наяўнасць шырокай, на 2–3 дошкі, бакавой лавачкі («палка»), убудаванай у печ. Па словах П. І. Кодак (1900 г. н., жыхаркі в. Мястэчка Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці), «такія палкі раней былі ва ўсіх».

З дадатковых ацяпляльных збудаванняў у выдзеленым арэале зафіксаваны «шчыткі». Па даных А. М. Махніст (1904 г. н., жыхаркі в. Баяры Мядзельскага раёна), шчыткі існавалі ўжо ў пачатку XX ст., і яна памятае са слоў свайго бацькі: «у іх хаце быў пабудаваны шчыток у канцы 90-х гг. XIX ст.». Палявыя даследаванні паказалі, што ў адрозненне ад астатніх рэгіёнаў печы і шчыткі злучаліся комінам, які ляжаў на зямлі (вёскі Баяры, Лотва Мядзельскага раёна, Мястэчка Пастаўскага раёна, Гірэйшы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці і інш.)[3]. Пра гэта сведчаць таксама архіўныя матэрыялы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору[4].

Нярэдка грубка («шчыток») прыбудоўвалася непасрэдна да печы. У сувязі з бакавым прымыканнем «шчытка» фасад печы быў выцягнуты ў падоўжным кірунку. На рагу печы стаяла калодка з уваткнутай сякерай («каб падсекчы дроў»).

Прыкметна вылучаюцца печы паўночных раёнаў Віцебшчыны. Арэал полацка-віцебскіх печаў ахоплівае правы бераг Заходняй Дзвіны і мае шэраг своеасаблівых рыс. Для Полацка-Віцебскага арэала характэрны два варыянты размяшчэння печаў. Першы варыянт, калі печы не прымыкалі да сцяны, якая падзяляла хату і сенцы. У такім выпадку, калі печ стаяла каля дзвярной сцяны, яна не прымыкала да глухой сцяны. Дзякуючы размяшчэнню печы з водступам ад дзвярной або бакавой глухой сцяны на адлегласці 1–1,5 м за печкай атрымліваўся закут («запечча», «запечак»), які выкарыстоўваўся ў якасці кладоўкі для адзення або спальні для дзяцей. Мяркуючы па звестках старажылаў, такое месцазна-

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Пастаўскі раён Віцебскай вобласці ў 1982 г.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Мядзельскі раён Мінскай вобласці ў 1980 г.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Браслаўскі раён Віцебскай вобласці ў 1984 г., у Мядзельскі раён Мінскай вобласці ў 1980 г., у Пастаўскі раён Віцебскай вобласці ў 1982 г.

[4] АІМЭФ. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 185, 187.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Печ у інтэр'еры жылля. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

ходжанне печы ў вылучаным намі арэале прынята з даўніх часоў. У адрозненне ад пастаўскага арэала, ужо пачынаючы з паўночнай часткі Мёрскага раёна (вёскі Слабада, Сакольшчына, Узмены, Даўгінава) і далей з прасоўваннем на ўсход вобласці (Верхнядзвінскі, Расонскі, Полацкі, Шумілінскі, Гарадоцкі, Віцебскі раёны) печы мелі вельмі шырокі бакавы выступ (значна шырэйшы, чым у Докшыцкім арэале) – ляжанкі («лянуха», «пяколак»).

Як паказала картаграфаванне, у паўночных раёнах Віцебшчыны ў адрозненне ад Докшыцкага арэала печаў «з камінкамі» не будавалі. Мяркуючы па палявых матэрыялах, у падпеччы рабілі невялікі ўслончык, «лавачку». З дадатковых ацяпляльных збудаванняў у Віцебскім арэале зафіксаваны шчыткі. У адрозненне ад заходніх раёнаў шчыткі будаваліся, як правіла, з ляжанкамі.

Нягледзячы на тое, што шэраг канструкцыйных асаблівасцей печаў Віцебскага арэала дае падставу казаць аб існаванні тут у канцы XIX ст. пэўных рыс лакальнай адметнасці, адзінства печаў гэтай тэрыторыі з печамі Пастаўска-Браслаўскага і Докшыцкага арэалаў не выклікае сумненняў.

На тэрыторыі Мінскай вобласці значную агульнасць маюць печы Бярэзінскага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага раёнаў. Печы вылучанага арэала з'яўляюцца як бы пераходнай зонай паміж Докшыцкім і Магілёўскім арэалам і ўвабралі ў сябе канструкцыйныя элементы печаў як Віцебшчыны, так і Магілёўшчыны.

Для гэтага арэала характэрныя печы на высокім драўляным апеччы з выдзвінутым «прыпечкам» і высока размешчаным вусцем. Выступаючыя канцы падоўжных брусоў апечча, апрацаваныя простымі формамі кранштэйнаў, на якія абапіраецца сваім цяжарам шасток, надаюць печы маляўнічы выгляд. Комін нешырокі, размешчаны цэнтрычна і не прымыкае да сцяны, якая падзяляе хату і сенцы. Сценка коміна з боку сенцаў прамая, другая палогая і завяршаецца нешырокай пляцоўкай. Пячуркі размешчаны толькі ў пярэдняй сценцы печы, звычайна з боку ўваходу. Падпечча ў большасці выпадкаў размяшчалася ў бакавой частцы печы. Печ мела шырокі бакавы выступ лежака – ляжанку («прыморак») і драўляную бакавую лавачку, умацаваную на кранштэйнах, якія выходзілі з «апечча». З дадатковых ацяпляльных збудаванняў ва ўсходніх раёнах Мінскай вобласці існавалі грубкі і пліты.

На тэрыторыі левабярэжжа Дняпра быў выдзелены шырокі арэал печаў, які ахопліваў значную частку Магілёўшчыны (Магілёўскі, Чавускі, Быхаўскі, Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі, Крычаўскі, Мсці-

РЕПОЗИТОРИЙ



Печ з в. Бракава Слабада, Чавускі раён Магілёўскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слаўскі, Касцюковіцкі раёны). Для Магілёўскага арэала характэрныя буйнагабарытныя печы на драўляных слупах (дубовых або асінавых «штындарах», «калодках») з шырокім комінам, якія займаюць да ¼ плошчы жылля. Па звестках Е. Р. Раманава, «на гэтыя штандары накладывалі добра высечаныя драўляныя брусы, якія і былі першым вянком падмурка; змацоўваліся брусы так званым нямецкім вуглом, а вольныя канцы іх ўсякаліся ў сцены хаты, другі вянок клаўся зверху ўровень з першым, трэці вянец ўжо выступае ад зруба ў бок, што неабходна для запечка і «загнёта» печы; у зрубе падмурка рабілі акенца і паверх яго насцілалі таўстыя плахі, якія і ўтваралі падмурак печы» (Быхаўскі павет)[1]. Аналагічнае ўладкаванне «апечка», «запечка», усталяванага на «штындары», было характэрна для ўсяго арэала, што пацвярджаецца палявымі і архіўнымі матэрыяламі[2]. Звяртаюць увагу наступныя канструкцыйныя асаблівасці печаў: наяўнасць высокіх драўляных «запечкаў», моцна высунуты «загнёт», адсутнасць у вывучаемы перыяд «пыдзагнётка» і «камінкоў».

Экспедыцыйныя і літаратурныя крыніцы паказваюць, што жыллю Магілёўскага арэала ў канцы XIX – пачатку XX ст. з дадатковых ацяпляльных збудаванняў былі характэрныя грубкі з ляжанкамі. Фасад печы ў выніку бакавога прымыкання грубкі быў выцягнуты ў падоўжным кірунку. У пландроўцы «хата + хата» печ звычайна размяшчалася цэнтрычна, прымыкаючы задняй сцяной праз «нішу-схрон» да глухой сцяны, а вусцем да ўваходу. У заходніх і паўднёва-заходніх частках гэтага рэгіёну ў абедзвюх хатах ставіліся аднолькавыя печы, якія прымыкалі да раздзяляльнай сцяны. Гэта характэрна і для жылля тыпу «хата + сенцы + хата».

У інтэр'еры паўднёвай паласы Беларусі вылучаецца некалькі лакальных тыпаў печаў, умоўна названых Рэчыцка-Нараўлянскім і Кобрынскім. Лакальнай асаблівасцю Рэчыцка-Нараўлянскага арэала была печ на высокім драўляным апечны з «прывалакам» (шырокая лава, якая ляжала на двух бярвёнах, што выступалі з падруба). Печ займала каля 30% плошчы жылля, мела моцна высунуты «прыпечак». Пашыраны брусчаты падмурак печы надаваў устойлівасць масіўнай печцы, утвараючы ступенчаты пераход ад «пола» да корпуса печы. У гэтым арэале ўжывалася разнастайная фігурная кладка цэглы ў выглядзе «парэбрыкаў», «выпуску тычкоў» асобных цаглін на плоскасці (Рэчыцкі, Нараўлянскі, Брагінскі раёны). Комін быў прамы, нешырокі з выпушчанымі «парэбрыкамі» ў ніжняй частцы і верх-

[1] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 12–13.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён ў 1987 г., у Хоцімскі, Мстіслаўскі, Крычаўскі раёны Магілёўскай вобласці ў 1988; АІМЭФ, Ф. 6. Воп. 11. Спр. 533. Арк. 8; Ф. 6. Воп. 11. Спр. 529. Арк. 7 адв.

няй часткі «шыйкі» коміна. Жадаючы палепшыць цеплааддачу печы там, дзе гэта магчыма, пячнік стараўся паменшыць таўшчыню сценак печы. Для гэтага на паверхні печы рабілі рознай глыбіні і формы нішы, якія выкарыстоўваліся для разнастайных пабытавых патрэб. Ва ўсходнім арэале іх было асабліва шмат – гэта «пячуркі» і «душнікі» («Каб дух у хату шоў»)[1]. Спачатку такія нішы і адтуліны на плоскасці печы ствараліся выключна з практычных меркаванняў, таму іх форме і апрацоўцы не надавалася дастатковай увагі. Паступова гэтыя элементы набылі больш выразную форму, якая часта падкрэслівалася дадатковымі дэкаратыўнымі сродкамі. Як паказалі палявыя матэрыялы, у Рэчыцкім, Калінкавіцкім, Хойніцкім, Нараўлянскім раёнах цэнтр коміна нярэдка ўпрыгожвалі фігурнымі крыжападобнымі або авальнымі нішамі. Абавязковым элементам аздаблення печы было завяршэнне ў выглядзе карніза («брыжа»).

Для дадзенага арэала можна адзначыць асабліва шырокае распаўсюджванне «камінкоў». Як паказала картаграфаванне, з прасоўваннем на паўночны захад Гомельскай вобласці колькасць іх рэзка памяншалася. З дадатковых ацяпляльных збудаванняў у арэале існавалі грубкі, якія ставілі як разам з печчу, так і асобна. Грубкі з'явіліся ў пачатку XX ст.

Кобрынскі арэал ахоплівае значную частку Брэсцкай вобласці (Івацэвіцкі, Баранавіцкі, Ляхавіцкі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Пінскі, Столінскі, Лунінецкі, Кобрынскі, Пружанскі раёны).

Для традыцыйнага інтэр'ера Кобрынскага арэала характэрныя печы толькі на драўляных калодках. Комін трапецападобнай формы з выступаючым карнізам размешчаны цэнтрычна. Печ мела шырокі прыпек, дзе збоку каля сцяны рабілася ніша («ямка»), куды зграбалі гарачае вуголле. Яно захоўвалася тут гарачым на працягу сутак і служыла крыніцай агню. З другога боку прадпечча ў большасці выпадкаў не адгароджвалася цэглай, на ім ставілі гаршкі з прыгатаванай ежай. У ніжняй частцы апечча над «прыпечкам» і збоку «запечча» рабілі невялікія квадратныя нішы, якія выкарыстоўваліся для гаспадарчых патрэб. Нанясенне на карту раёнаў распаўсюджвання «камінкоў» выявіла, што яны шырока існавалі на ўсёй тэрыторыі выдзеленага арэала.

У інтэр'ерах Панёмання можна вылучыць лакальныя арэалы распаўсюджання печаў, умоўна названыя Слонімскім, Гродзенскім, Навагрудскім.

Для традыцыйнага інтэр'ера паўднёвых і паўднёва-заходніх раёнаў Гродзеншчыны, як і для Кобрынскага арэала, характэрны печы на драўляных слупах з адкрытым з боку жылля прыпечкам. Звяртаюць на сябе ўвагу наступныя канструкцыйныя асаблівасці печаў: цэнтрычнае размяшчэнне коміна, незвычайна шырокі прастакутны чалеснік, выступаючы карніз у верхняй частцы печы ў выглядзе ўбудаванай драўлянай дошкі, наяўнасць вузкай («толькі каб ступіць») бакавой прыступкі каля лежака – «прымурачка», аднаго «падпрыпечка» і цэнтральнае размяшчэнне «падпечка». Печы, у адрозненне ад Кобрынскага арэала, будавалі без «камінкоў».

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Слонімскім, Зэльвенскім, Ваўкавыскім, Мастоўскім раёнах Гродзенскай вобласці печ часта з кута перамяшчаецца ў складаны планіровачны вузел (кухня, спальня, святліца, хата), што вызначае яе форму[2]. Пры такой планіроўцы чалеснік выходзіць у хату, пліта на кухню, у святліцы ставіцца грубка-стаяк. Комін становіцца аб'ёмным і складаным па канструкцыі. Экспедыцыйныя даследаванні паказалі, што ў Слонімскім арэале разам з грубкай існавалі «сценкі» з лежакамі. Па звестках М. Ф. Сакаловай (1908 г. н., жыхаркі в. Ізабелін Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці), «у сценах звычайны рабілі 3 ці 5 люфтаў, апошні з якіх ішоў у комін»[3]. Сценкі падзялялі хату па даўжыні на дзве паловы (адсюль і назва), часта мелі выступ-ляжак. Своеасаблівасць інтэр'ераў і ў тым, што тут шырока распаўсюджаны печы з усталяванымі ў прыпечную частку плітой, сустракаюцца і камбінацыі пліты з грубкай (Мастоўскі, Ваўкавыскі раёны Гродзенскай вобласці). Нярэдка пліта прыбудоўвалася непасрэдна да печы (Гродзенскі, Слонімскі раёны). З прычыны прымыкання пліты фасад печы быў моцна выцягнуты ў прадольном кірунку і аддзяляў спальнае месца ад астатняга памяшкання. Па звестках інфарматараў, пліты былі вядомыя да пачатку 1920-х гг.

Нямала своеасаблівасцей у печах Гродзенскага, Шчучынскага, Лідскага, Воранаўскага, Іўеўскага, Ашмянскага, Смаргонскага і Астравецкага раёнаў

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці ў 1980 г.

[2] Локотко А. И. Белорусское народное зодчество. Минск, 1991. С. 146.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Ваўкавыскі раён Гродзенскай вобласці ў 1987 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ




Тыпы ўбрання покуці: *а, б* – Магілёўскі арэал, *в* – Чавускі, *г* – Слуцкі, *д* – Кобрынскі, *е* – Гродзенскі арэал

Гродзенскай вобласці. Для гэтага арэала таксама характэрныя печы на драўляных слупах («слупках»). У 1910-я гг., па даных С. А. Мелех (1908 г. н., в. Морына Іўеўскага раёна), «замест слупкоў пачалі класці камяні «філёры»[1]. Картаграфаванне адлюстроўвае асаблівасць распаўсюджання слупавай асновы: перавага яе ў паўночных раёнах і паступовае змяншэнне з поўначы да паўднёва-ўсходняга арэала і з захаду на ўсход. Канструкцыя печы мела наступныя адрозненні: наяўнасць шырокай бакавой прыступкі лежака. Комін, як правіла, стаяў на зямлі паміж печчу і грубкай. У коміне было некалькі (ад 1 да 3) квадратных ніш-ямак. У канцы XIX – пачатку XX ст. печ часта размяшчалася ў сенцах. У Смаргонскім, Ашмянскім раёнах злучэнне печы з комінам было пад зямлёй. З дадатковых ацяпляльных збудаванняў у Гродзенскім арэале існавалі грубкі-стаякі.

Па дыяганалі ад печы ў беларускім сялянскім жыллі знаходзілася покуць («кут»). Тэрміналогія покуці на тэрыторыі Беларусі падзяляецца на два шырокія арэалы. Як паказала картаграфаванне, слова «кут» вядома ў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай абласцях, Цэнтральнай Беларусі і ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці. Гэты ж тэрмін шырока бытаваў у памежных з тэрыторыяй Беларусі Смаленскай, Пскоўскай і Вялікалукскай абласцях. Назва «покуць» была распаўсюджана пераважна ў межах Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. Бытаванне дадзенага тэрміна таксама лакалізуецца на нязначнай тэрыторыі Мінскай вобласці (Слуцкі, Салігорскі, Клецкі раёны) .

Пры выяўленні своеасаблівасцей покуці ўлічваліся наступныя прыкметы: размяшчэнне і спосаб мацавання абразоў, варыянтныя ўпрыгажэнні іх ручнікамі. Можна вылучыць лакальныя тыпы покуці, умоўна названыя Гродзенскім, Кобрынскім, Слуцкім, Магілёўскім, Быхаўскім, Чавускім, Віцебскім.

Аналіз літаратурных і палявых матэрыялаў паказаў, што на большай частцы тэрыторыі Беларусі на покуці размяшчаліся ў адзін шэраг ад аднаго да 5–10 абразоў, упрыгожаных ручнікамі. Тамсама віселі пучкі асвячоных жытніх каласоў або вянкі, сплеценыя з каласоў. Да Вялікадня ў паўночных, цэнтральных і ўсходніх раёнах плялі «павукоў» і вешалі над сталом. У Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці і Хоцімскім раёне Магілёўскай вобласці да Раства падвешвалі 3–5 цыбулін або бульбін з уваткнутымі саломінкамі[2].

Некаторыя лакальныя асаблівасці выяўлены ў афармленні покуці ў Магілёўскім арэале, які ахоплівае Магілёўскі, Чавускі, Мсціслаўскі, Быхаўскі, Горацкі раёны Магілёўскай вобласці. У гэтым арэале абразы ў хатах сялян стаялі на палічках у 2–3 шэрагі па 4–5 адзінак у кожным. Своеасаблівасць выяўлялася і ў аздабленні абразоў ручнікамі. Вось што распавяла з гэтай нагоды П. Н. Арцёменка (1904 г. н., в. Бракава Слабада Чавускага раёна): «Кожны з трох радоў абразоў пакрывалі асобным набожнікам і пад ніз абразоў клалі набожнік»[3].

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці ў 1982 г.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чачэрскі раён Гомельскай вобласці ў 1987 г., Хоцімскі раён Магілёўскай вобласці ў 1988 г.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



Покуць з в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Абразы ў бажніцах. З в. Агароднікі, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

Існавалі і іншыя варыянты, калі ў цэнтры вісеў адзін вялікі абраз, а па баках у 2–3 рады размяшчаліся астатнія абразы. Так, па звестках Е. Р. Раманава: «абраз галоўны покрывалі асобным набожнікам»; перад ім падвешвалі лампадку, але не ўсюды; у большасці выпадкаў да абраза ў бажніцы ставілася свечка і запальвалася да вялікіх свят...[1]. Гэта інфармацыя пацвярджаецца і палявымі матэрыяламі. Так, па звестках У. Е. Лявонавай (1902 г. н., в. Сычоўка Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці), «сярэдняя ікона накрывалася маленькім ручніком, а другія іконы разам з цэнтральнай накрываліся доўгім ручніком». Такі тып покуці зафіксаваны ў Быхаўскім, Слаўгарадскім, Чэрыкаўскім, Мсціслаўскім, Чавускім раёнах і ўмоўна названы Быхаўскім. Прыкметнай своеасаблівасцю адрозніваецца ўпрыгожванне абразоў у Чавускім арэале. Тут на кутах абразоў «набожнікі» завязвалі бантамі пры дапамозе льняных нітак[2].

Слуцкі арэал ахоплівае Слуцкі, Старадарожскі раёны Мінскай вобласці, часткова Бабруйскі раён Магілёўскай вобласці, Кастрычніцкі, Светлагорскі, Жлобінскі, Кармянскі, Чачэрскі, Веткаўскі раёны Гомельскай вобласці. Для яго характэрныя наступныя асаблівасці: абразы ставілі ў адзін шэраг на палічку («угольнік» – Веткаўскі раён, «кутнік» – Чачэрскі раён), якую накрывалі доўгім ручніком так, што канцы яго даходзілі амаль да падлогі. У Слуцкім раёне з гэтай мэтай выкарыстоўвалі ручнік, пашыты з дзвюх частак («падпона», «падпонка»). Зверху абразы накрывалі адным доўгім ручніком[3].

Прыкметнай своеасаблівасцю вылучаецца Кобрынскі арэал: у куце мацаваліся да планкі 1–2 абразы, якія накрывалі ручніком, астатнія абразы віселі над вокнамі і ручнікамі не ўпрыгожваліся. Такі тып покуці бытаваў у Кобрынскім, Маларыцкім, Пружанскім, Камянецкім, Брэсцкім раёнах Брэсцкай вобласці.

Гродзенскі арэал уключаў не толькі Гродзенскую вобласць, але і шэраг вёсак заходніх раёнаў Мінскай вобласці (Дзяржынскі, Маладзечанскі,

[1] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 16.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.

[3] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Слуцкі раён Мінскай вобласці ў 1981 г.



Покуць з в. Агароднікі, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Покуць з в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Покуць. Гродзенскі арэал. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

Вілейскі, Мядзельскі раёны), Пастаўскі раён Віцебскай вобласці. Звяртаюць на сябе ўвагу наступныя асаблівасці: іконы не вешалі ў куце, а толькі на сценах («абразы часта не пакрываліся ручнікамі»). З нагоды апошняга казалі: «Мы не рускія, каб накрываць іконы ручнікамі, ды вешаць на саму покуць; у нас, палякаў, іконы вешалі на сценах і ручніком не ўпрыгожвалі, а толькі кветкамі»[1].

У той жа час у праваслаўнага насельніцтва гэтага арэала іконы пакрывалі ручнікамі. Такім чынам, гэта з'ява, хутчэй за ўсё, звязана з тым, што эстэтычная традыцыя каталіцызму ў адрозненне ад праваслаўя не прымала ўпрыгожванне абразоў ручнікамі. Акрамя таго, па звестках П. В. Шэйна, у Гродзенскім паве-

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Гродзенскі раён у 1981 г.



Абразы ў інтэр'еры. Канец XIX – пачатак XX ст. З в. Заброддзе, Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

це абразы ў большасці выпадкаў адсутнічалі, а покуць не мела таго абрадавага значэння, як ва ўсходняй і цэнтральнай частках Беларусі. Толькі ва ўрачыстых выпадках (на Вялікдзень, Каляды, Радаўніцу) селянін адпраўляў кароткую малітву, упрыгожыўшы покуць чыстым вышытым ручніком[1].

Як паказала картаграфаванне, распаўсюджванне палацяў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. падзяляецца на два шырокія рэгіёны: Віцебска-Мінскі і Гродзенска-Мазырскі. Згодна з картаграфаваннем палаці шырока бытавалі на Віцебшчыне (за выключэннем Пастаўскага раёна), у Цэнтральнай Беларусі, Магілёўскай вобласці, усходніх раёнах Гарадзеншчыны (Навагрудскі, Дзятлаўскі раёны, часткова Іўеўскі). Асаблівая распаўсюджанасць прасочваецца ў паўночнай частцы Беларусі. Аналіз літаратурных і палявых крыніц паказаў, што зрэдку палаці можна было сустрэць у паўднёвых раёнах Панямоння. Бытаванне палацяў таксама лакалізуецца на значнай частцы Гомельскай вобласці (Рагачоўскі, Чэрыкаўскі, Веткаўскі, Светлагорскі, Акцябрскі, паўночная частка Калінкавіцкага раёна). Мяркуючы па матэрыялах Н. І. Лебедзевай, «раён на поўдзень ад Мазыра і вакол Князь-Возёра зусім іх не ведае»[2]. Не былі яны вядомы таксама і на тэрыторыі Брэсцкай вобласці.

На тэрыторыі Беларусі згодна з картаграфаваннем выдзелена сем спосабаў мацавання палацяў. У паўночнай паласе Беларусі можна вылучыць шы-

[1] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 64, 362.

[2] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. С. 13.




Распаўсюджанне палацяў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.




Спосаб мацавання палацяў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.: *1* – адзін канец ляжаў на печы, другі мацаваўся да падвяснай жэрдкі; *2* – адзін канец на печы, другі ляжаў на планцы, прыбітай да глухой сцяны; *3* – адзін канец на печы, другі ляжаў на планцы, прыбітай да тарцовай сцяны; *4* – падвясныя палаці; *5* – адзін канец мацаваўся да бруса прыпечнага слупа, другі да планкі, прыбітай да сцяны; *6* – адзін канец на печы, а другі на слупках; *7* – на слупках, уманціраваных у драўляныя калодкі

рокі арэал, умоўна названы Віцебскім. Печы ў большасці раёнаў Віцебскай вобласці (за выключэннем Докшыцкага, Ушацкага, Лепельскага) не прымыкалі да адной са сцен жылля. У выніку паміж печчу і сцяной утваралася ніша («запечак», «запечча»). Пячная пляцоўка злучалася са сцяной драўляным насцілам («палком»). Бытаванне такога спосабу мацавання палацяў лакалізуецца на значнай тэрыторыі ад Віцебска на ўсходзе да Шаркаўшчыны і Мёраў на захадзе, уключаючы паўночныя раёны (Верхнядзвінскі і Расонскі), і знаходзіць свой працяг за межамі Беларусі. Такі спосаб мацавання палацяў існаваў таксама ў паўночных раёнах Магілёўскай вобласці (Круглянскі, Шклоўскі), сустракаўся ў паўночнай частцы Крупскага раёна Мінскай вобласці.

Своеасаблівы спосаб мацавання палацяў існаваў у паўднёва-ўсходніх раёнах Беларусі. Лакальны арэал вылучаўся ў межах шырокай тэрыторыі, рамкі якой ахопліваюць на ўсходзе Мсціслаўскі, Крычаўскі раёны Магілёўскай вобласці і праходзяць вузкай паласой да Любанскага і Капыльскага раёнаў Мінскай вобласці на захадзе, паўночная мяжа даходзіць да Пухавіч, паўднёвая клінам уразаецца ў Гомельскую вобласць і ахоплівае Светлагорскі, Акцябрскі, паўночную частку Калінкавіцкага раёна. Збудаванне палацяў у Мсціслаўска-Капыльскім арэале звязана з прыпечным слупом. Да яго мацаваўся брус-біла («ашостак», «курчына»), на якое ў папярочным кірунку клаліся брусы, а на іх дошкі. Па звестках А. М. Мардзелевай (жыхаркі в. Забалоцце Чавускага раёна Магілёўскай вобласці), як правіла, ставілі два масіўныя слупы на ўзроўні печы: адзін каля «пола» другі каля глухой сцяны. На іх клалі брус з выемкай, «каб дошкі ляжалі і не соўваліся»[1].

У канцы XIX – пачатку XX ст. была вядомая і іншая канструкцыя палацяў: у глухую сцяну на адлегласці прыблізна 2 м адзін ад аднаго ўбівалі два брусы («палкі»), на якія клалі дошкі. Збоку хаты яны падвешваліся пры дапамозе масіўных круглых брусоў да бэлек. Нанясенне на карту раёнаў бытавання такога спосабу мацавання палацяў выявіла, што яны ахопліваюць паўночна-ўсходнія раёны Гомельскай вобласці (Рагачоўскі, Чачэрскі, Кармянскі, Веткаўскі раёны) амаль усю Магілёўскую вобласць (за выключэннем заходніх раёнаў) і паўднёвыя раёны Віцебшчыны (ад Докшыц да Талачына).

Прыкметнай своеасаблівасцю адрозніваўся традыцыйны спосаб мацавання палацяў Мінскай вобласці, дзе ў даследуемы перыяд шырока бытавалі падвясныя палаці над «полам». Адным канцом палаці ляжалі на печы, другім мацаваліся да жэрдкі, якая з двух бакоў падвешвалася пры дапамозе вя-

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі раён Магілёўскай вобласці ў 1987 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ







Схемы спосабаў мацавання палацяў: *а* – Мінскі арэал, *б* – Віцебскі, *в* – Капыльскі, *г* – Магілёўскі, *д* – Мсціслаўска-Любанскі, *е* – Дзяржынскі, *ж* – Навагрудскі арэал

ровак да бэлькі. Картаграфаванне паказала, што такі спосаб мацавання палацяў лакалізуецца як у дадзенай вобласці, так і ў памежных раёнах Гродзеншчыны (Слонімскі, Навагрудскі, Смаргонскі раёны), Віцебскай вобласці (Докшыцкі, Талачынскі, Віцебскі раёны), распаўсюджаны ў заходніх раёнах Магілёўскай вобласці (Круглянскі, Бялыніцкі, Магілёўскі, Асіповіцкі, Бабруйскі, Глускі раёны).

Капыльскі арэал ахоплівае тэрыторыю Капыльскага, Клецкага і Слуцкага раёнаў. У дадзеным арэале адзін канец палацяў ляжаў на печы, другі мацаваўся да планкі, прыбітай да тарцовай сцяны. Гэта адзіны арэал, у якім даўжыня палацяў была роўная даўжыні «пола».

Лакальны спосаб мацавання палацяў прасочваецца ў межах Навагрудскага, Дзятлаўскага і часткова Карэліцкага раёнаў Гродзенскай вобласці. Своеасаблівасць Навагрудскага арэала заключаецца ў тым, што тут палаці мацаваліся да слупкоў, уманціраваных у драўляныя калодкі. Па звестках А. Т. Дземянчук (1908 г. н., в. Ракевічы Навагрудскага раёна), «на пол-нары ставілі чатыры калкі, усталяваных у драўляныя калодкі; зверху калкі збівалі жэрдкамі і закладывалі дошкамі»[1].

На тэрыторыі Мінскай вобласці значную агульнасць маюць інтэр'еры Дзяржынскага, Стаўбцоўскага і Уздзенскага раёнаў. У вылучаным арэале палаці адным канцом ляжалі на печы, а другім – на масіўных слупах ці на слупках, уманціраваных у калодкі, якія стаялі на «палу»-нарах.

Такім чынам, тэрыторыя Беларусі падзяляецца на два шырокія рэгіёны: Мінскі, дзе шырока бытавалі палаці, і Гродзенска-Мазырскі, дзе яны адсутнічалі. Характар спосабу мацавання палацяў дазволіў вылучыць у Мінскім рэгіёне сем лакальных арэалаў: Віцебскі, Мсціслаўска-Любанскі, Магілёўскі, Мінскі, Капыльскі, Навагрудскі, Дзяржынскі.

Пры выяўленні лакальных арэалаў бытавання таго ці іншага тыпу калысак улічваўся комплекс наступных прыкмет: матэрыял вырабу і спосаб мацавання калысак. Згодна з вынікамі палявых даследаванняў, на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. існавалі наступныя віды калысак: драўляныя; плеценыя з лазы, арэшніку; плеценыя з драніцы ліпы – «лубянкі»; з палосак хвойнай лучыны; палатняныя.

Па матэрыяле вырабу выдзелена пяць арэалаў распаўсюджання калысак, умоўна названых Віцебска-Мазырскім, Гарадзенска-Брэсцкім, Мінскім, Гарадзенска-Магілёўскім, Полацкім.

Бытаванне драўляных калысак ахоплівае большую частку Беларусі, за выключэннем Гродзенскай вобласці (акрамя Астравецкага, Смаргонскага, часткова Іўеўскага раёнаў), Брэсцкай вобласці (акрамя Баранавіцкага, Ганцавіцкага раёнаў).

Шматлікія ўзоры калысак канца XIX – пачатку XX ст. з этнаграфічных калекцый музеяў сведчаць,

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці ў 1987 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Калыска драўляная з капшуком. З в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту



Калыска з в. Садавічы, Капыльскі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што плеценыя «люлькі» з лазы, арэшніку ў выглядзе даўгаватых кошыкаў шырока бытавалі ў Гродзенскай (за выключэннем Смаргонскага раёна) і Брэсцкай вобласці (за выключэннем Баранавіцкага раёна).

Нанясенне на карту раёнаў бытавання «лубянак», выраблены з дранкі, выявіла, што межы Мінскага арэала на ўсходзе ахопліваюць усю Магілёўшчыну, на захадзе даходзяць да Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці, на поўначы праходзяць за Докшыцамі, на поўдні за Слуцкам.

Картаграфаванне відаў калысак выявіла, што на тэрыторыі Гродзенскай, Брэсцкай абласцей, паўднёвай часткі Гомельскай вобласці, усходніх раёнаў Магілёўшчыны былі шырока распаўсюджаны палатняныя калыскі. Лакальнае бытаванне палатняных «таганоў» у Віцебскай вобласці абмежавана Віцебскім і Шумілінскім раёнамі.

Для Полацкага арэала характэрна распаўсюджанасць калысак, выраблены з палос хвойнай лучыны. Згодна з картай яны лакалізуюцца на нязначнай тэрыторыі Віцебшчыны (Гарадоцкі, Шумілінскі, Ушацкі, Віцебскі, Полацкі раёны).

На тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. былі распаўсюджаны тры спосабы мацавання калысак, што дазволіла вылучыць адпаведна тры лакальныя арэалы, умоўна названыя Віцебскім, Гродзенска-Мінскім, Кобрынска-Дзяржынскім.

Віцебскі арэал ахоплівае ўсю тэрыторыю Віцебскай вобласці, паўночныя раёны Мінскай вобласці (Крупскі, Лагойскі, Вілейскі, Мядзельскі), паўночныя раёны Гродзенскай вобласці (Астравецкі, Ашмянскі). У адрозненне ад астатняй тэрыторыі Беларусі, у дадзеным арэале калыскі віселі на канцы доўгай гнуткай жэрдкі («зыбаўкі»), якая прымацоўвалася да бэлькі або затыкалася за яе. Другі канец



Сям'я каля калыскі. Палессе. 1920–30-я гг. Фота Ю. Шыманчыка

жэрдкі ўпіраўся ў столь. Калыску ў большасці выпадкаў качалі нагой за пятлю, прывязаную да ачэпу.

Для Гродзенска-Мінскага арэала характэрны самы распаўсюджаны спосаб мацавання калысак на тэрыторыі Беларусі. Калыскі падвешваліся за крук, убіты ў бэльку. Гродзенска-Мінскі арэал ахоплівае ўсю тэрыторыю Беларусі, за выключэннем Віцебскай вобласці і паўночных раёнаў Мінскай і Гродзенскай абласцей.

Кобрынска-Дзяржынскі арэал ахоплівае кампактную тэрыторыю і вузкай паласой праходзіць праз Брэсцкую (Кобрынскі, Драгічынскі, Івацэвіцкі, Бярозаўскі раёны) і Гродзенскую вобласць (Слонімскі, Карэліцкі, Іўеўскі раёны), заходняя мяжа праходзіць па Мінскай вобласці (Стаўбцоўскі, Уздзенскі, Дзяржынскі, Мінскі раёны). У дадзеным арэале калыска мацавалася вяроўкамі да жэрдкі, якую прыбівалі да дзвюх бэлек. Па словах С. Я. Ма-



Дзіця ў плеценым кошыку. Палессе, Косаўскі павет. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Віды калысак па матэрыяле вырабу (канец XIX – пачатак XX ст.): *1* – драўляныя; *2* – плеценыя з лазы і арэшніку; *3* – з дранкі ліпы – «лубянкі»; *4* – палатняныя; *5* – з палосак лучыны сасны




Спосаб мацавання калысак (канец XIX – пачатак XX ст.): *1* – мацавалася за крук; *2* – вісела на «зыбаўцы»; *3* – мацавалася вяроўкай да жэрдкі, якая падвешвалася між бэлек

коўскага (1913 г. н., жыхара в. Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці), «такія калыскі былі зручнымі, іх добра было перасоўваць з месца на месца»[1].

У канцы XIX – пачатку XX ст. найбольш распаўсюджанай формай лавак былі часаныя яловыя або дубовыя дошкі, умацаваныя на ўкапаных у зямлю слупках («калодках»). Такі спосаб мацавання лаў шырока быў распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У той жа час існавалі і іншыя спосабы мацавання лаў, што дазволіла вылучыць арэалы, умоўна названыя Шаркаўшчынскім, Кобрынскім, Клічаўскім.

Своеасаблівы спосаб мацавання лаў існаваў у паўночна-заходніх раёнах Беларусі. Лакальны арэал назіраецца ў межах Мёрскага, Браслаўскага, Шаркаўшчынскага, Глыбоцкага раёнаў Віцебскай вобласці. У Шаркаўшчынскім арэале апорамі лавы звычайна служылі пастаўленыя на рабро дошкі. Контурная прарэзка вертыкальных бакавых граняў апорных дошак надавала лавам прывабны выгляд. Шырыня лаўкі адпавядала мінімальнаму габарыту спальнага месца – 50–70 см. У гэты перыяд быў вядомы і іншы спосаб мацавання лаў: у сцяну на пэўнай адлегласці адзін ад аднаго перпендыкулярна ўбівалі 2–3 круглыя штыры («калкі»), на якія клалі лаву. Такі від мацавання быў распаўсюджаны на тэрыторыі Брэсцкай вобласці (Камянецкі, Брэсцкі, Кобрынскі, Маларыцкі раёны).

Прыкметнай своеасаблівасцю вылучаецца спосаб мацавання лаў у Клічаўскім арэале, які ахоплівае тэрыторыю Кіраўскага, Бабруйскага, Клічаўскага, Асіповіцкага раёнаў Магілёўскай вобласці і Бярэзінскі, Барысаўскі, Крупскі раёны Мінскай вобласці. У вылучаным намі арэале лавы клалі на круглыя штыры-«ўпоры», якія мацаваліся да сцяны пад вуглом 90°.

Асобную групу элементаў інтэр'ера складалі характэрныя для ўсходнеславянскага жылля адкрытыя паліцы. У канцы XIX – пачатку XX ст. на ўсёй тэрыторыі Беларусі паліца звычайна размяшчалася збоку ад дзвярнога праёму. Адначасова з такім месцазнаходжаннем былі вылучаны яшчэ тры арэалы, умоўна названыя Камянецкім, Драгічынска-Верхнядзвінскім і Гродзенскім.

У Камянецкім арэале доўгая паліца часта размяшчалася не толькі збоку ад дзвярэй, але і над вокнамі ўздоўж падоўжнай сцяны. Такое месцазнаходжанне паліцы сустракалася ў Брэсцкай вобласці, паўднёва-заходніх раёнах Гродзенскай вобласці, у Капыльскім, Слуцкім, Клецкім раёнах Мінскай вобласці.

Драгічынска-Верхнядзвінскі арэал ахоплівае шырокую зону, межы якой даходзяць на поўдні да Драгічына, а на поўначы да Верхнядзвінска, на ўсходзе праходзяць за Слуцкам, на захадзе – за Дзятлавам. У дадзеным арэале паліцы размяшчалася над дзвярным праёмам. Згодна з палявымі данымі,

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці ў 1979 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

асабліва часта такое месцазнаходжанне паліцы сустракалася ў Віцебскай вобласці.

У Гродзенскім арэале паліца размяшчалася збоку ад дзвярэй, аднак яна мела наступныя канструкцыйныя асаблівасці: бакавыя сценкі і адтуліны для лыжак. Часам для лыжак зверху ці знізу паліцы прыбівалі планку з адтулінамі ў ніжняй або верхняй частцы – «равочкі». Гродзенскі арэал ахоплівае Брэсцкую (за выключэннем паўднёва-ўсходніх раёнаў), Гродзенскую вобласць, заходнія раёны Мінскай вобласці .

Па тыпу асвятляльных прыстасаванняў тэрыторыя Беларусі можа быць падзелена на два рэгіёны: паўночны, дзе бытавалі светачы, і паўднёвы, дзе пераважалі лучыны.

Вызначана зона распаўсюджання пераносных светачаў, якая ахоплівае абшырную тэрыторыю: Віцебская, Гродзенская, Брэсцкая вобласці (за выключэннем Пінскага, Ганцавіцкага, Столінскага раёнаў), большая частка Мінскай вобласці (за выключэннем паўднёва-ўсходніх раёнаў), Магілёўская (акрамя Клічаўскага, Бабруйскага, Кіраўскага, Глускага раёнаў), паўночна-ўсходнія раёны Гомельскай вобласці (Рагачоўскі, Чачэрскі, Кармянскі, Веткаўскі). Аналіз палявых матэрыялаў паказаў, што светачы былі самай разнастайнай формы. У некаторых раёнах «свяцец» уяўляў сабой у асноўным круглую (Лагойскі, Вілейскі, Мінскі раёны Мінскай вобласці, Докшыцкі раён Віцебскай вобласці і інш.) або крыжападобную калодку (Барысаўскі, Вілейскі раёны Мінскай вобласці, Крычаўскі раён Магілёўскай вобласці і інш.), да якіх вертыкальна мацаваўся шост з драўляным або металічным зажымам у выглядзе дзвюх пласцін на канцы.

У Магілёўскай вобласці падстаўкай служыла невысокая авальная калодка, у якую замацоўвалася палка вышынёй каля 1 м з двума зажымамі. Пры гэтым казалі: «Уторкні яму ў зубы»[1]. Як сведчаць экспедыцыйныя даныя, у Навагрудскім і Карэліцкім раёнах Гродзенскай вобласці бытавалі светачы з металічным зажымам на канцы ў выглядзе васьмёркі. У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці былі вядомыя металічныя светачы ў выглядзе дзвюх пласцін, злучаных пасярэдзіне цвіком. Такі светач прыбівалі над «чалеснікам» печы[2].

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Мсціслаўскі раён Магілёўскай вобласці ў 1982 г.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Мядзельскі раён Мінскай вобласці ў 1980 г.

Згодна з літаратурным і эспедыцыйным матэрыялам, у паўночным рэгіёне можна вылучыць Вілейска-Рагачоўскі, Гродзенскі, Брэсцкі арэалы.

Вілейска-Рагачоўскі арэал ахоплівае паўднёвыя раёны Віцебскай вобласці, Магілёўскую вобласць (за выключэннем паўднёва-заходніх раёнаў), на поўдні мяжа праходзіць па Мінскім і Дзяржынскім раёнах, на захадзе даходзіць да Навагрудка. У вылучаным арэале, акрамя пераносных, былі вядомы таксама падвясныя светачы. Спосаб мацавання быў двоякі. Напрыклад, у Лепельскім раёне Віцебскай вобласці шырока бытавалі падвясныя светачы ў выглядзе драўлянага крука, які быў падвешаны за жэрдку каля печы. Такі спосаб мацавання, па звестках М. Я. Нікіфароўскага, быў шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Віцебскай губерні[3]. У Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці, Пухавіцкім, паўночнай частцы Барысаўскага, Вілейскага раёнаў Мінскай вобласці і інш. былі распаўсюджаны падвясныя светачы-«дзядункі» у выглядзе шаста, прыбітага да бэлькі з зажымам на канцы («расшчэпам»)[4].

На тэрыторыі Брэсцкага арэала, які ахоплівае заходнія і паўночна-заходнія раёны Брэсцкай вобласці, адзначаецца распаўсюджанне пераносных «светачаў», «камінкоў», якія ўяўляюць сабой драўляную крыжавіну або краж, на які клалі плоскі камень (такую крыніцу святла часам называлі «камень»). Дым адводзіўся праз спецыяльную трубу (драўляны ствол з выдаленай сярэдзінай). У паўночна-заходніх раёнах Брэсцкай вобласці бытавала наступная разнавіднасць «камінка»: у сумежным з печчу куце ўладкоўвалася падстаўка, яе і частку сцяны абмазвалі глінай, дым адводзіўся праз плецены «каптур» ці праз адтуліну ў сцяне[5].

Прыкметнай своеасаблівасцю адрозніваўся традыцыйны спосаб асвятлення хат ў Гродзенскім арэале. Па звестках П. В. Шэйна, у Гродзенскай губерні для асвятлення жылля ўжываўся спецыяльны трымальнік («бабка»), які ўяўляў падковападобную форму з адтулінай для лучыны і быў замацаваны ў сцяне побач з гаспадарчым кутом[6]. Такі тып асвятляльных прыбораў існаваў у Гродзенскім, Шчучынскім і Бераставіцкім раёнах Гродзенскай вобласці[7].

[3] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 336.

[4] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Пухавіцкі раён у 1982 г., у паўночныя раёны Мінскай вобласці ў1987 г.

[5] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. С. 122.

[6] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 65.

[7] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Гродзенскі, Шчучынскі раёны у 1987 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Лучнік у інтэр'еры жылля. З в. Ісерна, Слуцкі раён Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту

У канцы XIX – пачатку XX ст. у вылучаным намі паўднёвым рэгіёне шырока бытавалі падвясныя лучнікі. Нанясенне на карту раёнаў бытавання такога тыпу асвятляльных прыбораў выявіла, што яны лакалізуюцца ў Гомельскай вобласці (за выключэннем Рагачоўскага, Кармянскага, Чачэрскага раёнаў), памежных з Гомельскай вобласцю раёнах Брэстчыны (Пінскі, Ганцавіцкі, Столінскі раёны), паўднёва-заходніх раёнах Магілёўскай вобласці (Кіраўскі, Клічаўскі, Бабруйскі, Глускі), паўночная граніца клінам уразаецца ў тэрыторыю Мінскай вобласці, агінаючы Мінскі, Дзяржынскі раёны, і даходзіць да паўднёвай часткі Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

У залежнасці ад матэрыялу вырабу лучнікі былі чатырох тыпаў: драўляныя, лазовыя, палатняныя і бляшаныя. Н. І. Лебедзева, абследаваўшы шэраг вёсак у лакальным раёне Мазыр – Пінск, адзначыла, што лучнікі першапачаткова выдзёўбвалі са ствала дрэва з дуплом або выраблялі з дзвюх ці чатырох складовых частак, якія змацоўвалі абручамі. Пасля драўляныя лучнікі былі заменены плецёнымі з лазы, з прычыны працаёмкасці вырабу першых. Але разам з тым Н. І. Лебедзева канстатавала, што ў шэрагу вёсак (Прудкі, Барыскавічы) спрадвеку ўжываліся толькі плецёныя лучнікі[1].

Як паказала картаграфаванне, у Бабруйскім, Глускім раёнах Магілёўскай вобласці, Старадарожскім, Слуцкім раёнах Мінскай вобласці лучнікі выраблялі таксама выключна з лазы, абмазанай глінай. Такі тып лучнікоў мацаваўся да столі наступным чынам: у адтуліны столі прапускалі лазу з коранем, які і стрымліваў увесь цяжар лучніка.

Лучнікі выраблялі таксама з простага палатнянага мяшка ці кавалка палатна, прымацаванага да драўлянай або лазовай асновы лучніка. Палатняны конус быў зручны тым, што на дзень і ў летні час яго перакручвалі і закідвалі за кручок, убіты ў сцяну або ў сволок, і ён не перашкаджаў. Дадзены тып лучнікоў атрымаў шырокае распаўсюджванне ў Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці, Пухавіцкім, Старадарожскім раёнах Мінскай вобласці і паўднё-

[1] Лебедева Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. С. 13.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вых раёнах Гомельскай вобласці (Мазырскі, Калінкавіцкі, Ельскі, Нараўлянскі).

Бляшаныя лучнікі мелі тую ж форму, што драўляныя і лазовыя. Ужо сама назва гаворыць аб тым, што іх выраблялі з бляхі. Гэта найбольш позняя форма лучніка.

Як паказала апытанне інфарматараў, у большасці раёнаў паўночнага рэгіёну лучыну таксама ўтыкалі ў адмысловую адтуліну над «чалеснікам» печы, у паз паміж бярвеннем каля печы або паміж вокнамі тарцовай сцяны.

У сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. сустракаліся разнастайныя тыпы падлогі – земляная, глінабітная і драўляная. Земляная і глінабітная падлога («ток», «тачок») былі самымі распаўсюджанымі на ўсёй тэрыторыі Беларусі да сярэдзіны XIX ст. У 80–90-я гг. XIX ст. ва ўсіх усходніх паветах Беларусі пераважала драўляная падлога[1]. Шырокае бытаванне драўлянай падлогі ў разглядаемы перыядназіраецца ў межах шырокай зоны, якая ахоплівае Магілёўскую вобласць (за выключэннем Горацкага раёна), усходнія і паўночныя раёны Гомельскай вобласці, на захадзе даходзіць да Бабруйскага, Чэрвенскага раёнаў, паўночная мяжа праходзіць па паўднёвых раёнах Віцебскай вобласці (Докшыцкі, Лепельскі раёны).

Адметнай асаблівасцю паўднёва-ўсходніх раёнаў Віцебшчыны з'яўляецца наяўнасць драўлянай падлогі ў сенцах. Драўляная падлога спрадвеку існавала ў багністых мясцовасцях. Так, па словах І. І. Сыч (1894 г. н., жыхаркі в. Бабічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці), «палы былі заўсёды драўляныя, нацешуць сякерай дошкі ды і складуць. Палы ніколі не мылі, капаніцай паскобляць да свят, ды і ўсё, такая ўжо была завядзёнка»[2].

Пра шырокае бытаванне драўлянай падлогі сведчаць і іншыя экспедыцыйныя даныя: «палы толькі з дрэва, дошкі нарэжуць уручную на сталюгах, 8 дошак і ўся падлога». У раёнах, дзе існавала драўляная падлога, у прыватнасці на Гомельшчыне (Петрыкаўскі, Мазырскі, Калінкавіцкі і іншыя раёны), у шэрагу выпадкаў прастору пад падлогай («падмосцем») выкарыстоўвалі для захоўвання бульбы і гародніны. Так, па звестках А. А. Буцэнка (1909 г. н., жыхаркі в. Боруцк Калінкавіцкага раё-




Светачы: *а* – з в. Вароўскае Барысаўскага раёна Мінскай вобласці; *б* – з Лідскага раёна Гродзенскай вобласці; *в* – з в. Ваўковічы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці; *г* – з в. Горані Мінскага раёна Мінскай вобласці




Лучнікі: *а* – з в. Прудкі Мазырскага раёна Гомельскай вобласці; *б* – з в. Надтачаеўка Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці; *в* – з в. Паддуб'е Лепельскага раёна Віцебскай вобласці; *г* – з в. Бабцы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці

[1] Беларускае народнае жыллё. С. 36-38.

[2] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці ў 1981 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ




Карта распаўсюджання розных тыпаў асвятляльных прыстасаванняў у канцы XIX – пачатку XX ст.:
*1* – драўляныя лучнікі;
*2* – лазовыя лучнікі;
*3* – палатняныя лучнікі;
*4* – «светач»-стаяк;
*5* – падвясны светач;
*6* – «бабка»

на Гомельскай вобласці), драўляная падлога была з такім высокім падполлем, што «нават чалавек мог прайсці»[1].

З прасоўваннем з усходу на захад колькасць глінабітных «такоў» павялічваецца. Мяркуючы па звестках Я. Бараноўскага, у Тураўскім раёне яшчэ ў 1928 г. «толькі ў 37 хатах (або 23,1%) была падлога, у астатніх хатах быў гліняны ток – «далоўка»[2]. Як паказала картаграфаванне, глінабітны і земляны «ток» лакалізуецца на тэрыторыі, якая ахоплівае Брэсцкую, Гродзенскую, заходнія раёны Мінскай і паўночна-заходнія раёны Віцебскай вобласці. Драўляная падлога сустракалася вельмі рэдка, а ў Гродзенскай вобласці і паўночна-заходніх раёнах Мінскай вобласці (Мядзельскі, Вілейскі і Пастаўскі раёны Віцебскай вобласці) не сустракаліся ўвогуле.

Такім чынам, у выніку даследавання інтэр'ера беларускага народнага жылля дакладных межаў паміж гісторыка-этнаграфічнымі рэгіёнамі па поўным комплексе прадметаў інтэр'ера правесці не ўдалося. Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці традыцыйнага інтэр'ера беларускага жылля выяўляліся па асобных прадметах.

Інтэр'ер беларускага традыцыйнага жылля канца XIX – пачатку XX ст. з'яўляецца каштоўнай гісторыка-этнаграфічнай крыніцай, якая дазваляе зразумець этнічныя асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, заканамернасці этнакультурных працэсаў у Беларусі. У развіцці інтэр'ера беларускага народнага жылля можна вылучыць тры перыяды, якія адрозніваюцца пэўнымі асаблівасцямі ў розныя гістарычныя перыяды. Першы – перыяд фарміравання асноў традыцыйнага інтэр'ера беларусаў (IX–XV стст.). На гэтым этапе адбываюцца істотныя змены ў структуры жылля, на змену каменным прыходзяць глінабітныя печы, складваюцца канструкцыйныя асаблівасці печаў і формаў мэблі. Пры новай планіроўцы печ сталі размяшчаць побач з уваходам і разварочваць вусцем да бакавога акна. Менавіта ў гэты перыяд складваецца традыцыйны беларуска-ўкраінскі тып планіроўкі жыл-

[1] З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці ў 1981 г.

[2] Бараноўскі Яз. Санітарна-бытавы стан вёскі Радзілавічы Букчанскі сельсавет, Тураўскі раён, Мазырская акруга // Наш край. 1928. № 8. С. 56.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ля і асновы традыцыйнага сялянскага інтэр'ера. Другі этап ахоплівае час з XVI да сярэдзіны XIX ст. У гэты перыяд з'яўляюцца печы з топкай «па-беламу». Параўнальны аналіз інтэр'ераў беларускіх памешчыцкіх сядзіб, памяшканняў для прыслугі і сялянскага жылля XVI–XVIII стст. выявіў агульныя рысы ўнутранай планіроўкі і мэбліроўкі. Інтэр'ер жылля ўсіх сацыяльных слаёў насельніцтва, у тым ліку і памешчыцкіх сядзіб, у гэты перыяд меў у аснове ўнутранай планіроўкі і абсталявання народную традыцыю. Да сярэдзіны XIX ст. інтэр'ер традыцыйнага жылля развіваўся ў рэчышчы старажытных традыцый. Развіццё капіталістычных адносін у паслярэформенны перыяд і звязанае з гэтым інтэнсіўнае расслаенне сялянства далі штуршок для якасна новых працэсаў у фарміраванні інтэр'ера. У гэты перыяд ідзе хуткае ўдасканаленне будаўнічай тэхнікі, адбываецца масавая замена курных печаў печамі з комінам, атрымлівае распаўсюджанне палепшаная планіроўка жылля. Аднак нягледзячы на істотныя змены ў планіроўцы і мэбліроўкі, якія адбыліся ў другой палове XIX ст., інтэр'ер беларускага народнага жылля па-ранейшаму захоўваў у сваёй аснове традыцыйныя рысы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ